Каляндар знамянальных і памятных дат на 2017 год

2016

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2017 год

Віцебск, 2016

ББК 92.5
К 17

Складальнікі: Г. В. Галімская, А. А. Паўленка, Т. В. Пацалуёнак
Рэдактар: Л. І. Рагачова
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2017 год / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; склад. Г. В. Галімская, А. А. Паўленка, Т. В. Пацалуёнак. – Віцебск, 2016. – 183 с. : іл.

©ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2016

КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ
НА 2017 ГОД

2016 г.

Складальнікі: Галімская Ганна Валер’еўна, Паўленка Аліна Аляксееўна,
Пацалуёнак Таццяна Віктараўна
Рэдактар Л. І. Рагачова
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Дызайн вокладкі К. В. Стральцовай
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Тыраж 2 экз.
Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, Віцебск, Леніна, 8-а
E-mail: vlib@vlib.by

п’есу з жыцця чыгуначнікаў «Каралеўскі гамбіт» (1957). Галоўныя тэмы творчасці – жыццё рабочага класа, горада. Творы Яўгена Пятровіча перакладзены на рускую, украінскую і іншыя мовы.

У 1958–1966 гг. – галоўны рэдактар часопіса «Нёман». Член СП СССР з 1953 г. Узнагароджаны медалямі.

Памёр 23 верасня 1973 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Васілёнак** Яўген Пятровіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1969. – Т. 2 : Афіны – Ведрыч. – Мінск : БелЭн, 1970. – С. 614.

2. **Васілёнак** Яўген Пятровіч // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.].– Мінск : БелЭн, 1992. – Т. 1 : Абуховіч – Ватацы. – С. 535.

3. **Васілёнак** Яўген Пятровіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Б – Г.– С. 222.

4. **Василёнок** Евгений Петрович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 119.

5. **Канцавенка, І.** Журналіст і пісьменнік – Яўген Васілёнак / І. Канцавенка // Аршанская газета. – 2007. – 18 кастр. – С. 3.

6. **Карнялюк, К.** Яго самае важнае адкрыццё / К. Карнялюк // Літаратура і мастацтва. – 2008. – 15 лют. – С. 15.

ПРАДМОВА

У «Каляндар» уключаны знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага, культурнага жыцця Віцебскай вобласці, а таксама юбілейныя даты выдатных землякоў і людзей, якія па месцы нараджэння не з’яўляюцца ўраджэнцамі вобласці, але пакінулі значны след у гісторыі і культуры нашага рэгіёна.

Дапаможнік адкрываецца храналагічным пералікам знамянальных і памятных дат, якія прадстаўлены па новым стылі.

«Каляндар» састаўлены на аснове даных з энцыклапедый, даведачных, перыядычных выданняў, якія знаходзяцца ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі.

Наш «Каляндар» дапаможа краязнаўцам, бібліятэчным работнікам, выкладчыкам і іншым спецыялістам у вывучэнні і распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.

У 2017 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

1155 гадоў таму (862) у «Аповесці мінулых гадоў» упершыню ўпамінаецца г. Полацк.

1070 гадоў таму (947) па адной з версій, у летапісах з'яўляюцца першыя звесткі пра Віцебск.

1025 гадоў таму (992) заснавана Полацкая праваслаўная епархія, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Кіеўскай мітраполіі, старэйшая хрысціянская епархія Беларусі.

960 гадоў таму (1057) нарадзіўся Барыс Усяслававіч (1057–1101), князь друцкі і князь полацкі, сын князя полацкага Усяслава Чарадзея.

950 гадоў таму (1067) у «Аповесці мінулых гадоў» упершыню згадваецца Орша як горад «Ръша».

900 гадоў таму (1117) у Друцку пачаў княжыць Глеб Усяслававіч.

890 гадоў таму (1127) адбыўся паход Мсціслава (сына Уладзіміра Манамаха) супраць Полацка і Друцка. Завяршыўся высылкай полацкіх і друцкіх князёў у Візантыю.

865 гадоў таму (1152) у Полацку пачалося будаўніцтва дойлідам Іаанам саборнага храма Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

850 гадоў таму (1167) адбылося паломніцтва Еўфрасінні Полацкай у Святыя мясціны, дзе яна памерла.

710 гадоў таму (1307) адбылося аб'яднанне Полацкага княства і ВКЛ.

640 гадоў таму (1377) крыжаносцы здзейснілі напад на г. Дзісну і асадзілі Дзісенскі замак.

640 гадоў таму (1377) упершыню ў гістарычных крыніцах згадваецца г. п. Езярышча Гарадоцкага раёна.

625 гадоў таму (1392) заснаваны Аршанскі павет як Аршанскае намесніцтва, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ВКЛ.

620 гадоў таму (1397) адбылася аблога Оршы смаленскім князем Святаславам Іванавічам.

ВАСІЛЁНАК ЯЎГЕН ПЯТРОВІЧ

Да 100-годдзя з дня нараджэння (1917)

Яўген Пятровіч Васілёнак нарадзіўся 26 снежня 1917 г. у горадзе Оршы ў сям'і чыгуначніка. Беларускі савецкі пісьменнік. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Аршанскай чыгуначнай школе. Член КПСС з 1945 г. Вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце на літаратурным факультэце (1934–1935). Працаваў у рэдакцыях раённых газет (Шклоў, Барысаў, Багушэўск, Орша). У 1939 г. па пуцёўцы камсамола быў накіраваны на журналісцкую работу на Далёкі Усход.

Працаваў ён у Хабараўску, Усурыйску, Уладзівастоку. Больш за два гады супрацоўнічаў у чыгуначнай газеце «Прыморская магістраль». Быў карэспандэнтам радыё, ТАСС, маскоўскай «Учительской газеты». Блукаў па Усурыйскай тайзе, спускаўся ў Сучанскія шахты, хадзіў з рыбакамі ў Ціхі акіян, сустракаў іншаземныя караблі ў бухце «Залаты рог».

У 1943–1945 гг. знаходзіўся ў радах Чырвонай Арміі, служыў у рэдакцыі дывізійнай газеты «Боец-патриот».

З 1945–1948 гг. – карэспандэнт маскоўскай газеты «Гудок» у Алма-Аце. З 1948 г. жыў у Мінску – быў рэдактарам БелТА, карэспандэнтам газеты «Труд» па Беларускай ССР, загадчыкам аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць».

Друкавацца пачаў з 1935 г. Выдаў зборнікі апавяданняў, нарысаў і аповесцей «Зялёныя агні» (1954), «Прызванне» (1956), «Выпадковы прыпынак» (1957), «Розныя дарогі» (1957), «Таццяна Ларына» (1964),

ЛІТАРАТУРА

1. **Вывучаем** родны край // Міёрскія навіны. – 2007. – 31 ліп. – С. 3.

2. **Гушча** Ян // Беларусь : энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1995. – С. 257.

3. **Гушча** Ян // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1981. – Т. 5. – С. 189.

4. **Гуща** Ян // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 348.

5. **Гуща** Ян // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 3 : Герасименко – Картель. – С. 292.

6. **Ермалёнак, В.** Дзве мемарыяльныя дошкі землякам / В. Ермалёнак // Краязнаўчая газета. – 2013. – № 41 (лістап.). – С. 2.

7. **Ермалёнак, В.** Слова краязнаўцы / В. Ермалёнак // Літаратура і мастацтва. – 2013. – 8 лістап. – С. 14.

8. **Калеснік, У. А.** Талент працавіты / У. А. Калеснік // Лёсам пазнанае : выбраныя літаратурныя партрэты і нарысы / У. А. Калеснік. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – С. 497–557.

9. **Русецкий, А. В.** Вместо Беларуси родиной стала Польша / А. В. Русецкий // Уроженцы Витебщины в художественной культуре стран близкого и дальнего зарубежья : монография / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2013. – С. 25–33.

610 гадоў таму (1407) у гістарычных крыніцах упершыню згадваюцца сёлы Беразіно, Гняздзілава, Дамашкавічы, Докшыцы.

610 гадоў таму (1407) у пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца г. Докшыцы як уласнасць віленскага намесніка Манівіда (Войцеха).

575 гадоў таму (1442) у пісьмовых крыніцах упершыню быў упамянуты горад Сянно.

570 гадоў таму (1447) упершыню згадваецца гарадскі пасёлак Бешанковічы пад 1447 годам (паводле А. П. Сапунова) або 1460 годам (паводле В. В. Турчыновіча) як сяло ў ВКЛ.

505 гадоў таму (1512) нарадзіўся Радзівіл Мікалай (Руды) (1512–1584), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, ураджэнец г. Кіева. У 1579 годзе ўдзельнічаў у аблозе і ўзяцці Полацка.

500 гадоў таму (1517) выдадзена першая кніга «Псалтыр» беларускага асветніка, гуманіста і першадрукара Францыска Скарыны.

495 гадоў таму (1522) у Вільні адкрыта першая друкарня Францыска Скарыны.

495 гадоў таму (1522) упершыню згадваецца в. Валкалата Докшыцкага раёна.

480 гадоў таму (1537) нарадзіўся Хадкевіч Ян Геранімавіч, удзельнік Інфлянцкай вайны (1558–1582), Ульскай бітвы (1564).

470 гадоў таму (1547) нарадзіўся Стрыйкоўскі Мацей (1547–1590), польскі гісторык, храніст, паэт. У 1572–1574 гг. служыў у Віцебскім гарнізоне пад камандаваннем А. Гваньіні і працаваў над гісторыяй ВКЛ і суседніх дзяржаў.

465 гадоў таму (1552) упершыню вёска Псуя згадваецца ў складзе ВКЛ.

465 гадоў таму (1552) заснаваны г. п. Расоны.

465 гадоў таму (1552) упершыню згадваецца в. Удзела Глыбоцкага раёна.

465 гадоў таму (1552) упершыню згадваецца в. Зябкі Глыбоцкага раёна.

465 гадоў таму (1552) упершыню згадваецца в. Завуцце Мёрскага раёна.

440 гадоў таму (1577) г. п. Ула Бешанковіцкага раёна дадзены герб і права на самакіраванне.

435 гадоў таму (1582) заснаваны Полацкі Богаяўленскі манастыр. Існаваў у 1582–1918 гг. у Полацку як праваслаўны мужчынскі манастыр.

435 гадоў таму (1582) упершыню згадваецца г. п. Бягомль Докшыцкага раёна як сяло Мінскага павета ВКЛ.

420 гадоў таму (1597) узведзена Віцебская ратуша.

415 гадоў таму (1602) пабудаваны касцёл і царква ў Лепелі.

410 гадоў таму (1607) узнікла вёска Арловічы ў Дубровенскім раёне на р. Дняпро.

410 гадоў таму (1607) узнікла вёска Малае Савіно ў Дубровенскім раёне, якая была вядома ў складзе Рэчы Паспалітай як абруб Савінскі.

390 гадоў таму (1627) пабудавана Парплішчанская Спаса-Праабражэнская царква, помнік архітэктуры драўлянага дойлідства з рысамі класіцызму ў в. Порплішча Докшыцкага раёна. Перабудавана ў 1881 годзе.

375 гадоў таму (1642) нарадзіўся Сапега Казімір Ян Павел, чашнік ВКЛ у 1659–1661 гг., падстолій у 1661–1663 гг., падскарбій дворны ў 1663–1670 гг., ваявода полацкі ў 1670–1681 гг., гетман польны ў 1681–1683 гг., гетман вялікі ў 1683–1703 гг. і 1705–1708 гг.

345 гадоў таму (1672) ва Ушачах заснаваны манастыр базыльянаў.

345 гадоў таму (1672) упершыню згадваецца паселішча Востраў (Востраў Юр'еў). Зараз пасёлак Асінторф Дубровенскага раёна.

345 гадоў таму (1672) упершыню згадваецца в. Пірагі Дубровенскага раёна ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ.

345 гадоў таму (1672) адкрыты Полацкі кляштар дамініканцаў. Дзейнічаў у 1672–1864 гг.

335 гадоў таму (1682) заснаваны Канстанцінам Уладзіславам Пацам кляштар бернардзінцаў у в. Беразіно Докшыцкага раёна.

галоўны рэдактар лодзінскага квартальніка «Osnowa». Вершаваныя творы паэта апублікаваны ў зборніках «Балада аб падарожных», «Штодзённасць кахання», «Выбраныя вершы», «Сентыментальнае падарожжа», «Размовы і заклеены», «Гады сярод гадоў». Зборнік вершаў «Стары павільён» у 1969 г. атрымаў узнагароду за найлепшую паэтычную кнігу 25-годдзя. Ян Гушча – аўтар аповесцяў «Мястэчка над Альшанкай», «Пярсцёнак з кайданоў» (апошняя ў плебісцыце радыё «Свабодная Еўропа» была прызнана найлепшай кніжкай 1974 г., выдадзенай у Польшчы), шматлікіх апавяданняў. З яго эсэістыкі вылучаюцца «Успаміны не заўсёды журботныя», якія тычацца літаратурнага жыцця Вільні ў міжваенны перыяд, зборнік успамінаў і рэпартажаў «Здарэнні і прызнанні», а таксама «Урыўкі, эпізоды, нарысы» з нарысам «Паэт Белай Русі» пра Ф. Багушэвіча. Сатырычныя творы Я. Гушчы ўвайшлі ў зборнікі «Ані так, ані сяк», «Дажынкі ў Адамове», «Аб людзях з людзьмі», «Розныя нашыя справы», «Ноч перад агульным сходам», «Зачараваны банкнот», «Жарты, сатыры, эпіграмы». Ён пераклаў з беларускай мовы апавяданні 20 аўтараў, выдадзеныя пад назвай «Мае мядзведзі і іншыя беларускія апавяданні» (1975), выбраныя апавяданні У. Караткевіча пад агульнай назвай «Блакіт і золата дня» (1976). Рэдагаваў польскае выданне выбраных вершаў М. Багдановіча. Складальнік зборнікаў «Анталогія беларускай паэзіі» (1978), «Беларускія вершы» (1971), для якіх пераклаў большасць вершаў. Паэзія Я. Гушчы ў перакладах на беларускую мову шырока прадстаўлена ў зборніку «Горад мільённы і мы» (1972). У беларускім перакладзе выйшла таксама яго кніжка «Пан Грыцыян і іншыя» (1976). Многія творы тэматычна звязаны з Беларуссю (апавяданне «Лямпа», вершы «Да сябра-беларуса», «Вязынка», зборнік эсэ «Аповесць у чорных рамках»). У 1975 г. Ян Гушча атрымаў узнагароду г. Лодзі за дасягненні ў галіне навукі і культуры. Ён адзначаны Залатым крыжам заслугі (1955), Кавалерскім крыжам ордэна Адраджэння Польшчы (1969). Творы Я. Гушчы перакладаліся на беларускую мову.

Памёр 26 чэрвеня 1986 г.

ГУШЧА ЯН

Да 100-годдзя з дня нараджэння (1917)

Нарадзіўся Ян Гушча 24 снежня 1917 г. у фальварку Загасцінне Дзісенскага павета. Скончыў гімназію ў Дзісне. Дэбютаваў у 1933 г. вершам «Горад». У 1934 г. паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта, адначасова вучыўся ў Вышэйшай школе палітычных навук у Вільні, якую скончыў у 1939 г. У 1937 г. стаў сябрам Прафсаюза польскіх пісьменнікаў. На працягу 1935–1939 гг. публікаваў вершы, эпіграмы і рэцэнзіі ў шматлікіх польскіх часопісах. У 1940 г. Я. Гушча – у Казахстане. У 1943 г. ён уступіў у Войска Польскае, дзе служыў афіцэрам 3-й дывізіі пяхоты імя Р. Траўгута. У 1944 г. працаваў у Саюзе польскіх патрыётаў у Маскве, рэдакцыі двухтыднёвіка «Nowe Widnokregi».

У ліпені 1944 г. пераехаў у Польшчу, спачатку ў Люблін, а ў канцы 1945 г. перасяліўся ў Лодзь і стаў сябрам Саюза польскіх пісьменнікаў. У 1955–1957 гг. – сябра рэдакцыйнай калегіі двухтыднёвіка «Kronika». У 1950–1980 гг. Я. Гушча публікаваў паэтычныя творы, прозу і пераклады, галоўным чынам з беларускай мовы. У 1970–1971 гг. –

325 гадоў таму (1692) пабудаваны Полацкі жылы дом (Дом Пятра I), помнік архітэктуры з элементамі стылю барока ў г. Полацку, перабудаваны на рубяжы 18–19 ст.

310 гадоў таму (1707) нарадзіўся Кульчынскі Ігнат (1707–1747), беларускі археолаг, краязнаўца, уніяцкі і царкоўны дзеяч, ураджэнец г. Гродна. Зрабіў апісанне абразоў кафедральнай царквы ў Полацку і крыжа Еўфрасінні Полацкай.

300 гадоў таму (1717) нарадзіўся Грынцэвіч Людвік (1717–1783), беларускі і літоўскі архітэктар, прадстаўнік позняга барока. Сярод работ: 2-вежавы фасад і галоўны алтар касцёла Св. Юрыя ў в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна, касцёл Дамініканцаў у г. п. Друя Браслаўскага раёна.

300 гадоў таму (1717) утворана вёска Мазалава ў Віцебскім раёне на р. Лужаснянка як цэнтр маёнтка, валоданне канюшага Аршанскага павета І. Дадэркі.

295 гадоў таму (1722) у Дуброўне мешчанінам Пілатам пабудавана першая каменная царква.

280 гадоў таму (1737) быў пабудаваны Віцебскі касцёл і кляштар бернардзінцаў (1737–1768) з цэглы ў стылі барока.

275 гадоў таму (1742) у Смалянах Аршанскага раёна ўзведзена драўляная ратуша.

275 гадоў таму (1742) Мікалай Лапацінскі набыў Сар'ю.

275 гадоў таму (1742) нарадзіўся Фабіян Саковіч (1742–1787), беларускі паэт, перакладчык, вучыўся ў Віцебскім і Нясвіжскім езуіцкіх калегіумах, выкладаў у Нясвіжы. З 1766 года жыў у Варшаве.

265 гадоў таму (1752) у Оршы заснаваны касцёл місіянераў. Храм не захаваўся.

255 гадоў таму (1762) мураваная Свята-Духаўская царква Куцеінскага манастыра перабудавана і асвечана ў Троіцкую. Будынак царквы ў Оршы захаваўся да нашага часу.

250 гадоў таму (1767) нарадзілася Адольская (Адамовіч) Марыяна, танцоўшчыца, ураджэнка г. Паставы. Вучылася ў балетных

250 гадоў таму (1767) нарадзіўся Кухальскі Андрэй, танцоўшчык, прыгонны падскарбія надворнага ВКЛ Антонія Тызенгауза, ураджэнец г. Паставы Віцебскай вобласці.

245 гадоў таму (1772) пабудаваны Віцебскі палац губернатара, помнік архітэктуры класіцызму.

245 гадоў таму (1772) у маёнтку Ворань Лепельскага раёна распачата будаўніцтва каталіцкай мураванай капліцы.

245 гадоў таму (1772) Верхнядзвіншчына ўвайшла ў склад Расійскай дзяржавы.

245 гадоў таму (1772) адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога частка Віцебскай вобласці ўвайшла ў склад Расійскай дзяржавы.

245 гадоў таму (1772) утворана Віцебская правінцыя, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Пскоўскай губерні з цэнтрам у Віцебску. Існавала да 1777 года.

245 гадоў таму (1772) утворана Аршанская правінцыя, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў складзе Магілёўскай губерні Расійскай імперыі з цэнтрам у г. Оршы.

245 гадоў таму (1772) нарадзіўся Капцэвіч Пётр Мікалаевіч (1772–1843), расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, генерал, ураджэнец Віцебскай губерні.

245 гадоў таму (1772) была ўтворана Полацкая правінцыя у складзе Пскоўскай губерні на землях былога Віцебскага ваяводства, якія ўвайшлі ў склад Расіі пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772). Падзелена на Полацкі, Невельскі і Себежскі паветы. У 1776 годзе была скасаваная, паветы ўвайшлі ў склад Полацкай губерні.

240 гадоў таму (1777) Гарадок набыў статус горада і стаў цэнтрам павета.

240 гадоў таму (1777) у Віцебску заснавана першае прамысловае прадпрыемства – гарбарны завод Гарноўскага.

Валянціна Лукшы / Н. Гальпяровіч // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 23 лістап. – С. 5.

3. **Валянцін Лукша** // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / рэдкал.: С. А. Андраюк [і інш.] ; нав. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – Т. 4.– Кн. 3. – С. 453–474.

4. **Гумарыстычныя** далягляды. Віцебшчына // Вожык. – 2011. – № 1. – С. 17.

5. **Карлюкевіч, А.** Яснае неба / А. Карлюкевіч // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 30 мая. – С. 8.

6. **Лукша** Валянцін Антонавіч // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса . – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1994. – Т. 4 : Лазарук–Перкін. – С. 93–99.

7. **Марціновіч, А.** Брыганціна на хвалях вечнасці : не стала Валянціна Лукшы / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 21 верас. – С. 4.

8. **Пучынская, К.** Прапагандыст беларускай літаратуры Валянцін Лукша /К. Пучынская // Роднае слова. – 2007. – № 11. – С. 16.

9. **Русецкий, А.** Еще стоят на рейде бригантины : [лит. критика] / А. Русецкий // Нёман. – 2007. – № 2. – С. 177–187.

(драматычныя паэмы, 1989), кніжкі вершаў, казак для дзяцей «Аркестр» (1972), «Зялёная бальніца» (1974), «Лета – круглы год» (1978), «Крылаты цэх» (1982), «Чароўны камень» (1987). Выдаў кнігі публіцыстыкі «Наша полацкая прафесія» (1966), «Рамантыкі шасцідзесятых» (1967), «Дзесяць дарог да чароўнага» (1970), «Полацк» (1973).

Аўтар п'ес, пастаўленых на тэатральнай сцэне, тэлебачанні і радыё, «Інтэгралы на цэгле» (1974), «Мая радня» (1975), «Свае крылы» (1976), «Вецер веку» (паводле аднайменнага рамана І. Гурскага, 1977), «Калі вяртаюцца буслы» (1982), «Асоль» (паводле твораў А. Грына, 1984), «Пад шыфрам «Зорачка» (1985), «Чароўны камень» (1985).

Пераклаў п'есы С. Міхалкова «Дарагі хлопчык» (1986), М. Рошчына «Уся Надзея» (1986), Е. Тарахоўскай «Казка пра Ямелю» (1990). Напісаў лібрэта оперы «Барвовы золак» паводле «Палескай хронікі» Івана Мележа (пастаўлена ў 1979).

Дзясяткі вершаў пісьменніка сталіся песнямі, дзякуючы кампазітарам Д. Лукасу, І. Лучанку, У. Мулявіну, Э. Наско, Ф. Пыталеву, К. Цесакову, А. Чыркуну і іншым.

Валянцін Антонавіч – член Саюза пісьменнікаў БССР з 1978 г., лаўрэат літаратурнай прэміі імя П. Броўкі за 1994 г., лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Выдатнік друку СССР. За развіццё дзіцячай літаратуры адзначаны медалём Ю. Гагарына, ганаровым знакам А. Гайдара, вялікім залатым медалём лаўрэата ВДНГ СССР. За значны ўклад у развіццё сусветнай культуры Амерыканскі біяграфічны інстытут тройчы надаваў паэту прэстыжны тытул «Чалавек года». В. Лукша неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Памёр у 2012 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Габышава, К.** У гасцях у казкі / К. Габышава // Народная газета. – 2009. – 29 кастр. – С. 12.

2. **Гальпяровіч, Н**. Ад полацкага прычала : да 75-годдзя

240 гадоў таму (1777) праз Оршу праязджаў рускі сатырык Д. І. Фанвізін, які назваў горад «изрядным местечком».

235 гадоў таму (1782) у Глыбокім быў пабудаваны касцёл Святой Тройцы, помнік архітэктуры віленскага барока. У 1902–1908 гг. – перабудаваны.

235 гадоў таму (1782) Я. А. Гільзенам была закладзена Асвейская сядзіба, помнік палацава-паркавай архітэктуры 2-й пал. 18 ст. у г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна.

230 гадоў таму (1787) пачалі складацца Забелькія зборнікі на беларускай, рускай і лацінскай мовах выкладчыкамі Забельскага дамініканскага калегіума (в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна) для мясцовага школьнага тэатра.

230 гадоў таму (1787) створана Полацкая друкарня пры Полацкім езуіцкім калегіуме. Дзейнічала да 1820 года.

230 гадоў таму (1787) быў пабудаваны Германавіцкі Дабравешчанскі касцёл, помнік архітэктуры віленскага барока ў в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна.

225 гадоў таму (1792) у Смалянах на Аршаншчыне ўзведзена Спаса-Праабражэнская царква. Зараз храм дзейнічае і з'яўляецца помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння.

225 гадоў таму (1792) пабудаваны Мосарскі касцёл святой Ганны – помнік архітэктуры класіцызму ў в. Мосар Глыбоцкага раёна.

220 гадоў таму (1797) існавала Віцебская губернская друкарня (у перыяд з 1797–1812 гг. і 1815–1917 гг.).

220 гадоў таму (1797) пачата будаўніцтва Бярэзінскага канала, які злучыў басейны рэк Днепр і Заходняя Дзвіна.

215 гадоў таму (1802) закончана будаўніцтва новага касцёла ў маёнтку Луцікі Лепельскага павета.

210 гадоў таму (1807) створана бібліятэка Полацкай духоўнай семінарыі на аснове царкоўнай і манастырскіх бібліятэк Полацкай уніяцкай архідыяцэзіі.

205 гадоў таму (1812) знойдзена Аршанскае Евангелле, беларускі рукапісны помнік 2-й паловы 13 ст.

205 гадоў таму (1812) нарадзіўся Рэут (Газдава-Рэут) Вінцэнты (1812–1883), беларускі і польскі пісьменнік, фалькларыст, ураджэнец Полацкага павета.

205 гадоў таму (1812) пераўтвораны Полацкі езуіцкі калегіум у Полацкую езуіцкую акадэмію, якой нададзены статус універсітэта. Акадэмія існавала да 1820 г.

205 гадоў таму (1812) адбыліся Клясціцкія баі (30.07–01.08) каля в. Клясціцы і на шляху Полацк–Себеж (цяпер тэрыторыя Расонскага і Полацкага раёнаў) паміж расійскім 1-м пяхотным корпусам П. Х. Вітгенштэйна і французскім 2-м корпусам Н. Ш. Удзіно ў вайну 1812 г.

205 гадоў таму (1812) увосень адбыўся Чашніцкі бой ля г. Чашнікі ў месцы зліцця рэк Ула і Лукамка між расійскім корпусам генерала П. Х. Вітгенштэйна і французскімі карпусамі маршалаў К. Віктора і Н. Ш. Удзіно.

205 гадоў таму (1812) адбыліся Полацкія бітвы ў час вайны 1812 года за горад Полацк. Першая Полацкая бітва адбылася 17–18 жніўня.

195 гадоў таму (1822) пабудаваны Дзеркаўшчынскі касцёл Узнясення Дзевы Марыі ў Глыбоцкім раёне, помнік архітэктуры класіцызму.

190 гадоў таму (1827) нарадзіўся Струкаў Дзмітрый Міхайлавіч (1827–1899), мастак, археолаг, педагог. У Віцебску намаляваў Троіцкую і Ільінскую цэрквы, Маркаў манастыр і іншыя акварэлі.

190 гадоў таму (1827) у Віцебску ўведзена начное асвятленне вуліц тлушчавымі свечкамі.

175 гадоў таму (1842) Аршанскі кляштар трынітарыяў пераўтвораны ў праваслаўны мужчынскі манастыр і духоўнае вучылішча.

ЛУКША
ВАЛЯНЦІН АНТОНАВІЧ

Да 80-годдзя з дня нараджэння (1937)

Валянцін Антонавіч Лукша нарадзіўся ў Полацку 16 лістапада 1937 г. у сям'і служачых. Скончыў Полацкі лясны тэхнікум (1956) і Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1976). Пасля заканчэння тэхнікума быў накіраваны на працу ў Пензенскую аэрафотаўпарадкавальную экспедыцыю. У 1958 г. – інструктар Полацкага гаркама камсамола, камсорг трэста № 16 «Нафтабуд». З 1961 г. – літсупрацоўнік полацкай газеты «Сцяг камунізма», загадчык аддзела міжраённай газеты «Ленінская іскра» (Полацк), карэспандэнт Беларускага радыё, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена», адказны сакратар штомесячніка «На экранах Беларусі», з 1973 г. – старшы рэдактар, з 1975 г. – галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, у 1980–1998 гг. – дырэктар выдавецтва «Юнацтва». Менавіта пры ім, як сцвярджае пісьменнік Сяргей Панізнік (на той час супрацоўнік В. Лукшы), выдавецтва займела сусветную славу: кнігі выходзілі саракатысячнымі накладамі, беларуская літаратура перакладалася на многія мовы, прапагандавалася ў розных краінах (і не толькі еўрапейскіх).

Літаратурную дзейнасць В. Лукша пачаў у 1956 г. (апублікаваны верш у «Віцебскім рабочым»). Выйшлі кнігі вершаў «Гарады нараджаюцца сёння» (1964), «Атава» (1969), «Споведзь» (1973), «Белыя берагі» (паэма-хроніка, 1981), «Радзімыя плямы» (вершы і фельетоны, 1982), «Сляды памяці» (вершы і паэма, 1986), «Агонь і попел»

X–XIX стагоддзях», «Художественная культура и образование. Проблемы взаимодействия», «Литературное творчество в системе художественной культуры», «От земли Позерской… Творчество витебских литераторов в послевоенный период. 1945–1965 гг.», «Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины. С 1918 года и до наших дней».

А. В. Русецкі быў дэпутатам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца членам «Саюза пісьменнікаў Беларусі», лаўрэатам прэміі імя У. Караткевіча, кавалерам ордэна «Знак Пашаны», ордэна Андрэя Першазванага, медаля імя Ф. Скарыны, мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі».

ЛІТАРАТУРА

1. **Аркадий Владимирович Русецкий** : биобиблиографический указатель / сост. Е. Г. Бабахина, В. В. Соловьева. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2002. – 32 с.

2. **Аркадий Владимирович Русецкий** : биобиблиографический справочник / сост. Е. Г. Бабахина [и др.]. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2006. – 54 с.

3. **Аркадий Владимирович Русецкий** : биобиблиографический справочник / сост.: Л. А. Климко, Л. В. Потапова. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2008. – 59 с.

4. **Бабарыка, А.** Прагноз ад рэктара / А. Бабарыка // Віцебскі рабочы. – 2001. – 6 сак. – С. 3.

5. **Вихров, В.** Награда ректору / В. Вихров // Віцебскі рабочы. – 2002. – 14 лістап. – С. 1.

6. **Пастернак, Т.** Ректор начинал свою университетскую карьеру ассистентом / Т. Пастернак // Народнае слова. – 1997. – 20 лістап. – С. 3.

7. **Русецкий, А.** Кто ты есть, Человек?.. / А. Русецкий ; беседовали А. Лазебная, А. Пожарская // Віцьбічы = Витьбичи. – 2007. – 1 нояб. – С. IV – (Прил.: Вечерний Витебск).

170 гадоў таму (1847) нарадзіўся Кірпічоў Міхаіл Львовіч (1847–1875), ваенны навуковец, артылерыст-хімік, капітан, ураджэнец г. Полацка.

165 гадоў таму (1852) заснаваны першы на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь дзяржаўны архіў – Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерній.

165 гадоў таму (1852) у Дуброўне заснавана яўрэйскае вучылішча.

165 гадоў таму (1852) нарадзіўся Мароз Язэп Кандратавіч, садавод, даследчык-селекцыянер, ураджэнец Бешанковіцкага раёна.

165 гадоў таму (1852) нарадзіўся Кляменцьеў Аляксандр Мікалаевіч (1852–1917), беларускі архітэктар. Працаваў у Віцебскім губернскім праўленні. У 1887–1890 гг. – віцебскі губернскі інжынер, адначасова полацкі епархіяльны архітэктар.

165 гадоў таму (1852) пабудаваны Сар'янскі касцёл, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Сар'я Верхнядзвінскага раёна. З 1865 года належыць праваслаўным (Успенская царква).

160 гадоў таму (1857) у Віцебску адкрылася першая публічная бібліятэка.

160 гадоў таму (1857) нарадзіўся Далгоў Іван Іванавіч (1857–1911), беларускі гісторык, археолаг, краязнавец, даследчык гісторыі Полацка і археалагічных помнікаў Полаччыны. З 1889 года працаваў у Полацкім кадэцкім корпусе і напісаў яго гісторыю.

160 гадоў таму (1857) нарадзіўся Гінтаўт-Дзевалтоўскі Уладзіслаў Люцыян Францавіч (1857–1925), дзеяч народніцкага руху, ураджэнец Дзісненскага павета Віцебскай губерні.

160 гадоў таму (1857) у Оршы знойдзена кальчуга са стараславянскімі надпісамі.

160 гадоў таму (1857) нарадзіўся Кандраценка Раман Ісідаравіч, расійскі ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, ураджэнец г. Тбілісі (Грузія). Скончыў Полацкі кадэцкі корпус.

160 гадоў таму (1857) пабудаваны Лепельскі касцёл святога Казіміра, помнік архітэктуры позняга класіцызму ў г. Лепелі.

155 гадоў таму (1862) адкрыты Лужэцкае і Ігуменаўскае народныя вучылішчы (Шаркаўшчынскі раён).

155 гадоў таму (1862) нарадзіўся Станкевіч Антон Уладзіміравіч (1862–1919), расійскі военачальнік, генерал-маёр. Ураджэнец в. Губіна Пастаўскага раёна.

150 гадоў таму (1867) археолагам Міхаілам Францавічам Кусцінскім апублікаваны артыкул «Лепельские древности».

150 гадоў таму (1867) у Віцебску адкрыта фотамайстэрня С. А. Юркоўскага.

150 гадоў таму (1867) распрацавана беларускім фалькларыстам і этнографам П. В. Шэйнам і выдадзена ў Віцебскай губернскай друкарні «Праграма для збірання помнікаў народнай творчасці».

150 гадоў таму (1867) рэканструіраваны касцёл манастыра кармелітаў у Глыбокім. У 1878 годзе пераасвечаны ў царкву. Зараз – Глыбоцкі кафедральны Сабор Раства Багародзіцы, помнік архітэктуры позняга барока.

150 гадоў таму (1867) А. М. Семянтоўскі выявіў археалагічны помнік Рудня (курганны магільнік крывічоў) у Полацкім раёне. Даследавалі: у 1928 годзе – А. Н. Ляўданскі у 1961 годзе – А. Г. Мітрафанаў, у 1967 годзе – Г. В. Штыхаў.

145 гадоў таму (1872) пачалі дзейнічаць дэпо і майстэрні пры чыгуначнай станцыі Орша.

145 гадоў таму (1872) у Оршы была забрукавана гарадская Гандлёвая плошча.

145 гадоў таму (1872) у Оршы быў закладзены гарадскі «англійскі сад». Зараз на яго месцы знаходзяцца парк імя Ленінскага камсамола і летні тэатр.

145 гадоў таму (1872) нарадзіўся Кальнін Пётр Іванавіч (1872–1817), беларускі архітэктар, ураджэнец г. Адэсы. У 1913 годзе распрацаваў праекты гандлёвых крам для Оршы.

доктар гістарычных навук. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1969), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1978, Масква). Кандыдат філасофскіх навук (1978), доктар гістарычных навук (1990). Прафесар (1996).

Акадэмік Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы (Масква, 2000), Нацыянальнай акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь (1998), Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій (1999).

У 1969–1970 гг. быў асістэнтам кафедры філасофіі Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. У 1970–1971 гг. – кансультант Дома палітычнай асветы Віцебскага абкама КПБ, у 1971–1975 гг. – сакратар, другі сакратар, першы сакратар Віцебскага абкама ЛКСМБ, у 1978–1985 гг. – сакратар, другі сакратар Віцебскага гаркама КПБ, у 1985–1991 гг. – першы намеснік загадчыка, загадчык ідэалагічнага аддзела, сакратар ЦК КПБ. У 1991–1992 гг. быў прафесарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1992–1995 гг. – намеснік дырэктара Міжнароднага інстытута менеджменту, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў, у 1995–1997 гг. – намеснік, першы намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта. У 1997–2009 гг. – рэктар УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава».

Сферай навуковых інтарэсаў Аркадзя Уладзіміравіча была і ёсць гісторыя і культура Віцебшчыны. А. В. Русецкі з’яўляецца аўтарам 240 навукова-даследчых работ па тэорыі і гісторыі мастацкай культуры Беларусі, гісторыі Віцебска і Віцебскай вобласці, праблемах развіцця вышэйшай адукацыі, інавацыях у адукацыі. Ім напісаны кнігі: «Художественная культура и патриотическое воспитание», «Художественная культура: возрастание роли, проблемы развития», «Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць», «Мастацкая культура Беларусі: тэорыя і гісторыя», «Ісці да чалавека: літаратурныя партрэты», «Художественная культура Витебска с древности до 1917 года», «Мастацкая культура Віцебскага Паазер’я. Ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя», «Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў канцы

4. **Матусевіч, Н.** Полацкая настаўніцкая семінарыя / Н. Матусевіч // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2001. – № 1. – С. 86–103.

5. **Самусік, А.** Полацкая настаўніцкая семінарыя / А. Самусік // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1994. – Т. 5. – С. 531.

6. **Самусік, А. Ф.** Полацкая настаўніцкая семінарыя імя Я. П. Кульнева / А. Ф. Самусік, В. В. Яноўская // Памяць : Полацк : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. С. С. Чарняўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2002. – С. 299–300.

Лістапад

РУСЕЦКІ
АРКАДЗЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ
75 год з дня нараджэння (1942)

Русецкі Аркадзь Уладзіміравіч нарадзіўся 1 лістапада 1942 г. у вёсцы Гірэвічы Радашковіцкага раёна Маладзечанскай вобласці (цяпер Валожынскі раён Мінскай вобласці).

Прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры,

145 гадоў таму (1872) заснаваны Полацкі каледж Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава ў г. Полацку як настаўніцкая семінарыя. У 1918 годзе на яе базе былі адкрыты педагагічныя курсы, а ў 1921 годзе быў створаны тэхнікум. З 1936 года – педагагічнае вучылішча, з 1964 – педагагічнае вучылішча імя Ф. Скарыны, з 1994 года – педагагічны каледж, з 2004 года – у структуры Полацкага ўніверсітэта, з 2005 – у структуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

140 гадоў таму (1877) заснаваны Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна. З 2002 года – у складзе РУП «Віцебскі станкабудаўнічы завод «Вістан».

140 гадоў таму (1877) нарадзіўся Сільвановіч Лукаш Антонавіч (1877–1969), Георгіеўскі кавалер, ураджэнец в. Лапінцы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Крыжы 2-й і 1-й ступеняў атрымаў за мужнасць у баях каля Рыгі і Полацка.

140 гадоў таму (1877) пабудавана Пліская царква Параскевы Пятніцы ў в. Пліса Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

135 гадоў таму (1882) у Оршы заснавана тытунёвая фабрыка, якая дзейнічала да 1885 года.

135 гадоў таму (1882) пабудавана Узмёнская Мікалаеўская царква ў Мёрскім раёне, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

130 гадоў таму (1887), заснавана метэаралагічная станцыя ў г. Сянно Віцебскай вобласці.

130 гадоў таму (1887) пабудавана з цэглы Чарневіцкая царква Параскевы Пятніцы, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Чарневічы Глыбоцкага раёна.

130 гадоў таму (1887) пабудаваны Опсаўскі касцёл Іаана Хрысціцеля, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Опса Браслаўскага раёна.

130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Ліпоўскі Міхаіл Аляксандравіч, ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай вайны, абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, кавалер ордэна Леніна, ураджэнец Віцебскай губерні.

125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Грыдзюшка Сцяпан Станіслававіч (1892–1919), удзельнік барацьбы за савецкую ўладу ў Кранштаце і Петраградзе, ураджэнец Шаркаўшчынскага раёна.

125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Нэзлін Саламон Яфімавіч (1892–1990), вучоны-медык, прафесар, ураджэнец Лёзненскага раёна.

125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Пінсан Барыс Давыдавіч (1892–1938), удзельнік рэвалюцыйнага руху, ураджэнец г. Віцебска.

125 гадоў таму (1892) у Віцебску пачала дзейнічаць акулярная фабрыка. Дзейнічала да 1941 года.

125 гадоў таму (1892) у Віцебску жыў вядомы паэт С. Я. Маршак.

125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Разумны Марк Аляксандравіч (1892–1945), акцёр. У 1920–1922 гг. – акцёр і рэжысёр Тэатра рэвалюцыйнай сатыры ў Віцебску.

125 гадоў таму (1892) у маёнтку Здраўнёва жыў і працаваў вядомы мастак І. Я. Рэпін.

125 гадоў таму (1892) створаны першы марксісцкі гурток у Віцебску.

125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Бальзаментаў Арсеній Дзмітрыевіч (1892–1965), расійскі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук. Ураджэнец Расіі. У 1926–1928 гг. – загадчык кафедры паталагічнай анатоміі ВДАВМ.

125 гадоў таму (1892) пабудавана Богінская Пакроўская царква, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Богіна Браслаўскага раёна.

120 гадоў таму (1897) нарадзілася Баброва Марыя Аляксандраўна (сапр. Броніна; 1897–1920), кіраўнік партызанскага падполля ў Бабруйску, ураджэнка Віцебскай губерні.

педвучылішча ў 1967 г. было ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1994 г. навучальная ўстанова набыла статус педагагічнага каледжа.

Важным этапам у развіцці стаў 2005 год, калі па рашэнні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Полацкі каледж увайшоў у склад Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава у якасці адасобленага структурнага падраздзялення. Гэта дазволіла яшчэ больш удасканаліць шматгранную работу па падрыхтоўцы кадраў для сістэмы адукацыі, захаваць пераемнасць у навучанні.

Традыцыі, якія склаліся за многія гады працы, дазваляюць сёння педагагічнаму калектыву забяспечваць такую падрыхтоўку спецыялістаў для пачатковай і базавай школ, дашкольных устаноў, якая дае магчымасць выпускнікам каледжа паспяхова канкурыраваць са сваімі калегамі – выпускнікамі ВНУ. У 2010 г. навучальная ўстанова атрымала два сертыфікаты, якія пацвярджаюць адпаведнасць сістэмы менеджменту якасці сярэдняй спецыяльнай адукацыі нацыянальным і міжнародным стандартам.

Укараненне ў вучэбна-выхаваўчы працэс сучасных адукацыйных тэхналогій, падрыхтоўка спецыялістаў, якія будуць канкурэнтназдольныя на рынку працы, – у гэтым бачыць сваю мэту педагагічны калектыў Полацкага каледжа ВДУ імя П. М. Машэрава. Педагогі і навучэнцы ганарацца гісторыяй сваёй навучальнай установы і імкнуцца з годнасцю прадаўжаць справы сваіх папярэднікаў. Сіла ўстановы адукацыі – у яе глыбокіх традыцыях і дынамічным удасканаленні.

ЛІТАРАТУРА

1. **Лухверчык, Б. М.** Полацкая настаўніцкая семінарыя / Б. М. Лухверчык // Народная асвета. – 1986. – № 6. – С. 73–76.

2. **Малашеня, Л.** В педколледж поступают с радостью / Л. Малашеня // Народнае слова. – 2011. – 23 ліп. – С. 5.

3. **Матусевіч, Н.** Настаўніцкія семінарыі і іх роля ў адукацыі на Беларусі / Н. Матусевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 46–49.

Віктаравіч Бялецкі (1841–1907). Ён з'яўляўся акруговым інспектарам, памочнікам папячыцеля акругі, аўтарам кніг і артыкулаў па пытаннях педагогікі і гісторыі народнай асветы. Больш за 20 гадоў працаваў на пасадзе дырэктара Яўграф Іванавіч Смірноў. Яго праца «История Христианской церкви» была адзначана Свяшчэнным Сінодам поўнай Макар'еўскай прэміяй. Протаіерэй, законавучыцель М. І. Дуброўскі быў аўтарам брашуры «Житие Преподобной Евфросинии, Княжны Полоцкой» (1894). У 1908–1910 гг. рускую мову і літаратуру выкладаў Н. І. Зорын, аўтар кнігі «Минулое и современное Полоцка».

У 1912 г. шырока адзначалася 100-годдзе Айчыннай вайны 1812 года. З мэтай ушанавання герояў вайны земскі сход г. Полацка заснаваў стыпендыю для лепшых вучняў семінарыі. Загадам Міністэрства народнай асветы Полацкай настаўніцкай семінарыі было прысвоена імя генерала Я. П. Кульнева. У час першай сусветнай вайны семінарыя ў 1915 г. была эвакуіравана ў г. Вязнікі Уладзімірскай губерніі, адкуль педагогі і вучні вярнуліся ў 1916 г. У верасні 1919 г. настаўніцкая семінарыя была рэарганізавана ў 3-гадовыя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў працоўнай школы першай ступені, а затым – у педагагічны тэхнікум.

За ўвесь час існавання Полацкую настаўніцкую семінарыю скончылі са званнем народнага настаўніка каля 1000 чалавек. У розныя гады ў семінарыі атрымалі адукацыю вучні, якія сталі потым вядомымі навукоўцамі, дзеячамі беларускай культуры. Сярод іх вучоны-метадыст, аўтар шматлікіх падручнікаў па матэматыцы А. С. Пчолка, кандыдат педагагічных навук Н. І. Святлоўскі, вучоны-педагог М. І. Шляхценка, доктар сельскагаспадарчых навук Д. А. Іваноў, паэт І. Я. Івашын (Янка Журба). Полацкая настаўніцкая семінарыя з'яўлялася важнай састаўной часткай адукацыйнай сістэмы Беларусі. Яна адыграла пазітыўную ролю ў пашырэнні асветы, станаўленні айчыннай педагагічнай думкі.

У 1936 г. Полацкі педагагічны тэхнікум быў перайменаваны ў педагагічнае вучылішча. У 1964 г. яму было прысвоена імя Францыска Скарыны. За поспехі ў справе падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў Полацкае

120 гадоў таму (1897) у Оршы праведзены першы ўсеагульны перапіс насельніцтва.

120 гадоў таму (1897) у Віцебску ўведзена ў дзейнасць першая электрастанцыя.

120 гадоў таму (1897) перабудаваны Браслаўскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі – помнік архітэктуры неараманскага стылю.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Галіцкі Кузьма Мікітавіч (1897–1973), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебшчыны ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец Расіі.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Конанаў Гаўрыіл Фёдаравіч, прафсаюзны, гаспадарчы і партыйны дзеяч, ураджэнец в. Кісялёўка Мсціслаўскага раёна Магілеўскай вобласці. Старшыня Лепельскага калгассаюза.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Лапацін Антон Іванавіч (1897–1965), генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Каменная Брэсцкага раёна. Удзельнічаў у вызваленні Віцебска.

120 гадоў таму (1897) пабудавана з цэглы Успенская царква ў Браславе, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

120 гадоў таму (1897) заснавана прадпрыемства «Визас», «Витебские заточные станки» ў г. Клін Маскоўскай губерні (цяпер Маскоўская вобласць) як завод па вырабе адлівак з чыгуну. У 1944 годзе перанесены ў г. Віцебск і атрымаў назву «Витебский завод заточных станков». З 1991 года –арэнднае прадпрыемства «Визас». З 2003 года – ААТ.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Русецкі Вікенцій Данатавіч, ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалер ордэна Леніна.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Рэйнус Абрам Міхайлавіч, вучоны-медык, педагог, прафесар, доктар медыцынскіх навук, ураджэнец г. Полацка.

120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Воўсі Мірон Сямёнавіч, ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, вучоны-медык, заслужаны дзеяч навукі Расіі, акадэмік АМН СССР, кавалер ордэна Леніна, ураджэнец Віцебскай губерні.

115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Лапенка Варфаламей Якаўлевіч (1902–1942), адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Малое Сітна Полацкага раёна.

115 гадоў таму (1902) у Віцебску адкрыта гарадская санітарна-хімічная лабараторыя.

115 гадоў таму (1902) пачалося будаўніцтва жаночага духоўнага (епархіяльнага) вучылішча ў Віцебску. Зараз – будынак аблвыканкама.

115 гадоў таму (1902) у Віцебску пачалося будаўніцтва мужчынскага духоўнага вучылішча. Зараз – будынак аднаго з факультэтаў ВДУ.

115 гадоў таму (1902) пабудаваны мураваны млын у Оршы, помнік прамысловай архітэктуры з элементамі несапраўднай готыкі і рэтраспектыўна-рускага стылю. Зараз у будынку знаходзіцца Аршанскі этнаграфічны музей «Млын».

115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Ганчароў Афанасій Дзмітрыевіч (1902–1974), генерал-маёр, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец Віцебскай вобласці.

115 гадоў таму (1902) адкрыта параходная лінія Віцебск – Веліж.

115 гадоў таму (1902) Орша стала чыгуначным вузлом.

115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Спольнік Рыгор Іванавіч (1902–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Бешанковіцкага раёна. Ураджэнец Расіі.

115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Пазнякоў Іван Барысавіч (1902–1997), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага, падпольнага і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Хутаранка Гомельскага раёна.

Д. А. Талстой, папячыцель Віленскай навучальнай акругі М. А. Сергіеўскі, епіскап Полацкі і Віцебскі Сава, віцебскі губернатар П. Я. Растоўцаў. Семінарыя размясцілася ў двухпавярховым мураваным будынку з флігелямі былога павятовага і прыходскага вучылішчаў. Уся маёмасць і грашовыя сродкі гэтых устаноў былі перададзены настаўніцкай семінарыі. Пазней, за кошт дзяржаўных сродкаў, былі набыты яшчэ некалькі кватэр для настаўнікаў і абсталяваны інтэрнат для выхаванцаў. У 1911 г. семінарыя атрымала ўчастак на ўскраіне горада і пабудавала новае памяшканне. Семінарыя ўтрымлівалася за кошт казны, працэнтаў з уласнага капіталу, дапамогі Віцебскага і Магілёўскага земстваў. Навучанне было бясплатнае. Крыніцай стыпендый для навучэнцаў была дзяржаўная казна, а таксама сродкі сялянскай грамады і ахвяраванні.

Навучальная ўстанова мела тры асноўныя класы (з 1907 г. – чатыры) і гадавое падрыхтоўчае аддзяленне. Курс навучання ўключаў Закон Божы, педагогіку, асновы методыкі, рускую і царкоўнаславянскую мовы, арыфметыку, асновы геаметрыі, каморніцтва, лінейнае чарчэнне, гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, чыстапісанне, спевы, гімнастыку, рамяство (пераплётнае майстэрства і пляценне кошыкаў). На працягу ўсяго тэрміну вучобы навучэнцы мелі магчымасць атрымліваць тэарэтычную і практычную педагагічную падрыхтоўку.

Пры семінарыі дзейнічалі: узорнае пачатковае вучылішча (50–70 вучняў штогод), дзе семінарысты праходзілі педагагічную практыку; курсы для настаўнікаў пачатковых народных вучылішчаў; бібліятэка; метэаралагічная станцыя (з 1900 г.); музей наглядных дапаможнікаў (з 1910 г.). Вучэбна-выхаваўчы працэс быў накіраваны не толькі на атрыманне навучэнцамі неабходных ведаў, але і на выхаванне ў іх адпаведных маральных якасцей, ідэалагічных і палітычных перакананняў. Першы выпуск настаўнікаў адбыўся ў 1874 г. і налічваў 16 чалавек. За першыя 30 гадоў дзейнасці Полацкай настаўніцкай семінарыі быў падрыхтаваны 521 настаўнік.

Сярод педагогаў семінарыі было шмат творчых людзей. На працягу 7 гадоў узначальваў семінарыю дзеяч асветы, гісторык Аляксей

ПОЛАЦКАЯ НАСТАЎНІЦКАЯ СЕМІНАРЫЯ

Да 145-годдзя з дня заснавання (1872)

Полацкая настаўніцкая семінарыя з'яўлялася адной са старэйшых і найбольш вядомых педагагічных навучальных устаноў Беларусі. Рашэнне аб стварэнні семінарыі было зацверджана расійскім імператарам Аляксандрам II 18 студзеня 1872 г. Адкрыццё гэтай установы павінна было забяспечыць мясцовымі кадрамі пачатковыя школы і спрыяць ажыццяўленню адукацыйнай палітыкі дзяржавы. У першы навучальны год у семінарыю былі залічаны 52 юнакі (большасць – сяляне і мяшчане Віцебскай губерніі). Прымаліся асобы ўсіх саслоўяў, праваслаўнага веравызнання, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту і вытрымалі ўступныя экзамены па Закону Божаму, рускай мове, арыфметыцы і спевах. Першым дырэктарам семінарыі быў Юліян Фаміч Крачкоўскі (1840–1903), адзін з актыўных дзеячаў асветы, удзельнік руху за развіццё школ на Беларусі, які пачынаў педагагічную дзейнасць у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Ю. Ф. Крачкоўскі – вядомы беларускі этнограф, фалькларыст, археограф, былы інспектар Віленскай дырэкцыі народных вучылішчаў.

Урачыстае адкрыццё Полацкай настаўніцкай семінарыі адбылося 24 кастрычніка 1872 г. На ім прысутнічалі міністр народнай асветы граф

115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Цітоў Яфім Антонавіч (1902–1989), контр-адмірал, ураджэнец в. Макаўка Віцебскай вобласці.

115 гадоў таму (1902) дзейнічала Высачанская льнопрадзільная фабрыка ў в. Высачаны Лёзненскага раёна. У 1913 годзе была перайменавана ў Высачанскую мануфактуру.

115 гадоў таму (1902) створаны Аршанскі народны тэатр у г. Оршы як драматычны гурток. У 1961 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

110 гадоў таму (1907) адбылася першая мастацкая выстаўка работ Ю. Пэна і яго вучняў.

110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Рапейка Максім Восіпавіч (1907–1940), Герой Савецкага Саюза, удзельнік савецка-фінляндскай вайны, ураджэнец г. Полацка.

110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Кузняцоў Рыгор Ільіч (1907–1974), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

110 гадоў таму (1907) заснавана Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага ў фальварку Палівачы Глыбоцкага раёна.

110 гадоў таму (1907) выдавалася грамадска-палітычная і літаратурная газета «Витебский голос». Выдавалася штодзённа з 11.01.1906 г. да 18.06.1907 г. у Віцебску на рускай мове.

110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Жораў Абрам Ільіч (1907–1943), беларускі скульптар. У 1928–1929 гг. – член Віцебскага аб'яднання моладзі «Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыі». Ураджэнец г. Магілёва.

110 гадоў таму (1907) нарадзілася Казлоўская Марыя Мацееўна, беларуская песенніца, казачніца, носьбіт фальклорнай традыцыі, ураджэнка в. Груздава Пастаўскага раёна.

110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Акінковіч Леанід Нікіфаравіч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Кашына Аршанскага раёна.

110 гадоў таму (1907) заснавана Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка як настаўніцкая бібліятэка з кніжным фондам 249 асобнікаў, у 1919 годзе – 4 тыс. асобнікаў. У Вялікую Айчынную вайну была знішчана, аднавіла працу ў жніўні 1944 года. У 1953 годзе на базе дзіцячага аддзялення бібліятэкі ўтворана дзіцячая бібліятэка. У выніку праведзенай у 1978 годзе цэнтралізацыі 36 сельскіх бібліятэк былі аб'яднаны ў цэнтралізаваную сістэму і бібліятэка набыла статус цэнтральнай раённай.

110 гадоў таму (1907) пабудаваны Мёрскі касцёл Узнясення Дзевы Марыі, помнік архітэктуры неаготыкі ў г. Мёры.

110 гадоў таму (1907) пабудаваны Мілюнскі касцёл святога Якава, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Мілюнцы Браслаўскага раёна.

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Каўроў Фёдар Кузьміч (1912–1937), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец Дубровенскага раёна.

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Мурзо Сяргей Мікітавіч (1912–1937), паэт, ураджэнец г. Масквы. Да 1930 года працаваў токарам на Віцебскім станкабудаўнічым заводзе імя Камінтэрна.

105 гадоў таму (1912) у Шаркаўшчыне пабудавана Свята-Успенская царква – помнік архітэктуры стылю мадэрн.

105 гадоў таму (1912) у Магілёве выйшла ў свет кніга В. Жудро «Оршанский Богоявленский Кутеинский монастырь или древняя белорусская лавра».

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Сцепанцоў Іван Фёдаравіч, ураджэнец Гомельскай вобласці, прафсаюзны работнік, педагог, дырэктар школы ў Оршы.

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Садоўскі Леанід Васілевіч у в. Арлея Полацкага раёна, прафсаюзны і дзяржаўны дзеяч, супрацоўнік Лепельскай газеты «Калгасная праўда».

«Арнамент» (2000), «Падарожжа па Віцебску» (2001), «Кампазіцыя» (2002); тэкстыльныя кампазіцыі «Ікар I-II» (2002), «Кампазіцыя I, II, II, IV» (2003); інсталяцыі «Дом для піяніна» (2002), «Ікар III» (2005), «Цішыня» (2006), «Божа, захавай Беларусь» (2007), «Ён і яна» (2009), «Спіраль» (2010), «Вернісаж» (2010), «Хаос» (2010); арт-аб'екты «Бусы для каханай II» (2008), «Ікар IV» (Германія, 2009) і інш.

Работы мастака знаходзяцца ў Музеі Марка Шагала ў Віцебску, краязнаўчым музеі ў Баранавічах, Музеі сучаснага мастацтва ў Мінску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Генадзь Фалей** // Саюз творцаў = A Union of creators : [фотаальбом] / уклад. і аўт. тэксту М. Цыбульскі ; пер. на англ. мову А. Казека. – Мінск : Беларусь, 2005. – С. 127.

2. **Краснова, Ю.** Обратная сторона Луны / Ю. Краснова // Витебский проспект. – 2012. – 13 дек. – С. 19.

3. **Крупица, Н.** «Трасса». Эмоции романтика / Н. Крупица // Витьбичи. – 2012. – 15 дек. – С. 16.

4. **Крупіца, Н.** Адкрыты ліст да вандроўніка па жыцці / Н. Крупіца // Витьбичи. – 2007. –25 окт. – С. 5.

5. **Салаўёва, Т.** Вандроўнік па жыцці / Т. Салаўёва // Витебский проспект. – 2007. – 18 окт. – С. 4.

6. **Фалей** Генадзь Аляксандравіч // Беларускі саюз мастакоў = Belarussian union of artists : 1938–1998 : энцыклапедычны даведнік / аўт.-склад. Б. А. Крэпак [і інш.]. – Мінск : ВТАА «Кавалер Паблішэрс», 1998. – С. 551.

4. **Цыбульский, М. Л**. Фалей Геннадий Александрович / М. Л. Цыбульский // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 556.

6. **Мезенцев, В**. Комбриг Бирюлин / В. Мезенцев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2012. – 25 верас. – С. 2.



ФАЛЕЙ

ГЕНАДЗЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ

60 год з дня нараджэння (1957)

Генадзь Аляксандравіч Фалей нарадзіўся 14 кастрычніка 1957 г. у вёсцы Задзвея Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Беларускі мастак. Скончыў Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці па спецыяльнасці «Мастацкае афармленне і мадэліраванне вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці» (1987). З 1982 года жыве ў Віцебску. Член творчага аб'яднання «Аршыца». З 2000 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на кафедры дызайну. Член Беларускага саюза мастакоў (1996).

Працуе ў галіне ручнога ткацтва, аб'ёмнага тэкстылю, аб'екта.

Удзельнік мастацкіх выставак з 1988 г. Сярод твораў: габелены

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Марозаў Дзмітрый Кузьміч (1912–1981), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Казіміраўка Гомельскай вобласці. Вызначыўся пры абароне паўднёвага ўсходу Віцебска.

105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Каленікаў Іван Емяльянавіч (1912–1969), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Гомель. Удзельнік абарончых баёў 1941 года каля г. Сянно.

105 гадоў таму (1912) створана Полацкая цэнтральная гарадская бібліятэка як таварыства Полацкай бібліятэкі. З 1990 года носіць імя Ф. Скарыны.

100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Ісурын Аляксандр Іосіфавіч, трэнер, спартыўны дзеяч, аўтар кнігі па гісторыі спорту, ураджэнец г. Віцебска.

100 гадоў таму (1917) у г. Віцебску пачала выдавацца «Аршанская газета». Першапачаткова называлася «Известия рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Оршанского района», «Набат», «Камуністычны шлях», «Змычка», «Ленінскі прызыў». З 1991 года – сучасная назва.

100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Воўк Барыс Васільевіч (1917–1939), Герой Савецкага Саюза, удзельнік савецка-фінляндскай вайны, ураджэнец Віцебскай вобласці.

100 гадоў таму (1917) у Віцебску і Оршы ўзніклі першыя рэвалюцыйныя арганізацыі моладзі пры камітэтах РСДРП.

100 гадоў таму (1917) заснавана Віцебская гарадская інфекцыйная бальніца (мае статус клінічнай).

100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Смятанін Уладзімір Сяргеевіч (1917–1944), Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец г. Паўлаграда Днепрапятроўскай вобласці. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі пры вызваленні Віцебскай вобласці.

100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Жданаў Аляксей Мітрафанавіч (1917–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці, ураджэнец с. Круглае Белгарадскай вобласці (Расія).

100 гадоў таму (1917) пасля Лютаўскай рэвалюцыі на тэрыторыі Віцебскай вобласці пачалі ствараццa органы аховы правапарадку. У сакавіку 1917 года пачалося фарміраванне народнай міліцыі, быў створаны міліцэйскі пададдзел Віцебскага губвыканкама.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Анташкевіч Фёдар Кузьміч (1922–1945), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Казігорка Талачынскага раёна.

95 гадоў таму (1922) у Чашніках адкрыта раённая бальніца.

95 гадоў таму (1922) адкрыта Зарубская СШ Дубровенскага раёна.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Карначонак Мікалай Аляксандравіч (1922–1942), Герой Савецкага Саюза, лётчык-знішчальнік, ураджэнец в. Баркі Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў аэраклуб у Оршы. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Паўднёва-Заходнім і Сталінградскім франтах.

95 гадоў таму (1922) у Віцебску выйшла кніга К. Малевіча «Бог не скинут. Искусство, церковь, фабрика».

95 гадоў таму (1922) у Віцебску працаваў першы юнацкі губернскі паказальны тэатр.

95 гадоў таму (1922) ліквідавана Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, першая ў Беларусі спецыяльная вышэйшая навучальная ўстанова, якая рыхтавала кваліфікаваных спецыялістаў-археолагаў, археографаў, архівістаў.

95 гадоў таму (1922) створана Пракуратура Віцебскай вобласці як пракуратура Віцебскай губерні РСФСР.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Салончанка Уладзімір Данілавіч (1922–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебшчыны. Ураджэнец Расіі.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Канапелька Пётр Якаўлевіч (1922–1997), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, ураджэнец Украіны. З 1954 года працаваў у ВДАВМ.

г. Віцебска. З 1959 г. і да выхаду на пенсію (1980 г.) працаваў дырэктарам Віцебскай макароннай фабрыкі.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гады вайны, самаадданую працу ў мірны час М. Ф. Бірулін узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, «Знак Пашаны».

У 1967 г. удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Віцебска».

Праводзіў вялікую ваенна-патрыятычную работу сярод моладзі. Па яго ініцыятыве быў створаны музей баявой славы Першай Віцебскай брыгады ў Вярхоўскай СШ Віцебскага раёна (цяпер СШ № 9 г. Віцебска).

Памёр 20 жніўня 1999 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бирюлин** Михаил Фёдорович // Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны : (июнь 1941 – июль 1944) : краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / авт. коллектив: А. Л. Манаенков [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – С. 9, 221, 222, 226, 311, 312, 313, 361, 362.

2. **Бірулін** Міхаіл Федаравіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1970. – Т. 2 : Афіны – Ведрыч. – С. 339.

3. **Бірулін** Міхаіл Фёдаравіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 86.

4. **Гончаров, А.** Партизанский командир / А. Гончаров // Віцеб.рабочы. – 2002. – 28 верас. – С. 2.

5. **Долготович Б. Д.** Бирюлин Михаил Федорович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : Беларусь, 2008. – С. 54.

БІРУЛІН

МІХАІЛ ФЁДАРАВІЧ

Да 105-годдзя з дня нараджэння (1912)

Міхаіл Фёдаравіч Бірулін нарадзіўся 27 верасня 1912 г. у вёсцы Любяціна Веліжскага раёна Смаленскай вобласці. Вялікая Айчынная вайна сустрэла яго на пасадзе старшыні Бараўлянскага сельскага Савета Віцебскага раёна. У пачатку ліпеня 1941 года ён вымушаны быў эвакуіравацца ў савецкі тыл, аднак неўзабаве вярнуўся ў Віцебскі раён для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы з нямецкімі акупантамі.

У жніўні 1941 г. у Мікалаеўскім і Бараўлянскім сельсаветах І. Д. Буцьянавым была створана падпольная група. Пасля яго гібелі ў лістападзе 1941 г. групу ўзначаліў М. Ф. Бірулін. На базе яе ён стварыў партызанскі атрад, які ўвайшоў у 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду М. П. Шмырова.

Міхаіл Фёдаравіч меў баявы досвед, атрыманы падчас савецка-фінляндскай вайны, быў афіцэрам запасу. Па меры росту колькасці атрада ў лютым 1943 г. ён быў пераўтвораны ў 1-ю Віцебскую партызанскую брыгаду, камандзірам якой быў зацверджаны Міхаіл Бірулін. Пад яго кіраўніцтвам народныя мсціўцы наносілі адчувальныя ўдары па ворагу.

Калі яшчэ шугала полымя вайны і значная частка тэрыторыі знаходзілася пад варожай акупацыяй, М. Ф. Бірулін на пасадзе старшыні райвыканкама прыступіў да аднаўлення разбуранай гаспадаркі, стварэння элементарных умоў для жыцця людзей. У самы цяжкі час у 1943–1959 гг. ён узначальваў спачатку Віцебскі, а затым Чыгуначны райвыканкамы

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Возлікаў Аляксандр Піліпавіч, Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец с. Тварышына Бранскай вобласці.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Веснін Мікалай Дзмітрыевіч (1922–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Арлоўка Амурскай вобласці.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Вакульскі Аляксандр Васільевіч (1922–1990), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Калмытава Іглінскага раёна. Удзельнік баёў на Віцебска-Полацкім напрамку.

95 гадоў таму (1922) дзейнічаў Віцебскі губернскі паказальны тэатр.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Аўчыннікаў Аляксандр Мікалаевіч, краязнаўца, ураджэнец в. Казейкіна Бешанковіцкага раёна.

90 гадоў таму (1927) у Віцебску адкрыта вопытная станцыя жывёлагадоўлі.

90 гадоў таму (1927) пачаў работу Талачынскі філіял Віцебскага тэкстыльнага вытворчага аб'яднання.

90 гадоў таму (1927) у Оршы пабудаваны Дом культуры і тэхнікі чыгуначнікаў.

90 гадоў таму (1927) адбылася першая дэманстрацыя кіно на Ушаччыне.

90 гадоў таму (1927) заснавана Віцебская фанерная фабрыка. Зараз – ААТ «Віцебскдрэў».

90 гадоў таму (1927) мастаку Ю. Пэну прысвоена званне «Народны мастак Віцебшчыны».

90 гадоў таму (1927) у Віцебску заснаваны «Вторчермет». Зараз – УП «Витебскторчермет».

90 гадоў таму (1927) заснаваны Полацкі завод сельскагаспадарчага абсталявання на базе слясарна-механічнага завода.

90 гадоў таму (1927) нарадзілася Бабадаева Марыя Сцяпанаўна, народны майстар, ураджэнка х. Запушча Шумілінскага раёна.

90 гадоў таму (1927) у Віцебску пабудаваны дом-камуна (архіт. А. Вышалескі) як першае ў Беларусі зручнае эканамічнае жыллё для працоўных.

90 гадоў таму (1927) заснаваны Лёзненскі льнозавод у г. п. Лёзна. З 1996 года – ААТ.

90 гадоў таму (1927) заснавана прадпрыемства па вытворчасці ліцця рознага прымянення з шэрага чыгуну і прадукцыі металаапрацоўкі «Технолит Полоцк» у г. Полацку як завод сельскагаспадарчага абсталявання на базе дробных саматужных майстэрняў «Труд-Калектыў».

85 гадоў таму (1932) уведзены ў строй мясакамбінат у г. Оршы.

85 гадоў таму (1932) пабудаваны Віцебскі клуб металістаў – культурна-асветная ўстанова для рабочых. З'яўляецца помнікам савецкай архітэктуры 1930-х гадоў.

85 гадоў таму (1932) заснаваны Верхнядзвінскі масласырзавод. У 1964 годзе – пашыраны і мадэрнізаваны. З 1999 года – ААТ з сучаснай назвай. У 2009 годзе рэарганізаваны (пабудаваны новы цэх з аўстрыйскім абсталяваннем па вытворчасці сыроў).

85 гадоў таму (1932) у Віцебску адкрыта гарадская бальніца № 2.

85 гадоў таму (1932) адкрыта Задуброўская СШ Віцебскага раёна.

85 гадоў таму (1932) створана Віцебскае аддзяленне таварыства глухіх.

85 гадоў таму (1932) заснавана машынна-трактарная майстэрня Аршанскай машынабудаўнічай станцыі ў Оршы. Зараз – ААТ «Оршаагропроммаш».

85 гадоў таму (1932) заснаваны Сенненскі льнозавод ў г. Сянно Віцебскай вобласці, з 1999 года – ААТ.

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1945), ордэнам Айчыннай вайны I ступені (1985), медалямі. На Чашніччыне ганарацца сваім славутым земляком. У раённым цэнтры ўсталявана мемарыяльная дошка на будынку сярэдняй школы № 1, дзе вучыўся будучы Герой Савецкага Саюза.

ЛІТАРАТУРА

1. **Пшенный** Сергей Фомич // Герои Советского Союза : крат. биогр. слов. : в 2 т. / редкол.: И. Н. Шкадов [и др.]. – Москва : Воениздат, 1988. – Т. 2. – С. 337.

2. **Пшенный** Сергей Фомич // Навечно в сердце народном. –2-е изд., доп. и перераб. / гл. ред. П. У. Бровка. –Минск : Главная редакция Белорусской Советской Энциклопедии, 1977. – С. 377.

3. **Пшенный** Сергей Фомич // Слава и гордость земли Витебской : биог. справ. / редкол.: М. П. Кузьмич [и др.] ; сост. М. Н. Пригожий. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 111.

4. **Пшонны** Сяргей Фаміч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 13. – С. 149.

5. **Пшонны** Сяргей Фаміч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1990. – С. 513.

6. **Пшонны** Сяргей Фаміч // Памяць : Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; аўт.-уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – С. 431.

7. **Пшонны, С.** Мы ішлі на Захад / С. Пшонны // Чырвоны прамень (Чашнікі). – 1965. – 8 мая. – С. 2.

8. **Румін, В.** Адказнае заданне / В. Румін // Віцебскі рабочы. – 1983. –23 лют. – С. 2.

нападзенне гітлераўскай Германіі парушыла мірную працу і асабістыя планы 19-гадовага юнака. У чэрвені 1941 г. ён стаў удзельнікам абароны Ленінграда. Пад горадам на Няве прыняў першы бой. Неўзабаве быў паранены і трапіў у шпіталь. У 1942 г. скончыў афіцэрскія курсы і быў прызначаны камандзірам мінамётнага ўзвода.

На фронце Сяргей Пшонны рваўся ў бой з ворагам, які прынёс так многа гора Айчыне і яго сям'і. У асаджаным Ленінградзе памёр ад голаду бацька Фама Рыгоравіч. У няроўным баі загінуў на другі год вайны брат – ваенны лётчык. С. Пшонны па-геройску змагаўся з фашыстамі пад Петразаводскам, Мурманскам, Кіраўскам. Камандаванне перакінула гвардзейскую Запарожскую Чырвонасцяжную ордэна Суворава і Багдана Хмяльніцкага дывізію, у якой ваяваў С. Пшонны, на першы Беларускі фронт. З сярэдзіны 1944 г. Сяргей Фаміч удзельнічаў у вызваленні роднай Беларусі.

Старшы лейтэнант Пшонны, афіцэр разведкі 227-га гвардзейскага стралковага палка (79-я гвардзейская стралковая дывізія, 8-я гвардзейская армія, I Беларускі фронт), вызначыўся пры фарсіраванні Віслы на поўдзень ад Варшавы. 2 жніўня 1944 г. узвод разведчыкаў на чале з С. Пшонным пераправіўся праз раку, дзе знішчыў агнявыя кропкі праціўніка, ліквідаваў тэлефонную сувязь, разграміў штаб гітлераўскага зенітнага палка. У выніку аперацыі былі знішчаны 45 фашыстаў, узяты ў палон 3 афіцэры з дакументамі палка, захоплены палкавы сцяг ворага. Подзвіг разведчыкаў садзейнічаў пераправе двух савецкіх палкоў.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм 24 сакавіка 1945 г. Пшоннаму Сяргею Фамічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З 1946 г. маёр запаса С. Пшонны жыў у Днепрапятроўску, добрасумленна працаваў начальнікам цэха на заводзе, часта прыязджаў на радзіму, наведваў СШ № 1 г. Чашнікі, дзе вучыўся да пераезду бацькоў у Ленінград. Памёр 30 жніўня 1994 г.

85 гадоў таму (1932) заснаваны Полацкі хлебазавод у г. Полацку, у 1933 годзе быў уведзены ў эксплуатацыю, затым хлебазаводу былі перададзены ўсе пякарні горада і прадпрыемства было пераўтворана ў хлебакамбінат. З 2001 года – філіял РУВП «Віцебскхлебпрам» з сучаснай назвай.

85 гадоў таму (1932) заснаваны Ушацкі льнозавод у г. п. Ушачы Віцебскай вобласці, з 1997 года – ААТ.

85 гадоў таму (1932) заснаваны Бешанковіцкі льнозавод у пасёлку Двурэчча Бешанковіцкага раёна, з 1997 года – ААТ.

85 гадоў таму (1932) заснаваны Лепельскі рамонтна-механічны завод як машынна-трактарная майстэрня. З 1947 года – Лепельская міжраённая майстэрня капітальнага рамонту. З 1958 (і з 1969) года – рамонтны завод. З 1959 года – экскаватарарамонтны завод. З 1993 года – рамонтна-механічны завод. З 2000 года – РУСП. З 2003 года – ААТ з сучаснай назвай. З 2004 года – у складзе канцэрна «Белаграмаш».

85 гадоў таму (1932) заснаваны Віцебскі вінаробны завод «ВитВин» на базе цэха пладова-ягадных вінаў. У 1981–1987 гг. – камбінат. З 1988 года – арэнднае прадпрыемства «Витебский завод пищевых продуктов». З 2002 года – ААТ з сучаснай назвай.

80 гадоў таму (1937) адкрыта Аршанскае медыцынскае вучылішча.

80 гадоў таму (1937) пабудавана першая чарга Аршанскага льнокамбіната.

80 гадоў таму (1937) у Оршы адкрыты настаўніцкі інстытут. Дзейнічаў да 1955 года. Зараз – педагагічны каледж.

80 гадоў таму (1937) адноўлены Віцебскі раён – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Віцебскай вобласці.

80 гадоў таму (1937) нарадзілася Маслава Людміла Парфір'еўна, член клуба народных майстроў і мастакоў «Крыніца», ураджэнка г. Глыбокае.

80 гадоў таму (1937) заснаваны Аршанскі дзяржаўны медыцынскі каледж у г. Оршы як школа медыцынскіх сясцёр. З 1955 года – медыцынская ўстанова, з 2007 года – сучасная назва.

80 гадоў таму (1937) нарадзілася Яленская Алена Вікенцьеўна, актрыса тэатра, заслужаны работнік Расіі, ураджэнка г. Віцебска.

80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Паўлоўскі Альварэс Іванавіч, вучоны-матэматык, педагог, выдатнік асветы Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Сяркуццеў Генадзь Васільевіч, вучоны ў галіне педагогікі, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

75 гадоў таму (1942) створана ўвосень Полацка-Лепельская партызанская зона. Ахоплівала тэрыторыі Ушацкага, часткі Полацкага, Лепельскага і Глыбоцкага раёнаў.

75 гадоў таму (1942) у пачатку 1942 года па даручэнні Сіроцінскага падпольнага райкама КП(б)Б Е. Зянькова пачала ствараць падпольную арганізацыю, у якую ўвайшлі 38 хлопцаў і дзяўчат.

75 гадоў таму (1942) у гады Вялікай Айчыннай вайны ўтварылася Бягомльская партызанская зона.

75 гадоў таму (1942) адбылося фарміраванне партызанскіх брыгад: 1-й Беларускай, 2-й Беларускай імя П.К. Панамарэнкі, 4-й Беларускай, імя Кутузава, імя Ленінскага камсамола, «Смерць фашызму», «Сіроцінская».

75 гадоў таму (1942) у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебску заснавана падпольная група Героя Савецкага Саюза В. Харужай.

75 гадоў таму (1942) створана Расонская партызанская брыгада імя І. В. Сталіна пад камандаваннем Р. А. Ахоціна.

75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Захарчук Уладзімір Пятровіч, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнец г. Бярдзічава Жытомірскай вобласці. Жыве ў Віцебску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Лавіцкі, Г. М.** // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.] ; склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – С. 566.

2. **Лавицкий, Г. М**. // Щит и меч Отечества / редкол.: В. И. Дементей (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2006. – С. 262.

3. **Лавицкий, Г. М.** // На службе Родине : страницы истории / авт. коллектив В. И. Дементей [и др.]. – Витебск : УПП «Витебская областная типография», 2004. – С. 336.

ПШОННЫ

СЯРГЕЙ ФАМІЧ

Да 95-годдзя з дня нараджэння (1922)

Сяргей Фаміч Пшонны нарадзіўся 5 верасня 1922 г. у вёсцы Кушняроўка Чашніцкага раёна ў сялянскай сям'і. Да вайны ён жыў у Ленінградзе і працаваў токарам на заводзе «Электрасіла». Вераломнае

ЛАВІЦКІ
ГЕНАДЗЬ МІХАЙЛАВІЧ

Да 75-годдзя з дня нараджэння (1942)

Генадзь Міхайлавіч Лавіцкі нарадзіўся 28 жніўня 1942 г. у вёсцы Нова-Беліца Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1970 г. скончыў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С. М. Кірава па спецыяльнасці біялогія і хімія. У 1971 г. – вышэйшыя курсы КДБ пры СМ СССР.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1960 г. рабочым Віцебскага тэхналагічнага ўчастка рачных шляхоў. У 1961–1970 гг. вучыўся ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце і праходзіў ваенную службу ў Ваенна-Марскім флоце СССР. У органах дзяржаўнай бяспекі з 1970 г. Службу пачаў ва УКДБ пры СМ БССР па Віцебскай вобласці, дзе прайшоў шлях ад оперупаўнаважанага да памочніка начальніка Упраўлення па кадрах.

У 1984 г. назначаны на пасаду намесніка начальніка 3-га ўпраўлення КДБ БССР. У гэтым жа годзе адкамандзіраваны ў цэнтральны апарат КДБ СССР і назначаны старшым інспектарам Інспектарскага ўпраўлення. У 1988–1994 гг. – намеснік Старшыні КДБ БССР (з 1991 года КДБ Рэспублікі Беларусь).

З 22 лютага па 23 ліпеня 1994 г. – Старшыня КДБ Рэспублікі Беларусь. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 1995 г. назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Ізраілі.

Узнагароджаны 15 медалямі.

Памёр у 2013 годзе.

75 гадоў таму (1942) нарадзілася Зарэцкая Лілія Радзівонаўна, майстар па вышыўцы, ураджэнка в. Макаршчына Пастаўскага раёна.

75 гадоў таму (1942) пабудаваны Аршанскі манастыр базылянак.

75 гадоў таму (1942) адбыліся Казянскія баі паміж партызанскім атрадам «Спартак» і нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў в. Казяны Відзаўскага (цяпер Браслаўскага) раёна (верасень, лістапад).

70 гадоў таму (1947) уведзены ў строй Віцебскі домабудаўнічы камбінат.

70 гадоў таму (1947) першую прадукцыю выпусціў Пастаўскі льнозавод. Зараз – ААТ.

70 гадоў таму (1947) зямельны аддзел у г. Віцебску перайменаваны ва ўпраўленне сельскай гаспадаркі. Зараз – камітэт сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

70 гадоў таму (1947) нарадзілася Маісеева Антаніна Максімаўна, беларуская мастачка, ураджэнка в. Сякірына Сенненскага раёна.

70 гадоў таму (1947) нарадзілася Чарняўская Лілія Уладзіміраўна, майстар вышыўкі, ураджэнка в. Сярковіцы Талачынскага раёна.

70 гадоў таму (1947) нарадзілася Канцыял Галіна Іванаўна, народны мастак, ураджэнка в. Сіманаўшчына Заронаўскага с/с.

70 гадоў таму (1947) нарадзілася Шматава Ніна Іванаўна, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка в. Вітлін Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Жыве ў Полацку.

70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Лук’янец Уладзімір Канстанцінавіч, майстар, ураджэнец г. Браслава. Займаецца вырабам мэблі з лазы.

70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Вішнеўскі Аляксандр Сяргеевіч, мастак і майстар па кераміцы Докшыцкага Дома рамёстваў, ураджэнец г. Докшыцы.

70 гадоў таму (1947) створаны Докшыцкі народны тэатр у г. Докшыцы пры раённым Доме культуры. У 1982 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр».

70 гадоў таму (1947) адкрыўся Віцебскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер.

70 гадоў таму (1947) заснаваны Верхнядзвінскі раённы Дом культуры ў горадзе Дрыса (з 1962 г. Верхнядзвінск) як раённы Дом культуры.

70 гадоў таму (1947) створаны Віцебскі народны клуб самадзейных мастакоў «Контур» пры Доме народнай творчасці як студыя выяўленчага мастацтва. З 1980 года – клуб самадзейных мастакоў. З 1987 года – сучасная назва. У 1988 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў». З 1997 года дзейнічае пры Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне».

70 гадоў таму (1947) у Віцебску заснавана прадпрыемства па вытворчасці дывановых вырабаў «Витебские ковры» на базе льнопрадзільнай фабрыкі «Двина». З 1980 года – Віцебскае вытворчае дывановае аб'яднанне імя 50-годдзя БССР. З 1994 года – ААТ з сучаснай назвай.

70 гадоў таму (1947) створаны Віцебскі народны духавы аркестр культурна-дзелавога цэнтра «Першамайскі» пры клубе дрэваперапрацоўчага камбіната. У 2008 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў». З 2009 года – сучасная назва.

70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Наско Станіслаў Вікенц'евіч (1947–2014), беларускі кампазітар, ураджэнец Докшыцкага раёна.

70 гадоў таму (1947) утворана ААТ «Полацкбыт».

65 гадоў таму (1952) у Талачыне адкрыта дзіцячая бібліятэка.

65 гадоў таму (1952) у г. п. Багушэўск адкрыта дзіцячая бібліятэка.

65 гадоў таму (1952) у Віцебску адкрыта станцыя юных натуралістаў.

65 гадоў таму (1952) на базе завода «Сантэхапаратура» створаны Аршанскі завод швейных машын. З 1977 года – вытворчае аб'яднанне «Прамшвеймаш».

Працаваў загадчыкам аддзела рэдакцыі часопіса «Молодая гвардия», выкладаў у літаратурным інстытуце. З 1972 па 1980 год узначальваў рэдакцыю «Роман-газеты». Некаторы час з'яўляўся дарадцам Міністэрства па справах нацыянальнасцяў Расійскай Федэрацыі. Гэты перыяд быў цесна звязаны з Паўночным Каўказам. Свае назіранні пра «чачэнскую бойню» пісьменнік выказаў у кнізе «Дні сярод маланак». За гэтую кнігу ў лістападзе 1995 года наш зямляк удастоены звання Ганаровага акадэміка Пушкінскай Акадэміі. Асобнай кнігай у Маскве выйшла аповесць «Пакуль куля ляціць», за якую Генадзь Барысавіч быў узнагароджаны срэбным медалём Міжнароднага Саюза славянскіх журналістаў. Па ініцыятыве Г. Б. Пацыенкі быў падрыхтаваны спецыяльны выпуск часопіса «Жыццё нацыянальнасцяў» (№ 1, 1997), прысвечаны адукацыі Саюза Расіі і Беларусі.

Для творчасці гэтага пісьменніка характэрна шчырасць. Яго творы пра людзей рознабаковых, маральных, мудрых, якія захоўваюць вартасці ў самыя супярэчлівыя і цяжкія часы. У 2007 годзе ў Віцебску быў выдадзены, дарэчы, упершыню на радзіме, двухтомнік Г. Б. Пацыенкі «Выбранае», куды ўвайшло ўсё лепшае, што было напісана аўтарам за гады творчай працы.

У цяперашні час Генадзь Барысавіч жыве і працуе ў родных Зубаках. Яго творы працягваюць абуджаць у нас добрыя пачуцці.

ЛІТАРАТУРА

1. **Кузьмич, М.** Тропа на спуске к озеру / М. Кузьмич // Нёман. – 2009. – № 3. – С. 161–171.

2. **Пациенко, Г. Б.** Прикосновение к тайне / Г. Б. Пациенко ; беседовала Л. Дедюро // Віцебскі рабочы. – 2012. – 23 жн. – С. 20–21.

3. **Пепеляев, В.** Наследник по прямой / В. Пепеляев // Советская Белоруссия. – 2009. – 5 февр. – С. 9.

4. **Похолкина, Ю.** Пользуясь словами, пишет чувствами / Ю. Похолкина // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2007. – 25 жн. – С. 2, 7.

5. **Салтук, А.** Шэпт аржаных каласоў / А. Салтук // Віцебскі рабочы. – 2007. – 18 снеж. – С. 6.

Жнівень

ПАЦЫЕНКА

ГЕНАДЗЬ БАРЫСАВІЧ

80 год з дня нараджэння (1937)

Генадзь Барысавіч Пацыенка нарадзіўся 25 жніўня 1937 г. у в. Зубакі Лёзненскага раёна. Тут жа скончыў 4 класы, а потым сямігодку ў в. Дабрамыслі. Вучыўся ў ФЗН чыгуначнікаў у Віцебску. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Гродне. З 1954 па 1956 гады Генадзь Барысавіч працаваў на цаліне, пасля чаго вярнуўся ў Гродна. Неўзабаве быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Служыў танкістам на Далёкім Усходзе. Далёка ад Радзімы па-новаму зірнуў на родную Беларусь, Лёзненшчыну, ацаніў іх непаўторнасць. Пасля дэмабілізацыі працаваў токарам на Гродзенскім заводзе «Аўтазапчасткі». Супрацоўнічаў з газетай «Гродзенская праўда». У тыя гады яе ўзначальваў Васіль Быкаў. Ён звярнуў увагу на творчасць нашага земляка і ў 1961 годзе адправіў яго на з'езд маладых пісьменнікаў Беларусі ў Мінск. У гэтым жа годзе з рэкамендацыйным лістом ад Васіля Быкава і Івана Шамякіна Г. Б. Пацыенка адправіўся ў Маскву паступаць у літаратурны інстытут імя Горкага. Нягледзячы на велізарны конкурс (85 чалавек на месца), адзіны з нашай рэспублікі быў залічаны на першы курс. Пасля Літінстытута скончыў аспірантуру.

65 гадоў таму (1952) пачаў працу Полацкі льнозавод.

65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Шыпко Пётр Ігнатавіч, вучоны ў галіне тэхналогіі вырошчвання льну, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Ураджэнец в. Шарагі Глыбоцкага раёна.

65 гадоў таму (1952) нарадзілася Мішурная Святлана Анатольеўна, жывапісец, ураджэнка г. Віцебска.

65 гадоў таму (1952) нарадзілася Казьмінская Ала Леанідаўна, кіраўнік клуба «Натхненне» Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў «Дзвіна», ураджэнка г. Віцебска.

65 гадоў таму (1952) заснаваны Лепельскі льнозавод у пасёлку Белаазёрны Лепельскага раёна як льнозавод. З 1999 года – ААТ.

65 гадоў таму (1952) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза мастакоў як аддзяленне Беларускага саюза мастакоў. З 2003 года – сучасная назва.

60 гадоў таму (1957) быў выяўлены Н. Н. Гурынай археалагічны помнік Крумплева – стаянка ранняга мезаліту культуры кунда каля в. Крумплева Полацкага раёна. У 1967 г. даследаваннем займаўся І. М. Ціханенкаў.

60 гадоў таму (1957) Мёры атрымалі статус гарадскога пасёлка.

60 гадоў таму (1957) у Віцебску адкрыты ДК ВА «Віцебскдрэў».

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Раеўскі Аляксандр Міхайлавіч (1957–2008), ваенны лётчык, Герой Расіі (1995). Заслужаны лётчык-выпрабавальнік Расійскай Федэрацыі (2002), ураджэнец г. Паставы Віцебскай вобласці.

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Івашкевіч Алег Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне ветэранарыі, ураджэнец в. Бярозаўка Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Яленскі Уладзімір Якаўлевіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Барань Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

60 гадоў таму (1957) нарадзілася Сапроненка Інэса Леанідаўна, майстар народнага клуба майстроў «Натхненне», ураджэнка г. Віцебска. Кіраўнік гуртка «Кераміка» Сенненскага Дома рамёстваў.

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Крукоўскі Мікалай Уладзіміравіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Барань.

60 гадоў таму (1957) нарадзілася Ананьева Марыя Іванаўна, майстар-метадыст па народнай вышыўцы, ураджэнка г. Паставы. Працуе ў Доме рамёстваў «Стары млын».

60 гадоў таму (1957) в. Езярышча Гарадоцкага раёна набыла статус гарадскога пасёлка.

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Віннік Вячаслаў Цімафеевіч, кіраўнік Старшынства губернатара і ўрада Ніжагародскай вобласці ў Рэспубліцы Беларусь, ураджэнец г. Лепеля.

60 гадоў таму (1957) заснавана прадпрыемства па вытворчасці жалезнабетонных канструкцый і жалезнабетонных вырабаў і канструкцый «Горизонт» будаўнічага трэста № 9. У 1989 годзе – кааператыў «Горизонт». З 1994 года – ААТ.

60 гадоў таму (1957) утворана сельскагаспадарчае прадпрыемства «Полимир-Агро» як саўгас «Туровлянский» на базе 11 калгасаў у Полацкім раёне. З 2001 года – КУСП. З 2004 года – прыватнае сельскагаспадарчае УП з сучаснай назвай.

60 гадоў таму (1957) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

60 гадоў таму (1957) створаны Віцебскі народны харавы калектыў «Славіца» пры вучэбна-вытворчым камбінаце № 1 Беларускага таварыства сляпых. З 2010 года дзейнічае пры прыватным УП «Элект» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку». У 1990 гаду прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

Марчанка – адна з трох савецкіх жанчын, узнагароджаных гэтым медалём. У 2013 г. была праведзена рэканструкцыя будынка музея і зроблена рээкспазіцыя.

Ураджэнка полацкай зямлі за кароткі час знаходжання на фронце вынесла з поля бою больш за 100 параненых, але ў адным з баёў сама была цяжка паранена. У выніку шматлікіх аперацый урачы ампуціравалі 23-гадовай дзяўчыне рукі і ногі. Але і ў такім цяжкім стане яна знайшла ў сабе сілы для таго, каб жыць і працаваць. Салдаты на фронце ведалі пра мужную медыцынскую сястру і помсцілі за яе ворагу. На подступах да Полацка ў 1944 г. можна было сустрэць танкі, на брані якіх было напісана «За дзяўчыну з Полацка». У пераможным маі 1945 г. Зінаіда Тусналобава з’яднала свой лёс з Іосіфам Марчанкам, якога сустрэла і пакахала яшчэ да вайны. Зараз у Полацку жывуць іх сын і дачка.

Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанкі ўваходзіць у склад музеяў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

ЛІТАРАТУРА

1. **Музей-кватэра З. М. Тусналобавай-Марчанка** // Музеі Полацка = Музеи Полоцка = Polotsk museums : [фотаальбом] / аўт. тэксту і ўклад. Т. А. Джумантаева ; пер. на англ. мову Н. А. Далжонак ; фота І. У. Супранёнак. – Мінск : Беларусь, 2015. – С. 243–257.

2. **Музей-кватэра З. М. Тусналобавай-Марчанка** // Полацк музейны = Полоцк музейный = Museums of Polotsk : фотаальбом / аўт.-уклад. Т. А. Джумантаева, М. М. Ільніцкі ; фота І. У. Супранёнак. – Мінск : Беларусь, 2006. – С. 220–229.

МУЗЕЙ-КВАТЭРА ГЕРОЯ САВЕЦКАГА САЮЗА ЗІНАІДЫ МІХАЙЛАЎНЫ ТУСНАЛОБАВАЙ-МАРЧАНКІ

30 год з дня заснавання (1987)

Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза Зінаіды Міхайлаўны Тусналобавай-Марчанкі знаходзіцца недалёка ад Музея баявой славы ў Полацку на вуліцы 23-х гвардзейцаў у доме № 1. У ім Зінаіда Міхайлаўна, ганаровая грамадзянка Полацка і мужная медыцынская сястра, правяла апошнія гады свайго жыцця. Упершыню музей быў адкрыты ў ліпені 1987 г. На сённяшні дзень экспануюцца 132 музейныя прадметы. Экспазіцыйная плошча складае 18 кв. м.

Экспазіцыйныя комплексы распавядаюць пра дзяцінства і юнацтва З. М. Тусналобавай-Марчанкі, яе ўдзел у баях Вялікай Айчыннай вайны, лячэнні ў шпіталі № 3861, даюць уяўленне аб сямейным жыцці і грамадскай дзейнасці гераіні. Экспанаты музея ўключаюць дакументы, фатаграфіі, асабістыя рэчы і ўзнагароды З. М. Тусналобавай-Марчанкі. Найбольшую цікавасць уяўляе плацінавы медаль Флорэнс Найцінгейл, які прысуджаецца Міжнародным Чырвоным Крыжом. З. М. Тусналобава-

60 гадоў таму (1957) заснаваны Шаркаўшчынскі кансервава-агароднінасушыльны завод ў г. п. Шаркаўшчына. З 2004 года – прыватнае кааператыўна-вытворчае УП.

60 гадоў таму (1957) заснавана сельскагаспадарчае прадпрыемства «Надеждино» ў г. п. Коханава Талачынскага раёна як саўгас «Рассвет». З 2002 года – унітарнае сельскагаспадарчае прадпрыемства камунальнай уласнасці з сучаснай назвай.

60 гадоў таму (1957) заснавана прадпрыемства па выпуску шкловалакна «Полоцк-Стекловолокно» ў г. Полацку як завод «Стекловолокно». У 1987 годзе ўступіў у строй цэх шклопластыкавых вудзільнаў. З 1986 года – вытворчае аб’яднанне; з 2001 года – РУП «Полацкае ВА «Шкловалакно»; з 2003 года – ААТ з сучаснай назвай.

60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Бутранец Віктар Канстанцінавіч, намеснік старшыні Арганізацыйнай структуры г. Мінска і Мінскай вобласці ДТСААФ, ураджэнец в. Жэжліна Лепельскага раёна.

55 гадоў таму (1962) у Дуброўне пабудаваны раённы Дом культуры.

55 гадоў таму (1962) адкрыты Мёрскі раённы Дом культуры.

55 гадоў таму (1962) у Наваполацку адкрыта гарадская бальніца.

55 гадоў таму (1962) створана прадпрыемства «Витебскэнерго» на базе электрасеткі Віцебскай вобласці як раённае ўпраўленне «Витебскэнерго» Галоўнага ўпраўлення энергетыкі і электрыфікацыі пры СМ БССР.

55 гадоў таму (1962) у Мінску выдадзены першы гісторыка-эканамічны нарыс «Орша».

55 гадоў таму (1962) заснавана Віцебская птушкафабрыка ў в. Хайсы.

55 гадоў таму (1962) у Віцебску адкрыты СШ № 11 і СШ № 16.

55 гадоў таму (1962) створаны першы жыллёва-будаўнічы кааператыў у Віцебску.

55 гадоў таму (1962) Віцебскае абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі перайменавана ва ўпраўленне вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Зараз – камітэт сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

55 гадоў таму (1962) знойдзены Добрынскі манетна-рэчавы скарб каля в. Добрына Лёзненскага раёна.

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся генерал-маёр Бобрыкаў Сяргей Валянцінавіч у г. Лепелі.

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Герасімчык Уладзімір Аляксандравіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук. Ураджэнец г. Віцебска.

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Каласкоў Уладзімір Пятровіч, ураджэнец Расіі. У 1993–1999 гг. працаваў кіраўніком гуртка саломапляцення і лозапляцення ў Шумілінскім Доме рамёстваў.

55 гадоў таму (1962) нарадзілася Трэгубенкава Любоў Леанідаўна, ураджэнка в. Жэжліна Лепельскага раёна, майстар па ткацтве ў Цэнтры народных рамёстваў «Дзвіна» (Віцебск).

55 гадоў таму (1962) адчынена Наваполацкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага.

55 гадоў таму (1962) уведзена ў дзеянне Наваполацкая ТЭЦ.

55 гадоў таму (1962) нарадзілася Цінохава Рыта Міхайлаўна, мастачка, ураджэнка в. Сокарава Бешанковіцкага раёна.

55 гадоў таму (1962) нарадзілася Сідарчук Ірына Паўлаўна,дырэктар цэнтра даследаванняў, ураджэнка г. Віцебска.

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Шамро Алег Эдуардавіч, майстар вырабаў з бяросты, ураджэнец г. Крычава Магілёўскай вобласці. Жыве ў в. Юрцава Аршанскага раёна.

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Яўсціхаў Ігар Віктаравіч, народны майстар Беларусі, ураджэнец г. Віцебска. Працуе ў Віцебскім раённым Доме культуры кіраўніком узорнай студыі мастацкай апрацоўкі скуры «Эксклюзіў».

невядомага. Менавіта ў такім бесперапынным руху В. А. Шылко знайшоў свой непаўторны шлях развіцця, які доўжыцца ўжо не адзін год.

ЛІТАРАТУРА

1. **Ивченко, Л.** Вглядеться в состояние души / Л. Ивченко // Віцебскі рабочы. – 2011. – 9 апр. – С. 8.

2. **«Квадрат»** // Энциклопедия русского авангарда / Т. В. Котович. – Минск : Экономпресс, 2003. – С. 136.

3. **Павлова, Е.** Верю – лучшее впереди / Е. Павлова // Витебский курьер. – 2003. – 17 янв. – С. 4.

4. **Пастернак, Т.** «Ощущение сопричастности» Виктора Шилко / Т. Пастернак // Народнае слова. – 2003. – 9 снеж. – С. 2.

5. **Пастернак, Т.** Птицы, пьющие из Луны / Т. Пастернак // Витебские вести. – 2014. – 16 дек. – С. 7.

6. **Соловьёва, Т.** «Ландшафты» Шилко / Т. Соловьёва // Витебский проспект. – 2012. – 2 февр. – С. 23.

7. **Цыбульскі, М. Л.** Шылко Віктар Аляксандравіч / М. Л. Цыбульскі // Памяць : Гарадоцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Н. А. Бурунова [і інш.] ; уклад. С. І. Садоўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 721.

8. **Шаранговіч, Н.** Дыялог з пачуццёвай рэальнасцю / Н. Шаранговіч // Мастацтва. – 2006. – № 9. – С. 42–47.

9. **Шилко, В.** Виктор Шилко: «Когда краски тебя слушаются…» / В. Шилко ; беседовала Т. Пастернак // Народнае слова. – 2004. – 20 лістап. – С. 5.

10. **Шилко, В.** «Я не авангардист. Я просто живописец» / В. Шилко ; беседовала Л. Никольская // Гарадоцкі веснік. – 2001. – 14 крас. – С. 1–2.

11. **Яковлева, С**. «Ретро», или Мир Виктора Шилко / С. Яковлева // Гарадоцкі веснік. – 2015. – 20 чэрв. – С. 8.

Віцебскі мастак Віктар Шылко больш вядомы гледачу як жывапісец з уласнай энергетыкай і індывідуальнай выяўленчай манерай. З 2002 г. ён займаецца канцэптуальным жывапісам. У сваёй творчасці працягвае традыцыі рускага авангарда 10–20-х гадоў XX стагоддзя. Як мастак, найбольш блізкі яму па духу Васіль Кандзінскі. Кампазіцыі В. Шылко вынайдзены праз сузіральны досвед, у дакладна прапрацаванай структуры жывапісных твораў спалучаны ў адзінае цэлае мноства адчуванняў – зрокавых, слыхавых, асязальных і тых, што не маюць дакладных слоўных абазначэнняў. У спалучэнні з неабмежаванай колеравай палітрай, пластыкай плям гэта нараджае выразны і эфектны твор. Не меншую цікавасць уяўляе графіка мастака, прычым на паперы ён таксама застаецца арыгінальным і смелым каларыстам, майстрам колеравых кантрастаў.

Работы В. А. Шылко знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Музея сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Музея сучаснага еўрапейскага мастацтва (Сеул, Паўднёвая Карэя), Музея сучаснага мастацтва (Зелена Гура, Польшча), музеяў г. Віцебска. Творы мастака ёсць таксама ў прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Латвіі, Аўстрыі, Германіі, Галандыі, ЗША, Іспаніі, Польшчы, Канады, Фінляндыі. Але для Віктара Аляксандравіча не менш важным і цэнным з'яўляецца тое, што звыш 20 карцін падараваны ім вясковай бальніцы ў Халамерах Гарадоцкага раёна, што землякі цёпла прымалі яго персанальную выставу ў Гарадоцкім краязнаўчым музеі. Ён добра памятае сваю першую карціну – пейзаж Гарадка. У 1994 г. В. Шылко стаў лаўрэатам I Міжнароднага Шагалаўскага пленэру ў Віцебску.

Яркая асоба ў віцебскім мастакоўскім коле, Віктар Шылко вылучаецца рэдкім талентам паглыбляцца ў сам працэс творчасці. Ён умее аналізаваць зробленае, абагульняць вынікі. Мастак спрабуе знайсці ў жыцці і мастацтве галоўнае, а не другаснае. Гэтая рыса характару надзвычай жыватворная. Яна змяшчае ў сабе рух наперад, вяртанне да прачытанага і інтэрпрэтацыі яго, спалучэнне варыянтаў, імкненне да

55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Мацюшонак Валерый Зігмундавіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец в. Мнюты Глыбоцкага раёна. Працуе загадчыкам філіяла Глыбоцкага Дома рамёстваў у г. п. Падсвілле.

55 гадоў таму (1962) створаны Вымнянскі народны хор у в. Вымна Віцебскага раёна пры Доме культуры. У 1975 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

55 гадоў таму (1962) створана Віцебская народная дзіцячая выяўленчая студыя пры абласным Палацы піянераў. У 1983 годзе было прысвоена званне «Народная аматарская студыя».

55 гадоў таму (1962) запраектаваны і пабудаваны Віцебскі ўсходні прамысловы вузел, комплекс з 6 прадпрыемстваў прыборабудаўнічага і машынабудаўнічага профілю, аб'яднаных агульнымі інжынернымі, складскімі і рамонтнымі службамі.

55 гадоў таму (1962) створаны Віцебскі заслужаны аматарскі харэаграфічны ансамбль «Зорка» пры Доме культуры Упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва. З 2007 года дзейнічае пры Цэнтры культуры «Віцебск». У 1984 годзе было прысвоена званне «ўзорны», а ў 2006 годзе – «Заслужаны аматарскі калектыў».

55 гадоў таму (1962) нарадзілася Цімохава Рыма Міхайлаўна, беларуская мастачка і кніжны ілюстратар, ураджэнка в. Сокарава Бешанковіцкага раёна.

50 гадоў таму (1967) у Мёрах адкрыта музычная школа.

50 гадоў таму (1967) у Віцебску адкрыта мастацкая школа № 1.

50 гадоў таму (1967) у Наваполацку адкрыты музей працоўнай славы. Зараз – Наваполацкі музей гісторыі і культуры.

50 гадоў таму (1967) у Наваполацку створана пажарная аварыйна-выратавальная служба ААТ «Палімір».

50 гадоў таму (1967) у Наваполацку адкрыты ДК нафтавікоў.

50 гадоў таму (1967) у Браславе праведзена першае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы». З 2007 года – абласное. З 2009 года –міжнароднае.

50 гадоў таму (1967) Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна стала размяшчацца ў спецыяльна пабудаваным будынку.

50 гадоў таму (1967) Шаркаўшчынская раённая газета «Сялянская праўда» перайменавана ў «Кліч Радзімы».

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Жураўлёва Галіна Мікалаеўна, народны майстар. Працуе ў Лепельскім ліцэі кіраўніком гуртка выцінанкі, ураджэнка г. Лепеля Віцебскай вобласці.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Лабунова Таццяна Анатольеўна, адна з вядучых майстроў выцінанкі вобласці, ураджэнка г. Оршы.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Фёдарава Жанна Паўлаўна, член народнага клуба майстроў «Традыцыя», ураджэнка г. Магілёва, пражывае ў в. Ноўка Віцебскага раёна.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Шынкарова Таццяна Васільеўна, ганчар і кіраўнік клуба народных майстроў «Аршыца», член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, ураджэнка г. Оршы.

50 гадоў таму (1967) нарадзіўся Квашко Уладзімір Іванавіч, народны майстар, ураджэнец г. Ромны Сумскай вобласці (Украіна), пражывае ў г. Сянно Віцебскай вобласці.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Шаўцова Ірына Анатольеўна, майстар па лозапляценні, ураджэнка аг. Дабрамыслі Лёзненскага раёна. Працуе майстрам-метадыстам ў Дабрамысленскім Доме рамёстваў.

50 гадоў таму (1967) нарадзіўся Лелюх Ігар Віктаравіч (1967–1995), Герой Расіі, ураджэнец г. Віцебска.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Рыжанкова Алена Мікалаеўна, ганчар мастацкай керамікі Новалукомльскага завода керамзітнага гравію, ураджэнка г. Магілёва.

«Вясна» (1976), «Антонаўскія яблыкі» (1979), «Каляды» (1981), «Гандляр кветкамі» (1983), «Мір на зямлі» (1985). З сярэдзіны 1980-х гадоў кампазіцыі набываюць фармальна-жывапісны характар: «Падзенне», «Малевічу прысвячаецца», «Стыхія» (усе 1988), «Апошні трамвай», «Белая карціна» (абедзьве 1989), «Космас» (1990), «Утро» (1993), «Яблык Евы» (2000), «Два», «Рытмы вечара», «Ноч уваходзіць у горад» (усе 2002).

Віктар Шылко – вядомы прадстаўнік сярэдняга пакалення беларускіх мастакоў. З 1976 г. – пастаянны ўдзельнік абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаў выяўленчага мастацтва. У 1986 г. стаў членам Саюза мастакоў СССР. У сакавіку 1987 г. было створана творчае аб’яднанне мастакоў Віцебска «Квадрат», у якое ўвайшлі дзесяць прадстаўнікоў розных накірункаў і відаў мастацтва. В. Шылко актыўна ўключыўся ў дзейнасць «Квадрата», у задачу якога ўваходзіла арганізаваная апазіцыя афіцыйнаму мастацтву і зацвярджэнне эстэтычных прынцыпаў рускага авангарда і постмадэрнізму ў мастацкім жыцці Беларусі. Мастакі «Квадрата» прадстаўлялі віцебскую школу ў Маскве, Берліне, Варшаве, Іспаніі, удзельнічалі ў міжнародных выставах у Італіі, Фінляндыі, Южнай Карэі, Канадзе, ЗША, Ізраілі, Аўстраліі.У творчую суполку «Аршыца» Віктар Шылко ўвайшоў, калі пасля дзесяці гадоў існавання спыніла дзейнасць аб’яднанне «Квадрат». У 1999–2001 гг. удзельнічаў у выставах «Аршыцы» ў Мінску, Санкт-Пецярбургу, Маскве. У 2001–2003 гг. В. Шылко з’яўляўся старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў Беларусі. Плённым быў для мастака 2008 год, калі ён прымаў удзел у І Рэспубліканскай біенале жывапісу, графікі, скульптуры (Мінск), выставе віцебскіх мастакоў у Франкфурце-на-Одэры (Германія), Міжнародным пленэры імя Марка Роткі у латвійскім горадзе Даўгаўпілсе. У 2011 г. яго творы экспанаваліся на выставе «Мастакі Віцебска» ў Смаленску (Расія). У апошнія гады мастаком створаны серыя графічных работ «Адчуванне далучанасці» і серыя жывапісных работ «Ландшафты». Творы вылучаюцца асацыятыўнай вобразнасцю, дынамікай кампазіцыйных рытмаў, эмацыянальнай выразнасцю колераў.

Ліпень



ШЫЛКО

ВІКТАР АЛЯКСАНДРАВІЧ

65 год з дня нараджэння (1952)

Жывапісец, графік, член Саюза мастакоў Беларусі, удзельнік абласных, рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, ураджэнец Віцебскай вобласці. Жыве і працуе ў Віцебску.

Віктар Аляксандравіч Шылко нарадзіўся 14 ліпеня 1952 г. ў в. Зарэчча Гарадоцкага раёна. Захапленне маляваннем прыйшло да хлопчыка, калі ён вучыўся ў Даўгапольскай сярэдняй школе. Гэтаму паспрыяў настаўнік матэматыкі і малявання Віталь Афанасьевіч Праснякоў. У 1969 г. В. Шылко паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Вопытны педагог Дзмітрый Паўлавіч Генеральніцкі адразу разгледзеў у маладым студэнце жывапісца. Але галоўным сваім настаўнікам Шылко лічыць вядомага маскоўскага графіка і жывапісца Міхаіла Захаравіча Рудакова, з якім пазнаёміўся на пленэры ў Гурзуфе. Наватар, мысліцель, ён змяніў уяўленні маладога мастака пра сутнасць мастацтва і ролю творцы ў ім, стаў для яго сапраўдным духоўным настаўнікам і сябрам.

Раннім творам Шылко ўласціва рэалістычная трактоўка вобразаў:

50 гадоў таму (1967) нарадзіўся Макаранкаў Андрэй Фёдаравіч, майстар па кераміцы клуба народных майстроў «Аршыца», ураджэнец в. Хадораўка Горацкага раёна Магілёўскай вобласці.

50 гадоў таму (1967) нарадзіўся Караблін Валерый Вячаслававіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Чашнікі.

50 гадоў таму (1967) заснавана прадпрыемства «Віцебскліфт» як гасразліковы ўчастак рамонтна-будаўнічага ўпраўлення «Рамліфтналадка». У 1973 годзе перайменаваны ў Віцебскі гасразліковы прарабскі ўчастак «Белрамбуд». У 2001 годзе пераўтворана ў вытворчае рэспубліканскае рамонтна-мантажнае даччынае УП з сучаснай назвай. З 2008 года – ААТ.

50 гадоў таму (1967) створаны Віцебскі народны харэаграфічны ансамбль «Віцябчанка» пры тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці. У 1977 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

50 гадоў таму (1967) заснаваны Браслаўскі торфабрыкетны завод у в. Ахрэмаўцы Браслаўскага раёна. З 2009 г. – ААТ «Браслаўскі торфабрыкетны завод».

50 гадоў таму (1967) заснаваны Наваполацкі парк культуры і адпачынку ў г. Наваполацку Полацкага раёна як гарпарк культуры і адпачынку імя 50-годдзя СССР. З 1996 года – сучасная назва.

50 гадоў таму (1967) была адкрыта база адпачынку «Суя» ААТ «Полацк-Шкловалакно» ў Полацкім раёне.

50 гадоў таму (1967) выяўлена радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу Загуддзе ў 3,5 км на захад ад чыгуначнай станцыі Бычыха Гарадоцкага раёна. Дэталёва разведана ў 1974 годзе.

50 гадоў таму (1967) нарадзілася Шаранговіч Наталля Васільеўна, журналіст, мастацтвазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

45 гадоў таму (1972) нарадзілася Скавырка Святлана Анатольеўна, навуковы супрацоўнік Глыбоцкага Дома рамёстваў, ураджэнка в. Вішанка Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Жыве ў г. Глыбокае.

45 гадоў таму (1972) у Віцебску адкрыты рэстаран «Аврора». Зараз – «Северная столица».

45 гадоў таму (1972) у Віцебску адкрыты кінатэатр «Беларусь».

45 гадоў таму (1972) заснавана вытворчае аб'яднанне хлебапякарнай прамысловасці «Витебскхлебпром» у г. Віцебску. З 2001 года – РУВП.

45 гадоў таму (1972) на Аршанскім станкабудаўнічым заводзе «Чырвоны барацьбіт» зроблены першы станок з лічбавым праграмным кіраваннем.

45 гадоў таму (1972) адкрыта Гарадоцкае ПТВ-174. З 2001 года – Гарадоцкі прафесійны ліцэй.

45 гадоў таму (1972) адкрылася Віцебская гарадская бібліятэка імя М. Багдановіча.

45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Чырык Дзмітрый Пятровіч, вучоны ў галіне ільнаводства, кандыдат сальскагаспадарчых навук. Ураджэнец г. Оршы.

45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Макарэвіч Алег Уладзіміравіч, займаецца лозапляценнем, ураджэнец г. Оршы.

45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Варчэня Валерый Анатольевіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Чашнікі.

45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Касцючкоў Аляксей Мікалаевіч, выкладчык кафедры філасофіі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

45 гадоў таму (1972) заснаваны Іванскі Дом культуры. З 2005 года – Іванскі Дом фальклору.

твораў Дуніна-Марцінкевіча» (1923), «Да гісторыі канфіскацыі «Нашай нівы» (1925), «Мужыцкая праўда К. Каліноўскага» (1926). Даследаваў старажытныя вераванні, матэрыяльную культуру беларусаў. Аўтар нарысаў-партрэтаў Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, З. Бядулі, У. Дабравольскага.

Асноўныя яго працы: бібліяграфічны даведнік «Матэрыялы да беларускае бібліяграфіі» і «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны». Першапачатковая аўтарская назва збору – «Крывічы». Збор змяшчае каляндарную і сямейна-абрадавую творчасць Віцебшчыны як этнаграфічнага рэгіёна.

ЛІТАРАТУРА

1. **Шлюбский** Александр Онуфриевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2008. – Т. 7 : Снегирь–Ящерицын. – С. 607–608.

2. **Шлюбскі** Аляксандр Ануфрыевіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1974. – Т. 11 : Футбол – ЯЯ. – С. 339–340.

3. **Шлюбскі** Аляксандр Ануфрыевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. –Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 17 : Хвінявічы–Шчытні. – С. 439.

4. **Этнограф**, фалькларыст, бібліёграф // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Расонскага раёна / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 84–85.

5. **Шлюбскі** Аляксандр Ануфрыевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. – Т. 5 : Скамарохі–Яшчур. – С. 578–579.

В. І. Русілка [і інш.]. – Віцебск : Віцеб. дзярж. ун–т, 2008. – С. 106–112.

2. **Беляжэнка (Беліжэнка) Барыс** // Беларускія пісьменнікі : біябіліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1992. – Т. 1 : Абуховіч–Ватацы. – С. 274–275.

3. **Барыс Беляжэнка** // Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі ; нав. рэд. А. Л. Верабей. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 54.

4. **Беляжэнка Барыс** // Пісьменнікі Віцебшчыны : даведнік / рэд. Ф. Сіўко. – Віцебск, 2001. – С. 21–23.

5. **Шчука, Л.** Літаратурная краіна Беляжэнкі / Л. Шчука // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 26 кастр. – С. 24.

ШЛЮБСКІ
АЛЯКСАНДР АНУФРЫЕВІЧ

Да 120-годдзя з дня нараджэння (1897)

Шлюбскі Аляксандр Ануфрыевіч нарадзіўся ў в. Межава Расонскага раёна Віцебскай вобласці, беларускі этнограф, фалькларыст, бібліёграф. Скончыў Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (1922). У 1918–1923 гг. удзельнічаў у арганізацыі архіваў у Веліжы, Віцебску, Оршы, Полацку. Друкаваўся ў часопісах «Наш край», «Полымя», «Маладняк», газеце «Савецкая Беларусь». Складаў разгорнутую інструкцыю «Звесткі па збіранні вуснай народнай творчасці ў Беларусі» (1919).

Выступаў з артыкуламі пра культурна-асветніцкае жыццё Віцебшчыны, Мінска, пра падзеі грамадзянскай вайны на Беларусі, пра гісторыю беларускай літаратуры, перыядычнага друку: «Канфіскацыя

45 гадоў таму (1972) заснавана сельскагаспадарчае прадпрыемства «Рубежніца» як калгас «Рассвет» у Лёзненскім раёне. У 2002 годзе да яго далучана калгасна–фермерская гаспадарка «Злата». З 2003 года пераўтворана ў СВК «Веляшковічы», які ў 2004 годзе рэарганізаваны шляхам далучэння да СВК «Рубежніца».

45 гадоў таму (1972) створаны Наваполацкі ўзорны хор «Звонкія галасы» ў г. Наваполацку пры СШ № 3 на базе школьнай дзіцячай харавой студыі. У 1983 годзе было прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

45 гадоў таму (1972) створаны Зубаўскі народны хор у в. Зубава Аршанскага раёна пры сельскім Доме культуры. У 1982 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

45 гадоў таму (1972) заснавана дзіцяча-юнацкая спартыўная школа «Атлет» ПОП РВУП «Лёс» ў г. Барань Аршанскага раёна як ДЮСШ пры прафкаме аршанскага завода «Красный Октябрь».

45 гадоў таму (1972) заснавана Віцебская абласная СДЮШАР прафсаюзаў па лёгкай атлетыцы «Буравеснік-73» як ДЮСШ па лёгкай атлетыцы пры Віцебскім абласным савеце спартыўнага таварыства «Буравеснік». З 1985 года – ДЮСШ па лёгкай атлетыцы Віцебскага абласнога спартыўнага таварыства прафсаюзаў «Буравеснік». З 1993 года – Віцебскага абласнога спартыўнага клуба «Спорт». З 1995 года – Віцебскага фізкультурна-спартыўнага клуба прафсаюзаў. З 1998 года – СДЮШАР.

40 гадоў таму (1977) у Глыбокім адкрыта СШ № 3.

40 гадоў таму (1977) у Лёзненскім раёне ўзведзены мемарыяльны комплекс воінам-артылерыстам.

40 гадоў таму (1977) адкрыты мемарыяльны комплекс памяці ў в. Яніна Верхнядзвінскага раёна.

40 гадоў таму (1977) у Віцебскім раёне пастаўлены помнік «Віцебскія вароты».

40 гадоў таму (1977) заснаваны Асвейскі паляўнічы заказнік.

40 гадоў таму (1977) у Браслаўскім раёне створаны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Міжазёрны».

40 гадоў таму (1977) заснавана будаўнічае ўпраўленне № 231 г. Віцебска. Зараз – ААТ «БУ-231, г. Віцебск».

40 гадоў таму (1977) створана Опсаўскае народнае літаратурнае аб’яднанне «Ветразь надзеі» ў в. Опса Браслаўскага раёна пры сельскім Доме культуры. У 2002 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

40 гадоў таму (1977) створаны Ветрынскі народны ансамбль народных інструментаў у г. п. Ветрына Полацкага раёна пры дзіцячай школе мастацтваў. У 2002 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

40 гадоў таму (1977) заснаваны Новалукомльскі завод керамзітавага гравію ў г. Навалукомль Чашніцкага раёна як завод керамзітавага гравію. З 2000 года пераўтвораны ў ААТ «Завод керамзитового гравия г. Новолукомль».

40 гадоў таму (1977) заснавана Чашніцкая цэнтральная раённая бібліятэка ў лістападзе 1977 года пасля стварэння цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, аб'яднаўшай усе бібліятэкі раёна.

40 гадоў таму (1977) заснаваны Браслаўскі льнозавод ў г. Браславе. З 1999 года – ААТ.

40 гадоў таму (1977) быў адкрыты Новалукомльскі Палац культуры энергетыкаў філіяла Лукомльская ДРЭС РУП «Витебскэнерго» ў г. Новалукомль Чашніцкага раёна. У 1988–1990 гг. – Палац культуры і тэхнікі. З 2006 года – структурнае падраздзяленне Лукомскай ДРЭС.

40 гадоў таму (1977) у Верхнядзвінскім раёне адкрыты Мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму, спаленым вёскам, воінам-вызваліцелям і землякам у памяць аб загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Віцебскага абкама КПБ.

З 1980 года – персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння. У 1980–1986 гадах –загадчык аддзела пісьмаў абласной газеты «Віцебскі рабочы». У 1998–2000 гадах – тэхсакратар абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэдактар навуковага часопіса ВДУ.

Член Саюза пісьменнікаў з 1979 года, член Саюза журналістаў з 1975 года. Узнагароджаны медалямі, адзначаны прэміяй МУС Беларусі, прэміяй Уладзіміра Караткевіча.

Друкуецца з 1958 года. Аўтар зборнікаў вершаў «Крыгалом» (1973), «Жытнёвае поле» (1977), паэмы «Свята пумы» (1977), «Каляровыя фотакарткі» («Віцебскі рабочы», 1988), даследаванняў аб жыцці і творчасці вялікага асветніка В. Цяпінскага («Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Віцебскі рабочы» (1989–1990 гг.). Барыс Беляжэнка добра вядомы шырокаму колу чытачоў, дзякуючы кнігам «Крык у ціхай затоцы» (1997), кнігі «Пушкин–древо рода–Белая Русь» (2001), «Званочак і цюльпан» (2004)), «Россыпь изречений и афоризмов» (2006), «Тайна иволги» (2007), «Сны и дороги» (2008), «Успаміны пра майго асла» (2008), «Волшебная мельница» (2008), «Круги земные» (2009), «Дарога Бачэйкава – Бешанковічы» (2014).

Напісаў песні на ўласныя мелодыі і сумесна з прафесійнымі кампазітарамі.

Узнагароджаны медалём «За доблесную працу», медалём «Ветэран працы», знакам «50 год ВЛКСМ», граматай Прэзідыума рэспубліканскага таварыства «Веды», граматай Саюза пісьменнікаў БССР, Ганаровай граматай Віцебскага аблвыканкама (1997, 2007). Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат прэміі імя У. Караткевіча (2008).

Памёр у ліпені 2016 года.

ЛІТАРАТУРА

1. **Русілка, В. Барыс Беляжэнка** / В. Русілка // Літаратурныя постаці Віцебшчыны : гісторыя і сучаснасць : зб. навук. артыкулаў / рэдкал.:



БЕЛЯЖЭНКА

БАРЫС ПАЎЛАВІЧ

Да 80-годдзя з дня нараджэння (1937)

Барыс Паўлавіч Беляжэнка нарадзіўся 5 чэрвеня 1937 года ў вёсцы Бачэйкава Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння Бешанковіцкай СШ № 1 працаваў старшым піянерважатым Навікоўскай сярэдняй школы, інструктарам Бешанковіцкага Дома піянераў і школьнікаў (1955–1957).

Служыў на Балтыйскім ваенна-марскім флоце (1957–1958). Пасля настаўнічаў у Чаўнышкаўскай НСШ, быў дырэктарам Бешанковіцкага раённага Дома піянераў і школьнікаў, супрацоўнікам Бешанковіцкай раённай газеты «Зара», сакратаром партарганізацыі, намеснікам старшыні калгаса «Герой працы», інструктарам Бешанковіцкага райкама партыі, дырэктарам Пуськоўскай васьмігодкі (Чашніцкі раён).

У 1965 годзе скончыў філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Загадваў Чашніцкім РАНА (1965–1967), працаваў намеснікам старшыні Чашніцкага райвыканкама (1967–1968). Скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу (1968–1970). З 1970 года– інструктар, лектар, загадчык сектара друку, тэлебачання і радыё

35 гадоў таму (1982) ва ўрочышчы Ляўкі Аршанскага раёна пастаўлены помнік Я. Купалу.

35 гадоў таму (1982) у Віцебску адкрыта 3-я гарадская клінічная бальніца.

35 гадоў таму (1982) закладзены Верхнядзвінскі дэндрарый.

35 гадоў таму (1982) адкрыўся санаторый «Баравое» ў г. п. Бягомль Докшыцкага раёна.

35 гадоў таму (1982) створаны Віцебскі ўзорны дзіцяча-юнацкі тэатр «Мара» пры абласным Палацы піянераў і школьнікаў як тэатральны гурток. У 1992 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі тэатр» і сучасная назва.

35 гадоў таму (1982) створаны Верхнядзвінскі народны духавы аркестр у г. Верхнядзвінску пры раённым Доме культуры. У 1996 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

35 гадоў таму (1982) створаны народны сатырычны калектыў «Шпілька» ў г. Глыбокае пры раённым Доме культуры як «Агітбрыгада «Веснік». У 1984 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў» і сучасная назва.

35 гадоў таму (1982) заснаваны гарадскі клуб усходніх адзінаборстваў у Наваполацку. З 1993 года – сузаснавальнік Беларускай федэрацыі ўсходніх адзінаборстваў.

35 гадоў таму (1982) створана Відзаўскае народнае аматарскае аб'яднанне «Кругагляд» у г. п. Відзы Браслаўскага раёна пры гарпасялковай бібліятэцы-філіяле № 2 Браслаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. У 2002 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

35 гадоў таму (1982) заснавана сельскагаспадарчае прадпрыемства «Нарцызава» ў Талачынскім раёне як міжгаспадарчае прадпрыемства. У 1985 годзе аб'яднана з калгасам «Гігант». З 1998 года – філіял ЗАТ «Віцебскаграпрадукт» з сучаснай назвай.

30 гадоў таму (1987) адкрыты Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора ў Полацку, які з'яўляецца філіялам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

30 гадоў таму (1987) у Дуброўне ўзведзены новы комплекс будынкаў раённай бальніцы.

30 гадоў таму (1987) заснаваны Матырынскі народны фальклорны ансамбль «Матырынская спадчына» сельскага Дома культуры Ушацкага раёна.

30 гадоў таму (1987) музей баявой славы г. п. Бешанковічы перайменаваны ў Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

30 гадоў таму (1987) заснаваны Полацкі малочны камбінат на базе гарадскіх малаказаводаў, якія дзейнічалі ў 1944–1987 гг., з 1996 – ААТ. У 2003 годзе быў рэарганізаваны шляхам далучэння Мёрскага і Расонскага малочных заводаў.

30 гадоў таму (1987) заснавана Новалукомльская ПМК-58 у г. Новалукомлі Чашніцкага раёна як ПМК-292. З 1988 года – міжкалгасная ПМК-58, з 1997 года – дзяржаўнае прадпрыемства ПМК-58, з 2002 года – будаўнічае РУП с сучаснай назвай.

30 гадоў таму (1987) заснавана прадпрыемства па вытворчасці сродкаў адлюстравання інфармацыі «Дысплей» у г. Віцебску як канструктарскае бюро на базе Віцебскага тэлевізійнага завода. З 2001 года – РУП.

30 гадоў таму (1987) створаны Віцебскі народны эстрадны калектыў «Дзвіна» ў гарадскім пасёлку Руба пры Доме культуры і тэхнікі ВА «Даламіт». У 1998 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1987) створаны Глыбоцкі камерны народны хор у г. Глыбокае пры раённым Доме культуры. У 1991 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

Наука и инновации. – 2012. – № 10. – С. 23–26.

4. **Левко, О.** Археологическое наследие Витебска: проблемы и перспективы его использования / О. Левко // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2009. – С. 25–30.

5. **Левко, О. Н.** Витебск : [монография] / О. Н. Левко. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 335 с. – (Древнейшие города Беларуси).

6. **Левко, О.** Материальное выражение истории / О. Левко // Наука и инновации. – 2009. – № 6. – С. 8–10.

7. **Ляўко** Вольга Мікалаеўна // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. Ю. У. Каласоўскі – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 43.

8. **Ляўко** Вольга Мікалаеўна // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 382–383.

9. **Левко** Ольга Николаевна // Институт истории НАН Беларуси в лицах, 1929–2008 : биобиблиографический справочник. – Минск : Белорусская наука, 2008. – С. 228.

10. **Левко** Ольга Николаевна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2 : К–Я. – С. 32–33.

11. **Левко** Ольга Николаевна // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 4 : Картография–Миноговые. – С. 423.

12. **Марціновіч, А.** Пісьмёны Вольгі Ляўко, альбо Выпадковасць, што стала рэальнасцю / А. Марціновіч // Полымя. – 2007. – № 5. – С. 139–149.

Вывучае помнікі эпохі жалеза і сярэднявечча паўднёва-ўсходняй Беларусі: гарады, феадальныя сядзібы, мястэчкі, гарадзішчы-крэпасці, селішчы (Друцк, Стары Шклоў, Езярышча, Гарадок, Смаляны, Сураж, Дуброўна, Талачын, Кісялі, Стражава, Багрынава, Новы Болецк, Чаркасава), гарадскія і сельскія грунтавыя, курганныя, каменныя могільнікі 10–17 стст. (Віцебск, Орша, Шклоў, Галошава, Гарадок, Друцк, Дроздава, Крапіўна, Новы Болецк, Навінкі, Арэхаўск, Смалькі); культавыя пабудовы Віцебска (Свята-Духаўскі манастыр, Успенскі сабор, Васкрасенская царква, езуіцкі калегіум), Оршы (Куцеінскі Богаўленскі манастыр, езуіцкі калегіум, базыльянскі і дамініканскі кляштарны манастыр, царква Раства Багародзіцы), Шклова (Васкрасенская царква). Распрацавала курсы па ўводзінах у археалогію, гісторыі развіцця археалагічнай навукі, практычнай археалогіі, славянскага этнагенэзу па спецыяльнасці «археалогія».

Удзельнік беларускага-расійскага праекта «Раннія славяне лясного Падняпроўя і Падзвіння». Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларусі» ў 6 т. (т. 1, 2000), «Археалогіі Беларусі» ў 4 т. (т.1, 2001), кнігі «Раннія славяне Беларускага Падняпроўя і Падзвіння», даведніка «Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя НАН Беларусі», кнігі «Беларусь: народ, дзяржава, час», «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2009). Узнагароджана Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі (1999, 2000, 2006), Ганаровай граматай Аршанскага гарвыканкама (2002), медалём «За працоўныя заслугі» (2008).

ЛІТАРАТУРА

1. **Калядзінскі, Л.** Даследчыца віцебскіх нетраў / Л. Калядзінскі // Культура. – 2007. – № 20 (19–25 мая). – С. 14.

2. **Корзенко Г. В.** Левко Ольга Николаевна / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : биобиблиографический справочник / Г. В. Корзенко. – Минск : Белорусская наука, 2007. – С. 217.

3. **Левко, О. Н.** Археологическое наследие Беларуси / О. Н. Левко //

30 гадоў таму (1987) адкрыты дзіцячы санаторый «Расінка» ў Мёрскім раёне.

30 гадоў таму (1987) створаны Віцебскі народны клуб кветкаводаў-аматараў Цэнтра культуры «Віцебск». У 1990 года прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

30 гадоў таму (1987) у Віцебску пачаў праводзіцца Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі. Першапачаткова праходзіў як Усесаюзны фестываль сучаснай харэаграфіі. З 1992 года набыў статус міжнароднага.

30 гадоў таму (1987) пачаў праводзіцца міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». Спачатку праходзіў у г. Віцебску, затым у г. Магілёве (з 1990)як рэспубліканскі фестываль «Іграй, гармонік». З 1992 года праходзіць у г. Паставы, з 1996 года набыў статус міжнароднага.

30 гадоў таму (1987) адкрыты спартыўна-аздараўленчы комплекс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі «Браслаўскія азёры» ў 2 км ад г. Браслава. У 2007 гаду праведзена рэканструкцыя.

25 гадоў таму (1992) пры рэдакцыі Шаркаўшчынскай раённай газеты «Кліч Радзімы» створана літаратурнае аб'яднанне «Світанак». З 1992 года дзейнічае пры раённым Доме культуры. У 2002 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1992) створана Наваполацкае вытворчае аб'яднанне «Нафтан» на базе Полацкага нафтаперапрацоўчага завода.

25 гадоў таму (1992) створана Наваполацкае прадпрыемства па транспарціроўцы нафты «Дружба». З 1999 года – Наваполацкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства па транспарціроўцы нафты «Дружба».

25 гадоў таму (1992) створана Віцебскае грамадскае аб'яднанне «Саюз афіцэраў».

25 гадоў таму (1992) у Віцебску зроблены роспіс сцяны на вуліцах Леніна і Праўды членамі творчага аб'яднання «Квадрат» па эскізе К. Малевіча.

25 гадоў таму (1992) створана ААТ «Веста» на базе Другога гархарчгандлю г. Віцебска.

25 гадоў таму (1992) Тарасавым С. В. выяўлены археалагічны помнік – курганны могільнік «Дзмітраўшчына» каля в. Дзмітраўшчына Полацкага раёна.

25 гадоў таму (1992) пачала праводзіцца Арт-сесія, штогадовая міжнародная конкурс-выстава візуальных мастацтваў студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў.

25 гадоў таму (1992) заснаваны «Полоцкий летописец», гістарычна-літаратурны часопіс, прысвечаны гісторыі Полацка і Полацкай зямлі.

25 гадоў таму (1992) заснавана навукова-вытворчае камерцыйнае прадпрыемства «Солгерс» у Віцебску. Зараз – навукова-вытворчы цэнтр «Спецсістэма», прадпрыемства па выпуску вымяральных прыбораў для ўліку ўсіх відаў энергарэсурсаў (газа, пара, вады, электраэнергіі і інш.).

25 гадоў таму (1992) заснаваны Лёзненскі ваенна-гістарычны музей у г. п. Лёзна, адкрыты для наведвальнікаў у 2003 годзе.

25 гадоў таму (1992) адкрыты Лепельскі Дом рамёстваў у г. Лепелі на базе народнага клуба майстроў «Скарбонка».

25 гадоў таму (1992) створана Дабрамысленскае народнае аматарскае аб’яднанне аўтарскай песні і паэзіі «Гармонія» ў в. Дабрамыслі Лёзненскага раёна пры сельскім Доме культуры. У 2006 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1992) адкрыты Гарадоцкі раённы Дом рамёстваў і фальклору.

25 гадоў таму (1992) заснаваны Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. У 1995 годзе адкрыты для наведвальнікаў.

научных сотрудников и аспирантов, 16–17 марта 2011 г. : в 2 т. / редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ, 2012. – Т. 1. – С. 264–267.

ЛЯЎКО

ВОЛЬГА МІКАЛАЕЎНА

70 год з дня нараджэння (1947)

Ляўко Вольга Мікалаеўна нарадзілася 21 мая 1947 года ў в. Астравок Капыльскага раёна Мінскай вобласці, беларускі археолаг, гісторык. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна (1972). Доктар гістарычных навук (2000). З 1970 года працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, з 2006 года – загадчык цэнтра і аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны. Намеснік старшыні экспертнага савета Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Даследуе сярэдневяковую гісторыю і археалогію, этна-і культурагенез славян, фарміраванне і развіццё раннедзяржаўных стуктур, тэрытарыяльна-адміністрацыйных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі 9–18 стст. Заснавальнік новага навуковага напрамку ў археалогіі Беларусі –вывучэння культурнага пласта помнікаў 14–18 стст. Аўтар канцэпцыі і кіраўнік стварэння археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі ІГ НАН Беларусі (2007). Даследавала гарады Віцебск, Орша, Друцк. Адкрыла месцазнаходжанне старажытнага Шклова 16–18 стст. на тэрыторыі вёскі Рыжкавічы.

У 2009 годзе Сяргей Панізнік разам з Глебам Лабадзенкам выпусціў дыск «Галасы Уладзімера Караткевіча, Ларысы Геніюш, Рыгора Барадуліна. 1968». Запісы галасоў паэт Сяргей Панізнік выканаў у 1968 годзе на бабінным магнітафоне.

У 2016 годзе выйшаў дыск «Вясельныя песні і найгрышы вёскі Лявонпаль і яе наваколляў». Іх запіс зроблены на Мёршчыне Сяргеем Панізнікам у 1968–1969 гадах.

Песні на словы Сяргея Панізніка ўвайшлі ў зборнік «Дабравест» (2006). На вершы аўтара напісалі песні кампазітары В. Бурдзінскі, В. Войцік, Г. Казлова, М. Пятрэнка, А. Чыркун.

За заслугі перад беларускай культурай узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, а перад латышскай – ордэнам «Трох зорак» (1998).

Жыве ў Мінску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Берлеж, М.** Веку, Радзіме, Праўдзе / М. Берлеж // Літаратура і мастацтва . – 2012. – 11 мая. – С. 7.

2. **Лясовіч, С.** «...Ляжыць мацярык на падкове Дзвіны» / С.Лясовіч // Роднае слова. – 2012. – № 3. – С. 30–33.

3. **Матэленак, Л.** Куе паэт... «падкову» / Л. Матэленак // Міёрскія навіны. – 2007. – 8 мая. – С. 3.

4. **Панізнік** Сяргей // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. – Мінск, 1994. – Т. 4. – С. 449.

5. **Панізнік** Сяргей Сцяпанавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск БелЭн, 1996. – Т. 12. – С. 46.

6. **Пучынскі, У.** Сплочаныя даўгі / У. Пучынскі // Краязнаўчая газета. – 2012. – № 17 (май). – С. 5.

7. **Саматой, І. В.** Творчы партрэт Сяргея Панізніка / І. В. Саматой // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XVI (63) Региональной научно-практической конференции преподавателей,

25 гадоў таму (1992) заснаваны Наваполацкі Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры як Цэнтр нацыянальнай культуры. З 1998 года – Цэнтр рамёстваў і нацыянальнай культуры. З 2005 года – сучасная назва.

25 гадоў таму (1992) адкрыўся Віцебскі музей прыватных калекцый (філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея) на аснове збору мясцовага калекцыянера, якое было перададзена абласному краязнаўчаму музею.

25 гадоў таму (1992) створаны Віцебскі народны камерны аркестр пры музычным вучылішчы імя І. І. Салярцінскага (з 2010 года – музычны каледж) на базе сімфанічнага аркестра. У 1997 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

25 гадоў таму (1992) заснавана Віцебскае вытворчае аб’яднанне «Энергакамплект» у г. п. Бешанковічы як малое прадпрыемства «Энергакамплект». З 1997 года – ТАА з сучаснай назвай.

25 гадоў таму (1992) быў адкрыты Германавіцкі музей культуры і побыту ў Шаркаўшчынскім раёне.

20 гадоў таму (1997) створаны Верхнядзвінскі ўзорны харэаграфічны калектыў «Лялькі» пры раённым Доме культуры. У 2001 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) у Віцебску створана студыя «Радыё-Віцебск».

20 гадоў таму (1997) выйшаў у свет зборнік матэрыялаў канферэнцыі «Малевич. Классический авангард. Витебск».

20 гадоў таму (1997) упраўленне сельскай гаспадаркі выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных перайменавана ў камітэт сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

20 гадоў таму (1997) створаны Аршанскі ўзорны тэатр авангарднай моды «Gold Star» пры Цэнтры дзіцячай творчасці як гурток пашыву і афармлення адзення «Стыль».

20 гадоў таму (1997) заснавана прадпрыемства «Рикор» па вытворчасці безалкагольных напояў у г. Віцебску як ЗАТ.

20 гадоў таму (1997) заснавана Віцебскае электратэхнічнае прадпрыемства «Свет», як прыватнае вытворча-гандлёвае УП.

20 гадоў таму (1997) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Красный Бор» у Расонскім і Верхнядзвінскім раёнах для аховы ўнікальных прыродных ландшафтаў-формаў ледавіковага рэльефу, азёрных экасістэм і балот, жывёл і раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі.

20 гадоў таму (1997) створаны Аршанскі народны клуб ветэранаў «Яшчэ не вечар» у г. Оршы пры гарадской бібліятэцы імя У. Корбана. У 2004 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) створана Галубіцкая народная літаратурна-музычная гасцёўня «Спадчына» ў в. Галубічы Глыбоцкага раёна пры бібліятэцы сельскага Дома культуры. У 2008 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) адкрыты Верхнядзвінскі раённы Дом рамёстваў.

20 гадоў таму (1997) створаны ансамбль танца «Ви-За-Ви» Дома культуры чыгуначнікаў Аршанскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў ТРУП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі». У 2000 годзе было прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) створаны Віцебскі ўзорны духавы аркестр пры дзіцячай школе мастацтваў № 2. У 2005 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) у Віцебску заснавана прадпрыемства па вытворчасці дзіцячага адзення «Белль Бимбо» як ТАА.

20 гадоў таму (1997) у Віцебску пачаў выдавацца штоквартальны навукова-практычны часопіс «Вестник фармации» на рускай мове.

Член СП СССР з 1967 года, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, сябра «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны».

Першы верш С. Панізніка «Фестывальнае свята» быў надрукаваны ў 1959 годзе ў Мёрскай раённай газеце «Зара камунізму». Першая публікацыя ў рэспубліканскім друку (верш «Нічагуткі») з'явілася ў 1960 годзе ў ліпеньскім нумары часопіса «Вожык». З таго часу ў беларускіх і ўкраінскіх перыядычных выданнях, калектыўных зборніках пачалі друкавацца яго вершы, артыкулы, рэцэнзіі. Аўтар зборнікаў паэзіі «Кастры Купалля» (1967), «Палявая пошта» (1972), «Крона надзеі» (1975), «Чало і век» (1979), «Слова на дабрыдзень» (1982), «Мацярык» (1985), «Жыцень» (1986), «Стырно» (1989), «А пісар земскі…» (1994), «Золкая зёлка» (1999), «Літары ў расе» (2011), «Нас – многа!» (2012).

Карыстаючыся паказаннямі сведкаў і архіўнымі дакументамі, Сяргей Панізнік расказаў пра жорсткія расправы гітлераўцаў над мірнымі жыхарамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў кнігах дакументальнай прозы: «После огненных деревень» (1980), «Браніслава» (1985), «Освейская трагедия» (1992).

У выдавецтве «Юнацтва» Сяргей Панізнік падрыхтаваў да друку дзесяць зборнікаў гістарычнай літаратуры «Бацькаўшчына» (1990–2002).

Творы С. Панізніка перакладаліся на латышскую, рускую, украінскую мовы. Паэт таксама перакладае на беларускую мову творы латышскіх, літоўскіх, украінскіх, чэшскіх аўтараў. Пераклады вершаў паэтаў народаў свету на беларускую мову і пераклады вершаў С. Панізніка ўвайшлі ў зборнік «Сустрэча роднасных сусветаў» (1997). Ён з'яўляецца складальнікам двухтомнай анталогіі «Латышская савецкая паэзія», зборніка беларускіх пісьменнікаў Латвіі «Крывіцкія руны», зборніка вершаў беларускіх паэтаў для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту «Воляй азорыцца свет», зборніка выбранай лірыкі М. Багдановіча на рускай мове «Узор василька».

Зборнік вершаў С. Панізніка на беларускай мове і ў перакладах на англійскую і французскую мовы «На ўсе вякі...» пабачыў свет у 2011 годзе.

Май

ПАНІЗНІК

СЯРГЕЙ СЦЯПАНАВІЧ

75 год з дня нараджэння (1942)

Панізнік Сяргей Сцяпанавіч нарадзіўся 5 мая 1942 года ў в. Бабышкі Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі паэт, празаік, публіцыст. Ганаровы грамадзянін г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна. Вучыўся Сяргей Панізнік у Лаўташчынскай пачатковай школе, потым у Лявонпальскай сярэдняй школе (1949–1959). У 1962 годзе скончыў фельчарскае аддзяленне Магілёўскага медыцынскага вучылішча. Працаваў фельчарам Княжыцкай участковай бальніцы каля Магілёва. З 1962 да 1963 года служыў фельчарам дывізіёна ў вайсковай часці Беларускай ваеннай акругі. У 1963–1967 – студэнт факультэта журналістыкі Львоўскага ваенна-палітычнага вучылішча СА і ВМФ. З 1967 да 1976 года – ваенны журналіст. У складзе Цэнтральнай групы войск служыў у Чэхаславакіі (1969–1973), потым у Беларусі. З 1977 года – стыль-рэдактар газеты «Вячэрні Мінск», з 1980 года – рэдактар Дзяржтэлерадыё БССР, потым вядучы рэдактар рэдакцыі літаратуры для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту выдавецтва «Юнацтва». З 1992 года працуе ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, даследуе беларуска-лытышскія і беларуска-чэшскія культурныя сувязі.

20 гадоў таму (1997) створаны Віцебскі ўзорны ансамбль танца «Гарэза» пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2008 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

20 гадоў таму (1997) заснавана прадпрыемства па вытворчасці будаўнічай тэхнікі «Святовит» у г. п. Коханава Талачынскага раёна як СП ААТ.

20 гадоў таму (1997) быў адкрыты Талачынскі раённы Дом рамёстваў.

20 гадоў таму (1997) заснаваны Ушацкі Дом рамёстваў у г. п. Ушачы.

20 гадоў таму (1997) заснавана прадпрыемства па вытворчасці мужчынскіх, дзіцячых кашуль і жаночых блузак «Нартэкс» у г. Віцебску як прыватнае вытворчае УП.

20 гадоў таму (1997) заснавана прадпрыемства тэкстыльнай прамысловасці «Трэйдвіт» у г. Віцебску як ТАА.

20 гадоў таму (1997) заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Сэрвач» у Докшыцкім і Глыбоцкім раёнах.

20 гадоў таму (1997) М. В. Клімаў адкрыў археалагічныя помнікі-селішчы каля в. Астроўшчына Полацкага раёна Віцебскай вобласці.

20 гадоў таму (1997) створана сумеснае беларуска-італьянскае прадпрыемства па вытворчасці дарослага і дзіцячага адзення для спорту і адпачынку «Дынама Програм Орша» ў г. Оршы як ТАА.

20 гадоў таму (1997) створаны рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Чырвоны бор» на тэрыторыі Расонскага і Верхнядзвінскага раёнаў.

15 гадоў таму (2002) недалёка ад г. п. Ветрына Полацкага раёна адкрыты помнік Аляксандру Максімавічу Семянтоўскаму, этнографу, археолагу, краязнаўцу Віцебшчыны.

15 гадоў таму (2002) М. В. Клімавым выяўлены Лучнянскія манетныя скарбы на паселішчы-1 каля в. Лучна Заазерскага с/с Полацкага раёна.

15 гадоў таму (2002) заснаваны калгас «Прыдзвінскі» ў Шумілінскім раёне на базе калгасаў «Перамога» і «Рассвет». З 2003 года – СВК з сучаснай назвай. У 2004 годзе далучаны калгас імя Ільіча.

15 гадоў таму (2002) створана РУП «Віцебскі станкабудаўнічы завод «Вістан» шляхам далучэння да РУП «Віцебскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава» Віцебскага станкабудаўнічага завода імя Камінтэрна.

15 гадоў таму (2002) пачаў выдавацца часопіс «Вестник Витебского государственного медицинского университета».

15 гадоў таму (2002) створаны Віцебскі народны тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2007 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) створаны Віцебскі ўзорны вакальны калектыў «Лада» пры Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна. У 2008 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) створаны Віцебскі народны клуб гістарычнай рэканструкцыі «Варгенторн» пры культурна-дзелавым цэнтры «Віцебск». У 2007 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) створаны Варанцэвіцкі народны клуб беларускай нацыянальнай кухні «Пачастункі з Варанцэвіч» у в. Варанцэвічы Талачынскага раёна пры сельскім Доме культуры. У 2005 годзе прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) створаны Верхнядзвінскі народны юнацкі тэатр мініяцюр «Зборная нашага горада» ў г. Верхнядзвінску пры раённым Доме культуры. У 2005 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) створаны Глыбоцкі народны сямейны клуб «Востраў паразумення» ў г. Глыбокае пры маладзёжным цэнтры аддзела адукацыі Глыбоцкага выканкама. З 2010 года працуе пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2005 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

2. **Брэжга** Баляслаў Рычардавіч // Беларусь : энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 125–126.

3. **Брэжга** Баляслаў Рычардавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – Т. 2 : Беліцк–Гімн. – С. 83–84.

4. **Брэжга** (Brezgo) Баляслаў Рычардавіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2010. – Т. 3 : А–Я. – С. 84.

5. **Брэжга Б.** Віцебскія музеі / Б Брэжга // Arche. – 2014. – № 3. – С. 396–411.

6. **Паздняковў, В.** Брэжга Баляслаў Рычардавіч / В. Паздняковў // Электронная энцыклапедыя «Вялікае Княства Літоўскае» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vkl.by/. – Дата доступу: 07.10.2016.

7. **Панізнік, С.** Ён уздымаў старонкі Віцебска-Полацкай даўніны / С. Панізнік // Полацк: карані нашага радавода : Міжнарод. навук. канф., 5–6 верас. 1995 г. / рэд. А. Мальдзіс, Р. Грудніцкі, В. Шайкоў. – Полацк : ПДУ, 1996. – С. 191–194.

8. **Пішчулёнак, М.** Віцебшчына архіўная / М. Пішчулёнак // Беларусі гістарычны часопіс. – 2002. – № 4. – С. 30–36.

9. **Подлипский, А. М.** Болеслав Ричардович Брежго // Витебская Александровская гимназия (1808–1918) / А. М. Подлипский. – Витебск, 1994. – С. 54–56.

З 1925 года жыў у Латвіі. У 1925–1937 – прафесар Рускіх універсітэцкіх курсаў (з 1930 – Рускі інстытут універсітэцкіх ведаў) у Рызе. Член Таварыства садзейнічання акадэмічнай адукацыі. У 1933 у Брусельскім універсітэце абараніў дысертацыю на ступень доктара гісторыі па тэме «Латгальскае сялянства ў 1772–1861 гадах» («LespaysansdeLatgalieen 1772–1861»). У 1937–1940 працаваў інспектарам Упраўлення па ахове помнікаў даўніны. Арганізатар Латгальскага цэнтральнага музея. У 1940–1941 дырэктар Даўгаўпілскага павятовага дзяржаўнага архіва. З 1945 прафесар кафедры славянскай філалогіі Латвійскага ўніверсітэта, адначасова з 1946 старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі і матэрыяльнай культуры АН Латвійскай ССР.

Даследаваў гісторыю, помнікі археалогіі, архітэктуры, кнігавыдання, пісьменнасці, архівы Віцебшчыны і Латгаліі. Пісаў на латышскай, рускай, беларускай, польскай, нямецкай, французскай мовах, на латгальскім дыялекце. Вучоны займаўся вывучэннем гістарычных сувязяў латышоў і беларусаў, дамоўных грамат Полацка і Рыгі, гісторыі паўстання 1863–1864 на тэрыторыі Віцебшчыны, складаў бібліяграфію па гісторыі Беларусі. Аўтар больш як 120 навуковых прац, каля 30 з іх прысвечаны гісторыі Віцебска і Полацка. Найбольш вядомыя працы: «Архівы і архіўная праца ў Віцебшчыне» (1925), «Ахова помнікаў старажытнасці на Віцебшчыне» (1932), «Замкі Віцебшчыны» (1933), «Рэпін на берагах Дзвіны», «Латгальскія сяляне ў час рускага прыгоннага права» (1940), «Латгальскія сяляне пасля адмены прыгоннага права ў 1861–1914 гады» (1954), «Нарысы па гісторыі сялянскіх рухаў у Латгаліі 1577–1907» (1956).

Памёр 30 верасня 1957 года ў Рызе.

ЛІТАРАТУРА

1. **Брэжга** Баляслаў Рычардавіч // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – Кн. 2. – С. 549.

15 гадоў таму (2002) створана Глыбоцкая народная літаратурна-музычная гасцёўня «Сустрэчы для душы» пры цэнтральнай раённай бібліятэцы. У 2008 годзе было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

15 гадоў таму (2002) адкрыты дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Жамчужына» ў в. Бароўка-1 Лепельскага раёна.

10 гадоў таму (2007) азёрны заказнік рэспубліканскага значэння «Белае» ў Глыбоцкім і Ушацкім раёнах перайменаваны ў гідралагічны.

10 гадоў таму (2007) заснавана «ЛТП Белвіт», прадпрыемства па вытворчасці мужчынскага, жаночага і дзіцячага трыкатажнага, спартыўнага адзення ў Віцебску як сумеснае ТАА з сучаснай назвай. З 2008 года – замежнае ЧУПП.

220 гадоў таму (1797) адбыліся антыпрыгонніцкія выступленні сялян Суражскага, Гарадоцкага, Віцебскага, Полацкага паветаў.

85 гадоў таму (1932) пачала выходзіць Шумілінская раённая газета «Ленінскі шлях» (цяпер «Герой працы»).

1 студзеня – 245 гадоў таму (1772) Дубровеншчына ўвайшла ў склад Расійскай дзяржавы.

1 студзеня – 130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Ром Аляксандр Георгіевіч (1887–1952), мастацтвазнавец. У 1918 – 1922 гг. працаваў у Віцебску.

1 студзеня – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Бржазоўскі Генрых Францавіч, беларускі жывапісец, ураджэнец г. Мінска. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме.

1 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Васілеўскі Ягор Васілевіч (1922–1991), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык-знішчальнік, ураджэнец в. Гарбачова Віцебскага раёна.

1 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Габрусёў Аляксей Канстанцінавіч (1922–2007), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Гарошкава Дубровенскага раёна.

1 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Падсаднік Мікалай Георгіевіч (1922–1975), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Вуглы Полацкага раёна.

1 студзеня – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Маленчанка Аляксандр Фёдаравіч, беларускі вучоны ў галіне радыёбіялогіі, ураджэнец г. Оршы.

1 студзеня – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Сушко Пётр Паўлавіч (1937–1996), паэт, ураджэнец Мёрскага раёна. Працаваў у газеце «Віцебскі рабочы».

1 студзеня – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Краўчук Адам Мікалаевіч, беларускі народны майстар у галіне лозапляцення, ураджэнец в. Рагадашч Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Працаваў у інстытуце «Віцебскграмадзянпраект».

1 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Баркоўскі Віталь Міхайлавіч, беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа (1997–2008 гг.).

БРЭЖГА

БАЛЯСЛАЎ РЫЧАРДАВІЧ

Да 130-годдзя з дня нараджэння

(1887)

Брэжга Баляслаў Рычардавіч нарадзіўся 12 красавіка 1887 года ў в. Айзупіешы Дрыцанскай воласці Рэжыцкага павета Віцебскай губерні, беларускі і латышскі археолаг, гісторык, археограф, філолаг, адзін з пачынальнікаў архіўнай справы на Беларусі. У 1910 годзе скончыў экстэрнам Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, паступіў у Маскоўскі археалагічны інстытут (1916). Удзельнік Першай сусветнай вайны, быў цяжка паранены.

У 1915 годзе ў выданні «Виленский вестник» з'явілася яго першая работа – «Инициалы и орнамент в актовых книгах Витебского архива древних актов XVI–XVIII столетий». 27.11.1917 як вольны слухач скончыў Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. 02.12.1917 абраны правадзейным членам інстытута і пакінуты пры кафедры «Старажытнасці Паўночна-Заходняга краю» для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. 06.02.1918 абраны загадчыкам Віцебскага аддзялення інстытута, у ліпені 1918 – ганаровым членам інстытута. З 1918 года загадваў Віцебскім аддзяленнем МАІ (Маскоўскі археалагічны інстытут) да яго ліквідацыі ў 1922 годзе. У 1922–1924 гг. быў навуковым супрацоўнікам Віцебскага губернскага архіва.

Пашаны» і медалямі. У 1972 г. яму было прысвоена званне Заслужанага работніка БССР. Памёр пісьменнік 14 жніўня 1975 года.

ЛІТАРАТУРА

1. **Глацёнак, Н.** Імя на літаратурнай карце Верхнядзвіншчыны / Н. Глацёнак // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2002. – 5 сак. – С. 2.

2. **Дзядзюля, А.** Зачараваны Дзвіною / А. Дзядзюля // Звязда. – 2012. – 7 сак. – С. 2.

3. **Есакоў, А.** Такі быў Тарас Хадкевіч / А. Есакоў // Літаратура і мастацтва. – 1979. – 6 ліп. – С. 14.

4. **Зімацкая, А.** Ён сэрца нам сваё пакінуў / А. Зімацкая // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2012. – 20 сак. – С. 5.

5. **Столп, В.** І сам стаў песняю Дзвіны / В. Столп // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2000. – 26 мая. – С. 2.

6. **Тарас Хадкевіч** // Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі ; навук. рэд. А. Л. Верабей. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 557–558.

7. **Хадкевіч Тарас** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1993. – Т. 6. – С. 158–164.

1 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Пахабаў Валерый Інакенцьевіч, беларускі вучоны ў галіне эканомікі, ураджэнец г. Талачына. Доктар эканамічных навук (1992), прафесар (1995).

1 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзілася Філіповіч Марыя Канстанцінаўна (1947–2003), беларуская пісьменніца, ураджэнка в. Смётанка Аршанскага раёна.

1 студзеня – 50 гадоў таму (1967) у Наваполацку выйшаў першы нумар газеты «Химик». Не выдаецца з ліпеня 2006 года.

2 студзеня – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Ануфрыеў Віктар Антонавіч (1932–2006), педагог, краязнаўца, ураджэнец в. Будзянка Віцебскай вобласці.

2 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Кузняцоў Уладзімір Іванавіч, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска. Працуе ў Віцебскім медыцынскім універсітэце.

2 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Ятусевіч Антон Іванавіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай паразіталогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1998 года – рэктар Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

5 студзеня – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Лапацін Пётр Рыгоравіч (1907–1974), Герой Савецкага Саюза, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці.

5 студзеня – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Вількін Якаў Раманавіч (1932–1997), беларускі вучоны ў галіне спартыўнай педагогікі, этнограф, гісторык, заслужаны трэнер Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

6 студзеня – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Вератнёва Марыя Барысаўна, даярка, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Скачыхі Ушацкага раёна. Працавала ў саўгасе «Кублічы».

7 студзеня – 110 гадоў таму (1907) нарадзілася Друкер Соф'я Юр'еўна (1907–1984), беларуская артыстка оперы, народная артыстка Беларусі. Ураджэнка г. п. Копысь Аршанскага раёна.

7 студзеня – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Гарановіч Віталь Рыгоравіч, паэт, лаўрэат Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, ураджэнец в. Ермакі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. З 1977 года працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Задарожскай 8-гадовай школы, потым з 1979 года – дырэктарам Кіраўскай сярэдняй школы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

9 студзеня – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Палявой Іван Сцяпанавіч (1907–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945). Падчас Беларускай аперацыі бамбіў ваенныя аб'екты ворага ў раёне Мінска, Полацка, Докшыц і Даўгаўпілса, ураджэнец с. Новамікалаеўка Херсонскай вобласці.

9 студзеня – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Плавінскі Аляксандр Мікалаевіч, беларускі археолаг, ураджэнец г. Мінска. Сумесна з В. Н. Рабцэвічам праводзіў раскопкі курганных могільнікаў Ахрэмаўцы, Опса, Укля Віцебскай вобласці.

Чырвонай Арміі пабываў у Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы.

Пасля дэмабілізацыі Тарас Хадкевіч восенню 1945 года вярнуўся ў Мінск, працаваў раз’язным карэспандэнтам у газеце «Звязда» (1945–1950), потым загадчыкам аддзела публіцыстыкі газеты «Літаратура і мастацтва» (1950–1951), літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (1953–1972).

У юнацкім узросце Т. Хадкевіч захапляўся паэзіяй, у 1932 г. ён выдаў зборнік вершаў «Смялей, таварыш!» у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. З 1936 г. прысвячае сябе журналістыцы і да літаратурна-мастацкай творчасці вяртаецца толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Тарас Канстанцінавіч у пасляваенны час выступае як празаік. Яго аповесці «Братэрства», «Рэха ў гарах» прысвечаны інтэрнацыянальнай еднасці антыфашыстаў, аповесць «Вяснянка» – жыццю калгаснай вёскі. У 1947 годзе Т. Хадкевіч становіцца членам Саюза пісьменнікаў БССР. Яго аповесці, апавяданні, нарысы друкуюцца ў перыядычных выданнях і выходзяць асобнымі кнігамі. У 1959 г. Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў свет раман «Даль палявая», прысвечаны пасляваенным справам савецкіх людзей, крыху пазней – кнігу-нарыс «Мая Беларусь», зборнік апавяданняў «Сад у квецені». Людзям новабудоўляў пісьменнік прысвяціў нарыс «Нафтагігант на Дзвіне» (1963) і раман «Песня Дзвіны» (1975).

Актыўна працаваў Т. Хадкевіч і ў галіне дзіцячай літаратуры. Юнаму чытачу вядомы зборнікі яго апавяданняў «За сінім лесам» (1951), «На новым месцы» (1954), «Спеюць яблыкі» (1959), «Жыла-была казка» (1967), «Дзвіна пайшла» (1968). Творы пісьменніка перакладзены на мовы народаў СССР. На беларускую мову Т. Хадкевіч пераклаў творы М. Горкага «У Амерыцы» (1952), «Апавяданні» (1955), раман А. Чайшвілі «Лело». Ён суаўтар кніг «Беларуская ССР» (1958), «Мы раскажам пра Мінск» (1964).

Літаратурная і грамадская праца Тараса Канстанцінавіча Хадкевіча адзначана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак

ХАДКЕВІЧ

ТАРАС КАНСТАНЦІНАВІЧ

Да 105-годдзя з дня нараджэння (1912)

Хадкевіч Тарас Канстанцінавіч нарадзіўся 7 сакавіка 1912 года ў вёсцы Шайцерава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пісьменнік, перакладчык, публіцыст, крытык. Хлапчуком ён дапамагаў бацькам па гаспадарцы, вучыцца пачаў з шасці гадоў. Пад уплывам сястры-настаўніцы рана выявілася ў яго цікавасць да мастацкага слова. З пятага класа наведваў сямігодку ў в. Валынцы, дзе ў школьнай насценгазеце быў змешчаны яго першы верш «Да новага жыцця». У 1925 гаду выступіў з вершамі ў друку (часопіс «Малады араты»).

Скончыўшы сямігодку ў 1927 годзе, Тарас Хадкевіч паступіў у Полацкі педагагічны тэхнікум. З 1929 года працаваў у рэдакцыі акруговай газеты «Чырвоная Полаччына» спачатку літаратурным работнікам, потым адказным сакратаром. У 1931 годзе ён пераехаў у Мінск і паступіў на літаратурны факультэт Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута. Вучобу сумяшчаў з вячэрняй работай у Беларускім тэлеграфным агенцтве, рэдакцыі газеты «Рабселькор». У 1933–1934 гг. Т. Хадкевіч працаваў у рэдакцыі камсамольскай газеты «Чырвоная змена», а пасля двухгадовай службы ў Чырвонай Арміі – карэспандэнтам газеты «Звязда».

У час Вялікай Айчыннай вайны Т. Хадкевіч быў камандзірам узвода, ваяваў пад Вялікімі Лукамі, Тарапцом. У верасні 1941 года паранены трапіў у палон. Быў у лагерах ваеннапалонных у Тарапцы, Даўгаўпілсе, пад Рыгай. Удзельнічаў у інтэрнацыянальным руху Супраціўлення на тэрыторыі Германіі. Тройчы ўцякаў з палону. У складзе

9 студзеня – 50 гадоў таму (1967) нарадзіўся Дурноў Вячаслаў Віктаравіч, беларускі спартсмен (вадналыжны спорт), заслужаны майстар спорту Беларусі, ураджэнец в. Астроўшчына Полацкага раёна. З 2009 года – начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Наваполацкага гарвыканкама.

10 студзеня – 45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Піпін Уладзімір Анатольевіч, скульптар, ураджэнец г. Оршы.

11 студзеня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Кляро Ігнат Вікенцьевіч (1897–1944), генерал-маёр, ураджэнец г. Віцебска, удзельнік грамадзянскай вайны на Заходнім фронце.

12 студзеня – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Спірыдзенка Мікалай Кузьміч (1917–1980), Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр (1961), лётчык, удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну змагаўся на Паўднёва-Заходнім, Заходнім і 2-м Беларускім франтах, ураджэнец Шумілінскага раёна.

12 студзеня – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Каралевіч Валянцін Васільевіч, беларускі трэнер (веласіпедны спорт), заслужаны трэнер Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

14 студзеня – 75 гадоў таму (1942) нарадзілася Вярба Вера (сапр. Сакалова Гертруда Пятроўна), беларуская паэтэса, ураджэнка в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна.

15 студзеня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Фёдараў Яўген Аляксандравіч (1897–1961), рускі пісьменнік, аўтар гістарычных раманаў, ураджэнец Браслаўскага раёна.

15 студзеня – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Азаронак Анатоль Раманавіч, контр-адмірал, ураджэнец г. Оршы.

15 студзеня – 45 гадоў таму (1972) Мёрам прысвоены статус горада.

16 студзеня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Глебаў Афанасій Васілевіч (1902–1997), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Аляксандраўна Смаленскай вобласці. Ганаровы грамадзянін Полацка (1979).

19 студзеня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Серафімаў Васіль Сцяпанавіч (1897–1972), кандыдат эканамічных навук, ураджэнец Полацкага раёна.

20 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Айтыкаў Ізгуты Курманбаевіч (1922–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец с. Таргын (Казахстан).

20 студзеня – 55 гадоў таму (1962) была арганізавана 1-я зімовая абласная спартакіяда.

21 студзеня – 130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Яхімовіч Фёдар Аляксеевіч (1887–1959), беларускі вучоны ў галіне паталагічнай фізіялогіі, заслужаны дзеяч навукі БССР, загадчык кафедры Віцебскага медыцынскага інстытута (1937–1941 гг.).

21 студзеня – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Садковіч Мікола (сапр. Мікалай Фёдаравіч; 1907–1968), кінарэжысёр, кінадраматург, пісьменнік, ураджэнец Аршанскага раёна.

22 студзеня – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Станкевіч Міхаіл Станіслававіч, генерал-лейтэнант, намеснік Міністра абароны Рэспублікі Беларусь (1994–1996), ураджэнец в. Андронавічы Віцебскага раёна.

года – загадчык сектара эпохі бронзы і жалеза. Даследуе помнікі жалезнага веку і ранняга сярэднявечча басейна Заходняй Дзвіны, Верхняга Падняпроўя.

ЛІТАРАТУРА

1. **Зайкоўскі, Э. М.** Шадыра Вадзім Іосіфавіч / Э. М. Зайкоўскі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. Ю. У. Каласоўскі. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 413.

2. **Корзенко Г. В.** Шадыро Вадим Иосифович / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : биобиблиографический справочник / Г. В. Корзенко. – Минск : Белорусская наука, 2007. – С. 429–430.

3. **Шадыра** Вадзім Іосіфавіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1993. – С. 649–650.

4. **Шадыра** Вадзім Іосіфавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 17 : Хвінявічы–Шчытні. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 359.

5. **Шадыра** Вадзім Іосіфавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 6 : у 2 кн. – Кн. 2 : Усвея–Яшын. – С. 190.

6. **Шадыро** Вадим Иосифович // Институт истории НАН Беларуси в лицах, 1929–2008 : биобиблиографический справочник. – Минск : Белорусская наука, 2008. – С. 346–347.

Сакавік

ШАДЫРА

ВАДЗІМ ІОСІФАВІЧ

70 год з дня нараджэння (1947)

Шадыра Вадзім Іосіфавіч – беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся 1 сакавіка 1947 года ў г. Пячора (Расія) у сям'і служачых. У 1972 годзе скончыў гістарычны факультэт БДУ. Навучаўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1976–1979). На фарміраванне гістарычнага светапогляду аказалі ўплыў Г. А. Каханоўскі, А. Г. Штыхаў, А. Г. Мітрафанаў, Е. А. Шмідт.

У 1981 годзе абараніў дысертацыю «Племена днепродвинской культуры Белорусского Подвинья (VIII–VII вв. до н. э. – IV в. н. э.)». У 2003 годзе абараніў доктарскую дысертацыю «Беларускае Падзвінне ў эпоху жалеза і ранняга сярэднявечча (VII ст. да н. э. – VIII ст. н. э.)», якая не была зацверджана ВАК. Працаваў слесарам-зборшчыкам радыёапаратуры на прыборабудаўнічым заводзе ў г. Маладзечна (1965–1967), навуковым супрацоўнікам у Мінскім абласным краязнаўчым музеі (1968–1972). Старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага музея гісторыі культуры (1973–1974), Інстытута гісторыі АН Беларусі (1974–1992). З 1962 года – загадчык аддзела археалогіі жалезнага веку. З 2005

22 студзеня – 65 гадоў таму (1952) у г. п. Копысь Аршанскага раёна адкрыта новая школа.

23 студзеня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Айвадзіш Эдвард (1897–2000), паэт, педагог, краязнаўца, ураджэнец в. Вайвады Дрысенскага павета Віцебскай губерні.

23 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Федарэнка Мікалай Міхайлавіч (1922–2000), жывапісец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец Аршанскага раёна.

23 студзеня – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Асвяцінскі Геральд Баляслававіч (1932–2006), заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ураджэнец р. п. Ялізава Асіповіцкага раёна. З 1965 года – дырэктар тэатра імя Я. Коласа.

23 студзеня – 50 гадоў таму (1967) у Оршы адбылася Усесаюзная нарада машынабудаўнікоў.

24 студзеня – 125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Амбражунас Пётр Іосіфавіч (1892–1937), старшыня Аршанскага акрвыканкама. Адна з вуліц Оршы носіць яго імя.

24 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Мароз Алег Іванавіч, гаспадарчы работнік, лаўрэат Першай прэміі савецкіх прафсаюзаў. Ураджэнец г. п. Багушэўск.

24 студзеня – 65 гадоў таму (1952) у Оршы адкрыўся дзіцячы сад № 4.

25 студзеня – 125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Бразер Абрам Маркавіч (1892–1942), скульптар, жывапісец, графік. Выкладаў у Віцебскім мастацка-графічным інстытуце (1918–1923 гг.).

25 студзеня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Калінін Пётр Захаравіч (1902–1966), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі, ураджэнец Шумілінскага раёна.

25 студзеня – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Кірпічонак Уладзімір Аляксандравіч (1942–2001), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, ураджэнец Ушацкага раёна.

26 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзілася Акружная Святлана Арцёмаўна, народная артыстка Рэспублікі Беларусь, актрыса тэатра імя Я. Коласа.

27 студзеня – 30 гадоў таму (1987) нарадзілася Камоска Ірына Аляксандраўна, беларуская спартсменка (падводнае плаванне), чэмпіёнка Беларусі, ураджэнка г. Наваполацка.

27 студзеня – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Ровіна Раіса Аўрамаўна, бібліяграфазнавец, гісторык кнігі, педагог, уладальніца знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», ураджэнка г. Полацка.

28 студзеня – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Жаркоў Міхаіл Георгіевіч, гісторык, ураджэнец г. Віцебска.

29 студзеня – 60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Копцік Юрый Аляксандравіч, краязнавец, ураджэнец г. Оршы.

30 студзеня – 350 гадоў таму (1667) Віцебск адышоў да Рэчы Паспалітай.

30 студзеня – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Ісаевіч Галіна Анатольеўна, беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жывапісец, ураджэнка г. Віцебска.

31 студзеня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Кавалеўскі Мікалай Ціханавіч (1902–1978), генерал-маёр інжынерных войск, удзельнік Влікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Мацюшына Лепельскага раёна.

(«У бэзавым садзе» Ц. Саладара), Юстына ў аднайменнай п’есе Х. Вуаліёкі.

Ганна Купрыянаўна займалася не толькі творчасцю. Яна прымала актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці – на працягу шэрагу гадоў была дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў. За высокія творчыя дасягненні, актыўны ўдзел у развіцці беларускага сцэнічнага мастацтва Г. К. Панкрат было прысуджана званне «Заслужаная артыстка БССР». Яна была ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

За сваю творчую кар’еру Г. Панкрат стварыла каля двухсот гераічных, драматычных, лірычных, сатырычных, меладраматычных, камедыйных роляў. Яе талент, яе мастацтва заўсёды знаходзілі водгук у сэрцах гледачоў. Памерла Ганна Купрыянаўна Панкрат 4 лютага 1995 года.

ЛІТАРАТУРА

1. **Панкрат** Ганна Купрыянаўна // Беларуская савецкая энцыклапедыя : [у 12 т.] / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1975. – Т. 8. – С. 81.

2. **Панкрат** Ганна Купрыянаўна // Памяць: Полацк : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. С. С. Чарняўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2002. – С. 789.

3. **Тараканава, Н. В.** Панкрат Ганна Купрыянаўна / Н. В. Тараканава // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2003. – Т. 2. – С. 236.

4. **Трацэўская, Н. В.** Панкрат Ганна Купрыянаўна / Н. В. Трацэўская // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1987. – Т. 4. – С. 165.

«Бацькаўшчына» па п’есе К. Чорнага. Крытыка адзначала яркае шматграннае дараванне Г. Панкрат.

У 1938 годзе быў арганізаваны Бабруйскі калгасна-саўгасны тэатр, у якім Ганна Панкрат працавала з першых дзён і да 1941 года. Тэатр займаўся планамерным абслугоўваннем калгасаў і саўгасаў Бабруйскага, Асіповіцкага, Быхаўскага, Шклоўскага і іншых раёнаў. Маладая актрыса вызначылася ў спектаклі «Не было ні гроша, ды раптам шастак» па п’есе А. Астроўскага ў ролі Мігачовай. З гэтай пастаноўкай тэатр заняў другое месца ў рэспубліканскім фестывалі калгасна-саўгасных тэатраў, выступаў на сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. На сцэне гэтага тэатра Г. Панкрат стварыла яркія, праўдзівыя вобразы Настулькі і Веры Міхайлаўны («Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы).

Наступным месцам працы Ганны Панкрат стаў Бабруйскі абласны драматычны тэатр, які існаваў у 1944–1947 гадах на базе рэарганізаванага Бабруйскага калгасна-саўгаснага тэатра. У верасні 1947 года тэатр быў пераведзены ў Гродна, дзе стаў абласным драматычным тэатрам. Ганна Панкрат увайшла ў гісторыю Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра як яркая творчая індывідуальнасць, якая радавала гледача сваім цудоўным майстэрствам на працягу 25 гадоў. Яна прыйшла ў тэатр ужо вядомай актрысай і адразу заняла вядучае месца ў тэатральным калектыве. Адной з лепшых стала роля Люсі Купер у спектаклі «Саступі месца заўтрашняму дню» В. Дэльмар. Тонкую акварэльную мініяцюру паказалі два майстры сцэны: заслужаная артыстка БССР Ганна Панкрат і народны артыст БССР Якаў Кімберг.

Ганна Панкрат – выканаўца характарных, драматычных роляў. Яе творчасці ўласцівы спасціжэнне сацыяльнай прыроды вобраза, пластычнасць знешняга малюнка ролі. Сярод значных работ у беларускім рэпертуары: Ганна Іванаўна («Гэта было ў Мінску» А. Кучара), Паліна («Трыбунал» А. Макаёнка); у класічнай, сучаснай і замежнай драматургіі: Рашэль («Васа Жалязнова» М. Горкага), Купавіна, Кабаніха («Ваўкі і авечкі», «Навальніца» А. Астроўскага), Фаіна («Маё сэрца з табою» Ю. Чапурына), Мадлен

31 студзеня – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Арцюшкевіч Аляксандр Сяргеевіч, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец Аршанскага раёна.

31 студзеня – 55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Санько Сяргей Іванавіч, філосаф, этнакультуролаг, ураджэнец г. Оршы.

1 лютага – 85 гадоў таму (1932) у Віцебску адкрыты Беларускі дзяржаўны кінатэхнікум. Зараз не існуе.

1 лютага – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Барадулька Леанід Сцяпанавіч (1937–2000), дзеяч беларускага самадзейнага мастацтва, балетмайстар, ураджэнец Оршы. З 1946 года – кіраўнік народнага ансамбля «Лявоніха» Віцебскага гарадскога Цэнтра культуры.

1 лютага – 50 гадоў таму (1967) адкрыўся Віцебскі гарадскі шахматна-шашачны клуб.

2 лютага – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Камлюк Лілія Васілеўна, вучоны, доктар біялагічных навук, прафесар, ураджэнка г. Оршы.

3 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Быкоўскі Уладзімір Ігнацьевіч, прафсаюзны і партыйны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Аўласкава Верхнядзвінскага раёна.

5 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Купрыянаў Фёдар Паўлавіч (1922–1998), генерал-лейтэнант, ураджэнец в. Марчанкі Гарадоцкага раёна.

5 лютага – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Безбародаў Уладзімір Сцяпанавіч, беларускі хімік, доктар хімічных навук, ураджэнец г. Паставы.

5 лютага – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Місурагін Ігнацій Арцёмавіч, беларускі ваенны дзеяч, генерал-маёр (2000), кандыдат ваенных навук (2003), ураджэнец г. Віцебска.

6 лютага – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Вільчынскі Іван Сцяпанавіч (1912–1999), краязнаўца, ветэран, ураджэнец в. Зялёнка Полацкага павета.

8 лютага – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Холад Валерый Міхайлавіч, доктар біялагічных навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.

8 лютага – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Кенька Міхаіл Паўлавіч, беларускі літаратуразнавец, перакладчык, ураджэнец в. Верацеі Пастаўскага раёна.

9 лютага – 145 гадоў таму (1872) нарадзіўся Данілевіч Васіль Яўхімавіч, украінскі археолаг, гісторык, ураджэнец г. Курска. Працаваў у археалагічных экспедыцыях на Полаччыне, Падзвінні.

10 лютага – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Салтановіч Цімафей Емяльянавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Асінаўка Аршанскага раёна.

10 лютага – 75 гадоў таму (1942) у гады Вялікай Айчыннай вайны былі ўтвораны «Віцебскія (Суражскія) вароты». Існавалі да 28 верасня 1942 г.

3. **Голынский, О.** Памяти Бородулько / О. Голынский // Віцебскі рабочы. – 2001. – 29 сак. – С. 2.

4. **Гринь, Е.** Аплодисменты для «Лявонихи» / Е. Гринь. – Витебск, 2004. – 55 с.

5. **Карпас, Е.** Ой, Лявониха, Лявониха моя! / Е. Карпас // Віцебскі рабочы. – 1997. – 29 студз. – С. 2.

6. **Козенка, М. А.** Барадулька Леанід Сцяпанавіч / М. А. Козенка // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2005. – Т. 1. – С. 138–139.

7. **Тючкалов, Е.** Поклонение мастеру / Е. Тючкалов // Віцьбічы = Витьбичи. – 1997. – 1 февр. – С. 7.

8. **Умер** Леонид Бородулько // Витебский курьер. – 2000. – 4 апр. – С. 3.

ПАНКРАТ
ГАННА КУПРЫЯНАЎНА

Да 105-годдзя з дня нараджэння (1912)

Панкрат Ганна Купрыянаўна нарадзілася 13 лютага 1912 года ў г. Полацку ў сям'і рабочых, беларуская актрыса, заслужаная артыстка БССР (1962). У 1934 годзе скончыла драматычную студыю пры БДТ-1 (педагог Л. Літвінаў). Да 1937 года працавала ў гэтым тэатры. Ужо першыя работы на сцэне прыцягнулі ўвагу тэатральнай грамадскасці і крытыкі, якія высока ацанілі маладую актрысу ў ролі Ульяны ў спектаклі

ансамбль «Лявоніха» з харэаграфічнай кампазіцыяй «Алімпійскі факел» прадстаўляў культуру Прыдзвіння на XXII Алімпійскіх гульнях у Маскве.

За 36 гадоў працы ў ансамблі «Лявоніха» Л. С. Барадулька паставіў больш за 80 сюжэтна-тэматычных харэаграфічных кампазіцый і народна-сцэнічных танцаў, значная частка якіх створана на фальклорным матэрыяле Віцебскага Падзвіння: «Старасельская кадрыля», «Лявоніха» «Крыжачок», «Кросны», «Таўкуша», «Беларускія хлопцы» (мужчынскі) і іншыя. У аўтарскіх пастаноўках Барадулька асаблівую ўвагу надаваў сродкам мастацкай выразнасці: прастораваму малюнку, пластыцы танца, якая інтанацыйна набліжалася да пластычнай мовы аўтэнтычных узораў Беларускага Паазер'я.

Леанід Сцяпанавіч быў кансультантам Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы, дапамагаў аматарскім харэаграфічным калектывам у фарміраванні беларускага рэпертуару, тым самым развіваючы рэгіянальную народную харэаграфію ў яе сцэнічных формах. Выкладаў беларускі народны танец на абласных семінарах харэографаў і курсах павышэння кваліфікацыі культработнікаў.

Талент і плённая праца Л. Барадулькі прынеслі вядомасць і славу не толькі роднаму калектыву, але і ўсёй Віцебшчыне. Балетмайстар імкнуўся спалучаць наватарскія пошукі з захаваннем традыцый нацыянальнай культуры, стварыў асаблівы варыянт тэатралізаванага дзейства, магічнае ўздзеянне якога было па заслугах ацэнена гледачамі розных краін. Ён змог прыўнесці ў народны танец інтэлігентнасць, надзіва тонкі псіхалагізм.

Памёр 2 красавіка 2000 года пасля цяжкай хваробы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бородулько** Леонид Степанович // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Белорусская энциклопедия, 2006. – Т. 2 : А–Г (Герань). – С. 474.

2. **Барадулька** Леанід Сцяпанавіч // Культура Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. – Т. 1 : А–Б. – С. 437.

11 лютага – 210 гадоў таму (1807) нарадзіўся Орда Напалеон (1807–1883), мастак, педагог, пісьменнік, кампазітар. Сярод яго малюнкаў – акварэлі з відамі Віцебска.

12 лютага – 115 гадоў таму (1902) нарадзілася Цэрак-Галубовіч Гелена (1902–1979), беларускі і польскі археолаг, прафесар, ураджэнка г. Івана-Франкоўск (Украіна). У 1933–1939 гг. разам з У. Галубовічам ажыццявіла разведкі і раскопкі курганных могільнікаў на Заходняй і Паўднёва-Заходняй Беларусі.

12 лютага – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Чарныш Аляксандр Іванавіч (1917–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну змагаўся на Ленінградскім, Закаўказскім, Беларускім і 1-м Беларускім франтах, ураджэнец Докшыцкага раёна.

12 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Ландычэнка Віктар Фёдаравіч (1922–1980), поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец Лёзненскага раёна.

12 лютага – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Яшкін Іван Якаўлевіч, беларускі мовазнавец. Працаваў у Полацкім педагагічным інстытуце (1957–1959).

12 лютага – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Карасёў Віктар Раманавіч, краязнаўца, ураджэнец г. п. Ветрына Полацкага раёна. Вывучае гісторыю г. п. Ветрына і Полаччыны.

13 лютага – 105 гадоў таму (1912) нарадзілася Панкрат Ганна Купрыянаўна (1912–1995), актрыса, заслужаная артыстка БССР, ураджэнка г. Полацка.

13 лютага – 55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Сцяпанаў Віктар Міхайлавіч, краязнавец, ураджэнец г. Оршы.

14 лютага – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Звонак Алесь (Пётр Барысавіч; 1907–1996), беларускі паэт, перакладчык, ураджэнец г. Мінска. Узначальваў Полацкую філію «Маладняка» (1925–1927).

15 лютага – 170 гадоў таму (1847) нарадзіўся Шчэрбаў-Нефядовіч Павел Восіпавіч (1847–1907), дзяржаўны дзеяч.

15 лютага – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Гаўрыленка Павел Нічыпаравіч (1902–1961), беларускі жывапісец, адзін з арганізатараў Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі ў Віцебску (1928–1930).

15 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Вялічка Генадзь Іосіфавіч, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец Аршанскага раёна.

15 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Навумовіч Сямён Сцяпанавіч, вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі, ураджэнец г. п. Копысь Аршанскага раёна.

16 лютага – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Юшкевіч Васіль Аляксандравіч (1897–1951), удзельнік грамадзянскай вайны, нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі (1936–1939), Вялікай Айчыннай вайны, генерал-палкоўнік, ураджэнец г. Паставы.

17 лютага – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Крываблоцкі Уладзімір Васільевіч, беларускі мастак-манументаліст, жывапісец, ураджэнец в. Хвалава Пружанскага раёна. Сярод твораў: роспіс «Во имя жизни на Земле» ў Музеі народнай славы ў г. п. Ушачы (1982).

самадзейнага гуртка, створанага ў 1954 годзе, з'яўляўся С. Х. Партной. Некалькі гадоў Л. Барадулька ўдасканальваў майстэрства ў самадзейным калектыве, потым паспяхова працаваў на прафесійнай сцэне артыстам Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. У Мінску таленавіты танцор таксама заявіў пра сябе, аб чым сведчаць запрашэнні ў Чырвонасцяжны ансамбль імя Аляксандрава і малдаўскі «Жок».

Па сямейных абставінах Леанід Сцяпанавіч вярнуўся ў Віцебск і ў пачатку 1964 года быў прызначаны кіраўніком танцавальнага калектыву Віцебскага ГДК. Ён з вялікім азартам уключыўся ў работу. Калектыў прымаў удзел ва ўсіх значных культурна-масавых мерапрыемствах у горадзе і вобласці. Але Леанід Сцяпанавіч не меў вопыту харэографа, пастаноўшчыка. Для дэталёвага вывучэння беларускага народнага танцавальнага фальклору калектыў і яго кіраўнік выязджалі ў раёны Віцебшчыны. Дзякуючы гэтаму, напрыклад, была здзейснена пастаноўка танца «Беларуская кругавая кадрыля», якая бытавала ў Бешанковіцкім раёне.

Паступова ансамбль танца «Лявоніха» пачаў набываць папулярнасць. У 1971 годзе яму было прысвоена званне «Народны самадзейны калектыў». Шмат сіл і энергіі Леанід Сцяпанавіч аддаваў падрыхтоўцы разнастайных канцэртных праграм. Спецыяльна да святкавання 1000-гадовага юбілею Віцебска (1974) была створана харэаграфічная кампазіцыя «Віцязі» ў пастаноўцы балетмайстра Л. С. Барадулькі. Шмат увагі ўдзяляў мастацкі кіраўнік пытанням творчага станаўлення і выхавання моладзі ў калектыве. Пастаянную метадычную і практычную дапамогу ён аказваў дзіцячаму танцавальнаму калектыву Лятчанскага ДК Віцебскага раёна, быў узнагароджаны знакам «Выдатнік шэфскай работы на сяле».

У 1979 годзе Л. Барадулька скончыў Віцебскае культурна-асветніцкае вучылішча. Ён быў пастаянным удзельнікам рэспубліканскіх семінараў-практыкумаў па запісе народных танцаў, семінараў кіраўнікоў народных ансамбляў танца, рэспубліканскіх нарад работнікаў культуры. Адначасова балетмайстар дасканала вывучаў рэпертуар і кансультаваўся ў Дзяржаўным ансамблі танца БССР. У 1980 годзе менавіта народны

10. **Кашчакова, В.** Лірычная споведзь / В. Кашчакова // Сцяг Ільіча (Талачын). – 1967. – 27 мая. – С. 3.

11. **Кузьмич, О.** От поэзии до прозы / О. Кузьмич // Наша Талачыншчына. – 2012. – 14 студз. – С. 4.

12. **Собаль, В.** Прага шчасця / В. Собаль // Віцебскі рабочы. – 1997. – 14 студз. – С. 3.

БАРАДУЛЬКА

ЛЕАНІД СЦЯПАНАВІЧ

Да 80-годдзя з дня нараджэння (1937)

Барадулька Леанід Сцяпанавіч нарадзіўся 1 лютага 1937 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці, балетмайстар, танцоўшчык, педагог, заслужаны работнік культуры БССР (1982), мастацкі кіраўнік і балетмайстар народнага ансамбля танца «Лявоніха» Віцебскага гарадскога Цэнтра культуры.

Працоўная дзейнасць Л. С. Барадулькі пачыналася на Віцебскім заводзе імя Камінтэрна. У 18-гадовым узросце юнак пачаў займацца ў танцавальным калектыве Віцебскага Дома культуры. Кіраўніком

17 лютага – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Калядзінскі Леанід Уладзіміравіч, беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец г. Мінска. Праводзіў археалагічныя даследаванні ў Віцебску.

18 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Лебедзеў Мікалай Іванавіч, гісторык, ураджэнец Лёзненскага раёна.

18 лютага – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Савіцкі Міхаіл Андрэевіч (1922–2010), беларускі мастак, жывапісец, ураджэнец в. Звянячы Талачынскага раёна.

18 лютага – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Макарэвіч Мікалай Анатольевіч, беларускі хімік, ураджэнец в. Зялёная Талачынскага раёна.

18 лютага – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Бязбожны Дзмітрый Васільевіч, работнік культуры, лаўрэат Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. З 1987 года – дырэктар Культурна-дзелавога цэнтра ААТ «КІМ» у Віцебску.

19 лютага – 250 гадоў таму (1767) нарадзіўся Пешка Юзаф (1767–1831), польскі жывапісец, прадстаўнік класіцызму, аўтар 12 акварэляў канца 18 – пачатку 19 стст. з відамі Віцебска.

19 лютага – 205 гадоў таму (1812) нарадзіўся Падбярэзскі (Друцкі-Падбярэзскі) Рамуальд Андрэевіч (1812–1856), беларускі і польскі выдавец, публіцыст, фалькларыст. Запісваў вясельныя песні Віцебшчыны.

20 лютага – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Мазынскі Валерый Яўгенавіч, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, галоўны рэжысёр тэатра імя Я. Коласа.

22 лютага – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Худалееў Рыгор Аляксандравіч (1902–1964), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення г. п. Шуміліна і г. п. Бешанковічы. Ураджэнец в. Ізабеліна Магілёўскай вобласці.

23 лютага – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Валенцік Дзмітрый Данілавіч (1907–1969), Герой Савецкага Саюза, лётчык, ураджэнец в. Райкова Полацкага раёна.

23 лютага – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Падгайчэнка Аляксандр Аляксандравіч, прафсаюзны работнік, ураджэнец в. Іканкі Чашніцкага раёна.

24 лютага – 355 гадоў таму (1662) нарадзіўся Карскі Мацей (1662–1717), польскі філосаф, прававед, ураджэнец Польшчы. Прафесар рыторыкі ў Полацку і Варшаве, выкладчык філасофіі ў Полацку, рэктар Полацкага калегіума.

24 лютага – 25 гадоў таму (1992) адкрыўся Аршанскі музей драўлянай скульптуры разьбяра С. С. Шаўрова, філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

27 лютага – 215 гадоў таму (1802) утворана Віцебская губерня, адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне ў Расійскай імперыі, РСФСР і БССР з цэнтрам у Віцебску.

27 лютага – 140 гадоў таму (1877) нарадзіўся Гайдабураў Павел Паўлавіч, рускі акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, ураджэнец г. Санкт-Пецярбурга. Выступаў у Полацку, Мінску, Віцебску, Барысаве.

27 лютага – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Альсмік Пётр Іванавіч (1907–1992), беларускі вучоны ў галіне селекцыі раслін, доктар сельскагаспадарчых навук, акадэмік НАН Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Выдрэя Лёзненскага раёна.

патрыятычным пафасам прасякнута паэма «Падаліст». В. Вярба выдала кніжку вершаў для дзяцей «Пралеска» (1968) і засведчыла, што можа пісаць па-мастацку ярка, з добрым веданнем дзіцячай псіхалогіі. А яшчэ пісьменніца перакладала з украінскай, яўрэйскай, рускай, літоўскай, узбекскай і некаторых іншых моў. Дзякуючы перакладу Веры Вярбы загучаў па-беларуску вядомы твор, прысвечаны юнацтву, – аповесць Р. Фраермана «Дзікі сабака Дзінга, альбо Аповесць пра першае каханне».

Памерла 15 ліпеня 2012 года ў Мінску.

ЛІТАРАТУРА

1. **Баравікова, Р.** З пяшчотаю, любоўю, цеплынёю… / Р. Баравікова // Роднае слова. – 1992. – № 1. – С. 63.

2. **Баравікова, Р.** Летуценніца / Р. Баравікова // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 3 лют. – С. 6.

3. **Баравікова, Р.** Па рацэ часу – у вечнасць / Р. Баравікова // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 20 ліп. – С. 1.

4. **Барадулін, Р.** Як сама паэзія / Р. Барадулін // Беларусь. – 1993. – № 3. – С. 36.

5. **Бельскі, А. І.** «Дажджлівых раніц пазалота…» : (Вера Вярба) / А. І. Бельскі // Беларуская літаратура XX стагоддзя : гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2005. – С. 136–143.

6. **Гардзей, В.** Ручнікі паплылі ў вечнасць / В. Гардзей // Звязда. – 2012. – 18 ліп. – С. 7.

7. **Гайдук, С**. Пачатак з канца, ці Чаму Вера Вярба працягвае жыць у нашых сэрцах / С. Гайдук // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 24 жн. – С. 5.

8. **Гарэлік, Л. М.** Вярба Вера / Л. М. Гарэлік, У. М. Ларчанка // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1993. – Т. 2. – С. 68–72.

9. **Кавалеўскі, С.** Апошні ліст Вярбы / С. Кавалеўскі // Народнае слова. – 2012. – 21 ліп. – С. 7.

аддзела прапаганды літаратуры Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па друку (1969–1971). З 1972 г. – літсупрацоўнік, потым загадчык аддзела пісем і інфармацыі рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», з 1977 года – няштатны карэспандэнт часопіса «Работніца і сялянка», з 1980 года – супрацоўнік часопіса «Беларусь».

Веры Вярбе было наканавана нарадзіцца і быць паэткай. На пачатку творчай сцежкі як раз і нарадзіўся верш «Ручнікі». Першыя творы яна надрукавала на зыходзе 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Ужо ў дваццаць гадоў яна, студэнтка філалагічнага факультэта БДУ, трымала ў руках уласную паэтычную кніжку. Зборнік «Вочы вясны» (1962) прыхільна сустрэлі крытыкі і пісьменнікі, у друку на яго выхад адгукнуліся Аркадзь Куляшоў, Алесь Яскевіч, Вячаслаў Рагойша і інш. Пазней пра аўтара зборніка «Вочы вясны» пісаў Алег Лойка як пра паэтку свежага голасу, якая сваёй творчасцю абнаўляла стылёвы лад і гучанне беларускага верша.

У 1964 г. Вера Вярба стала членам Саюза пісьменнікаў СССР. Яна выбіралася членам бюро секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР. У 1967 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік «Белыя пісьмы», у 1969 г. у выдавецтве «Беларусь» пабачыў свет паэтычны зборнік «Высакосны год». Беларуская паэзія, дзякуючы такім яе кнігам, як «Сіняя бухта» (1975), «Альфа» (1978), «Мая маленькая планета» (1982), «Яраслаўна» (1986), узбагацілася ўзорамі сапраўднай, высокай паэзіі. Усе яе творы разам ўспрымаюцца як лірычны дзённік жанчыны. Яе паэзія нясе прыгажосць пачуццяў, увасобленых у слове. В. Вярба ўмее стварыць у сваіх вершах атмасферу даверу да яе паэтычнага слова, кожная яе кніжка настройвае на лірычны лад. Асноўныя матывы лірыкі – услаўленне маладосці, дружбы, кахання, мацярынства, роздум над складанымі праблемамі часу.

Вера Вярба ў сваіх лепшых творах паэмнага жанру «Белыя пісьмы», «Сіняя бухта», «Снежная горка», «Натхненне» засталася лірыкам. Гераічнаму подзвігу Веры Харужай яна прысвяціла ліра-эпічную паэму «Каліна» (1968). Да запаветных сцяжынак юнацтва і вобразаў роднага краю вяртаецца аўтар у паэме «Сіняя бухта». Гісторыка-

28 лютага – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Залеская Галіна Адамаўна, беларускі фізік, ураджэнка Сенненскага раёна.

29 лютага – 125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Батрак Іван (сапр. Казлоўскі Іван Андрэевіч) (1892–1943), рускі паэт і перакладчык, удзельнік рэвалюцыйнага руху, ураджэнец в. Малае Гальцава Талачынскага раёна.

100 гадоў таму (1917) у Паставах утвораны Савет салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

30 гадоў таму (1987) у Віцебску створана мастацкае аб'яднанне «Квадрат». Існавала да 16.03.1994 г.

1 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Шмакаў Фёдар Іванавіч (1917–2009), рэжысёр, народны артыст Беларусі, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, ураджэнец Санкт-Пецярбурга.

1 сакавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Шадыра Вадзім Іосіфавіч, беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, ураджэнец г. Пячора (Расія). Вывучае жалезны век і ранняе сярэдневякоўе басейнаў Заходняй Дзвіны і Дняпра.

3 сакавіка – 60 гадоў таму (1957) нарадзілася Акуневіч Вольга Іванаўна, краязнаўца, дырэктар Віцебскага мастацкага музея, ураджэнка г. Віцебска.

4 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Радзевіч Казімір Іванавіч, Герой Сацыялістычнай Працы (1971). З 1953 – слесар Браслаўскай машынна-трактарнай станцыі, потым слесар Браслаўскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка», ураджэнец в. Маляўкі Мінскага раёна.

4 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Пугаўка Леанід Канстанцінавіч (1917–1990), Герой Сацыялістычнай Працы (1958), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Паўлава Глыбоцкага раёна. З 1947 года – старшыня Лучайскага, потым Узрэчскага сельсаветаў Глыбоцкага раёна. Старшыня калгаса «17 Сентябрэ» Глыбоцкага раёна (1951–1981).

4 сакавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Вінер Леанід Леанідавіч (1922–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Херсон (Украіна).

4 сакавіка – 55 гадоў таму (1962) нарадзілася Яснова Алёна Уладзіміраўна, беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка г. Санкт-Пецярбурга. З 1981 года жыве ў Віцебску.

5 сакавіка – 240 гадоў таму (1777) нарадзіўся Маралёўскі Юзаф (1777–1845), паэт, педагог, ураджэнец Віцебскай губерні. Быў настаўнікам езуіцкай калегіі ў Полацку, працаваў у настаўніцкай семінарыі і загадваў манастырскай бібліятэкай у Оршы. У 1816–1818 гг. – кіраўнік Полацкай акадэміі.

Мастацтва. – 2007. – № 3. – С. 4.

6. **Барковский, В. М.** «По-прежнему отступаю от сюжета» / В. М. Барковский ; беседовала Т. Орлова // Рэспубліка. – 2011. – 3 сак. – С. 12.

7. **Грамыка, Л.** Усе спектаклі В. Б. : тыдзень з тэатрам імя Я. Коласа / Л. Грамыка // Мастацтва. – 2007. – № 6. – С. 41–43.

8. **Чеченев, О.** Многа букаф о театре / О. Чеченев // Нёман. – 2013. – № 2. – С. 183–187.

ВЯРБА ВЕРА
(САПР. САКАЛОВА ГЕРТРУДА ПЯТРОЎНА)

Да 75-годдзя з дня нараджэння (1942)

Вярба Вера (сапр. Сакалова Гертруда Пятроўна) (1942–2012) – паэтэса, перакладчыца, ураджэнка в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. Нарадзілася 14 студзеня 1942 г. у в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна, дзе жылі бацькі яе маці. Бацька, Пётр Андрэевіч Маркаў, загінуў у 1941 годзе пад Смаленскам. Маці, Казлоўская Надзея Васілеўна, пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вярнулася разам з дачкой у Мінск, дзе працавала інжынерам. У 1958 годзе В. Вярба скончыла сярэднюю школу і паступіла на філалагічны факультэт Дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна ў Мінску. Пасля заканчэння вучобы ў 1964 г. яна працавала пазаштатным карэспандэнтам часопіса «Маладосць» (1964–1969), старшым інспектарам

Спектаклі вызначаюцца адкрытым постмадэрнізмам, выяўленнем формы і структуры пастаноўкі, гранічнай засяроджанасцю на псіхааналізе. Паставіў спектаклі «Нора» Г. Ібсена (1993) – лепшая рэжысура на фестывалі «Маладзенчанская сакавіца»; «Васа Жалязнова» (1997) у Гродзенскім абласным драматычным тэатры; «Свавольніца лёсу» А. Паповай (1996); «Таму што люблю» (Дзень карабля), «Пісьменныя» паводле М. Чокэ (1998) – Гран-пры фестывалю сучаснай нямецкай драматургіі ў Мінску; «Блудны муж і яго жонка Варвара» паводле Г. Марчука (1998); «Чорная нявеста» («Чорная панна Нясвіжа» А. Дударава) (1999) – лепшы спектакль тэатраў Беларусі; «Я, ты, ён, яна, яно…» паводле Ф. Шылера (1999); «Шагал… Шагал» – Гран-пры Эдынбургскага міжнароднага фестывалю (2000), лепшы спектакль беларускай драматургіі на міжнародным фестывалі «Белая вежа-2000»; «Зямля» паводле Я. Коласа (2001) у тэатры імя Я. Коласа; «Тузы» У. Відмера (2002); «Сон на кургане» паводле Я. Купалы (2003); «Ружа ў чыстым полі» В. Драздова (2005); «Несцерка» В. Вольскага, «І смех, і слёзы, і Любоў» паводле У. Набокава, «Дадому» А. Паповай (2008); «Дзённік паэта» С. Кавалёва, «Позняе каханне» А. Астроўскага (2007); «Прывітанне, Альберт» Ю. Сохарава (2009).

ЛІТАРАТУРА

1. **Алімава, А.** Віталь Баркоўскі. Тэатр павінен выхоўваць / А. Алімава // Витебский проспект. – 2006. – 28 дек. – С. 21.

2. **Баркоўскі** Віталь Міхайлавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. – Т. 1 : А–Б. – С. 471.

3 **Барковский** Виталий Михайлович // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Белорусская энциклопедия, 2006. – Т. 2 : А–Герань. – С. 203–204.

4. **Баркоўскі** Віталь Міхайлавіч // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 1 : А–К. – С. 92.

5. **Баркоўскі, В.** Асоба. Талент. Школа / В. Баркоўскі //

6 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Гарбукоў Міхаіл Аляксандравіч, беларускі вучоны ў галіне заатэхнікі і конегадоўлі, ураджэнец в. Несцяры Верхнядзвінскага раёна.

6 сакавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Церашкова Валянціна Уладзіміраўна, савецкі касманаўт, першая ў свеце жанчына-касманаўт, Герой Савецкага Саюза (1963). Лётчык-касманаўт СССР (1963). Генерал-маёр (1995). Ганаровы грамадзянін г. Віцебска (1975), ураджэнка с. Масленнікава Тутаеўскага раёна Яраслаўскай вобласці.

7 сакавіка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Хадкевіч Тарас Канстанцінавіч (1912–1975), пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец Верхнядзвінскага раёна.

7 сакавіка – 45 гадоў таму (1972) нарадзіўся Вайцяховіч Андрэй Вячаслававіч, археолаг, ураджэнец г. Бабруйска Магілёўскай вобласці. Даследаваў курганныя могільнікі ў Докшыцкім і Лепельскім раёнах.

8 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Селіханаў Сяргей Іванавіч (1917–1976), беларускі скульптар, скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (мастацкі тэхнікум).

8 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) створаны Віцебскі падпольны абкам КП(б)Б, дзейнічаў да ліпеня 1944 г.

8 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) створаны Віцебскі падпольны абкам ЛКСМБ. Дзейнічаў да 26 чэрвеня 1944 г.

9 сакавіка – 90 гадоў таму (1927) нарадзіўся Лісіцын Пётр Сцяпанавіч, празаік, ураджэнец г. Полацка.

10 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) у Друі створаны Савет афіцэрскіх і салдацкіх дэпутатаў.

10 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Ткачоў Міхаіл Аляксандравіч (1942–1992), археолаг, гісторык-медыявіст, грамадскі дзеяч, доктар гістарычных навук, ураджэнец г. Мсціслаў. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў г. Віцебску і на Віцебшчыне.

10 сакавіка – 10 гадоў таму (2007) адкрыўся музей Полацкага гарадскога аддзела ўнутраных спраў.

11 сакавіка – 215 гадоў таму (1802) адбыўся падзел Беларускай губерні на Магілёўскую і Віцебскую. Віцебск стаў губернскім цэнтрам.

12 сакавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Ціханенка Васіль Ерафеевіч, жывапісец-мастак, ураджэнец г. Віцебска.

13 сакавіка – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Арцімовіч Станіслаў Іосіфавіч (1897–1974), мастак і краязнавец, ураджэнец Мёрскага раёна.

13 сакавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Фёдараў Аляксандр Іванавіч (1902–1987), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай медыцыны. Працаваў у Віцебскім ветэрынарным інстытуце (1955–1981).

13 сакавіка – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Штыкаў Цярэнцій Фаміч (1907–1964), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. У Вялікую Айчынную вайну – член ваеннага савета Ленінградскага, Волхаўскага, Карэльскага, 1-га Далёкаўсходняга франтоў, Прыморскай групы войск, ураджэнец Гарадоцкага раёна.

БАРКОЎСКІ
ВІТАЛЬ МІХАЙЛАВІЧ

70 год з дня нараджэння (1947)

Баркоўскі Віталь Міхайлавіч нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў в. Астравы Мінскага раёна, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2000). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1969). Вучыўся рэжысуры ў А. Эфроса. У 1979–1987 гг. працаваў у Магілёўскім абласным тэатры імя В. Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску. Арганізатар і кіраўнік тэатра-студыі «Дзе-Я?» (1987–1990), эксперыментальных майстэрняў «АКТ» у Мінску (1990–1995). З 1997 года галоўны рэжысёр, а ў 2001–2009 гадах – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску. З 2010 года Віталь Баркоўскі працуе галоўным рэжысёрам Смаленскага драматычнага тэатра імя А. Грыбаедава.

Першая пастаноўка – «Апошні тэрмін» паводле В. Распуціна ў Тэатры юнага гледача Беларусі (1976). Віталь Баркоўскі – рэжысёр-авангардыст, творчасцю якога прадстаўлены эксперыментальны тэатр Беларусі 1970–90-х гадоў. Сярод пастановак: «Марк Шагал» (1990), «У стылі барака…» (1991), «Апошняя п’еса Трэплева» (1992), «Каляровы» (1993), «П’еса для ненароджаных дзяцей» (1996).

27 снежня – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Фрадкін Сямён Захаравіч (1932–2007), беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынских навук, прафесар, заснавальнік навуковай школы гіпертэрміі і гіперглікеміі ў анкалогіі, ураджэнец г. Дуброўна.

27 снежня – 75 гадоў таму (1942) пачалася карная аперацыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Зімовы лес» супраць партызанскіх брыгад ў трохвугольніку чыгунак Віцебск – Невель – Полацк (Віцебскі, Гарадоцкі, Мехаўскі, Полацкі, Шумілінскі раёны).

28 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Антонаў Ігнацій Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі, народны ўрач Беларусі, ураджэнец в. Будніца Віцебскага раёна.

31 снежня – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Гуціеў Мікалай Цімафеевіч (1912–2007), заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, беларускі графік, ураджэнец г. Растоў-на-Доне. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам брыгады «Дубава». Зімой 1942–1943 гг. у штабе брыгады ў Антонаўскім лесе на Ушаччыне мастакамі-партызанамі Мікалаем Гуціевым і Мікалаем Абрыньбай была створана партызанская мастацкая галерэя.

13 сакавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Шмыроў Расціслаў Мінаевіч, беларускі акцёр, сцэнарыст, ураджэнец в. Заполле Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці.

13 сакавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Панамарэнка Яўген Георгіевіч, беларускі акварэліст, ураджэнец г. Брагіна Гомельскай вобласці. Жыве ў Наваполацку.

14 сакавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Малчанаў Павел Сцяпанавіч (1902–1977), беларускі акцёр, рэжысёр, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР, акцёр і мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра імя Я. Коласа, дзе працаваў з перапынкамі ў 1926–1951 гг.

14 сакавіка – 110 гадоў таму (1907) нарадзілася Мацэнка Марыя Ільнічна (1907–1982), удзельніца партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Сацыялістычнай Працы, Член бюро падпольнага Віцебскага гаркама КПБ. Ганаровая грамадзянка г. Віцебска, ураджэнка г. Віцебска.

14 сакавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Ткачонак Анатоль Аляксеевіч (1922–1994), графік, ураджэнец Бешанковіцкага раёна.

15 сакавіка – 295 гадоў таму (1722) нарадзіўся Лянкевіч Габрыэль (1722–1798), каталіцкі рэлігійны дзеяч, архітэктар, педагог, ураджэнец Полацкага раёна.

15 сакавіка – 155 гадоў таму (1862) нарадзіўся Вярэнька Францішак Леапольдавіч (1862–1892), краязнавец і археолаг, ураджэнец в. Пуцілкавічы Ушацкага раёна.

15 сакавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Кліменка Максім Аляксандравіч (1902–1992), Герой Сацыялістычнай Працы, камісар партызанскай брыгады імя М. Калініна, старшыня калгаса імя В. Чапаева.

15 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) у Полацку створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

15 сакавіка – 60 гадоў таму (1957) нарадзілася Зуева Ларыса Міхайлаўна, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка г. Оршы.

16 сакавіка – 185 гадоў таму (1832) нарадзіўся Ромер Альфрэд Ізідар (1832–1897), мастак, мастацтвазнавец. Выконваў роспіс храмаў у в. Камаі Пастаўскага раёна.

16 сакавіка – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Санкоўскі Іосіф (1897–1962), генерал-лейтэнант, ураджэнец Мёрскага раёна.

16 сакавіка – 90 гадоў таму (1927) нарадзіўся Галаван Васіль Цімафеевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Аксянці Чашніцкага раёна.

17 сакавіка – 420 гадоў таму (1597) Віцебску дадзена самакіраванне па Магдэбургскаму праву.

17 сакавіка – 420 гадоў таму (1597) Віцебск атрымаў герб.

17 сакавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Сяркуцьеў Генадзь Васільевіч, беларускі вучоны ў галіне педагогікі, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

18 сакавіка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Трутко Рыгор Ягоравіч (1912–2001), краязнавец, ураджэнец г. Дуброўна.

18 сакавіка – 25 гадоў таму (1992) адкрыты Віцебскі мастацкі музей, філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

24 снежня – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Салівон Інеса Іванаўна, беларускі антраполаг, доктар біялагічных навук, дацэнт, кандыдат гістарычных навук, ураджэнка г. Барысава Мінскай вобласці. Даследвала магільнік у в. Лукомль Чашніцкага раёна.

25 снежня – 100 гадоў таму (1917) нарадзілася Заранок Таццяна Піліпаўна (1917–2007), беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі, ураджэнка Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

25 снежня – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Яфімава Маргарыта Барысаўна, літаратуразнаўца, крытык, ураджэнка г. Оршы.

25 снежня – 55 гадоў таму (1962) г. Дрыса перайменаваны ў Верхнядзвінск.

25 снежня – 55 гадоў таму (1962) Дрысенскі раён быў перайменаваны ў Верхнядзвінскі раён.

26 снежня – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Васілёнак Яўген Пятровіч (1917–1973), пісьменнік, паэт, перакладчык, ураджэнец г. Оршы.

27 снежня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Арэхаў Вадзім Іванавіч (1902–1957), генерал-лейтэнант, ураджэнец г. Віцебска.

27 снежня – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Абакунчык Іван Вікенцьевіч, партыйны і гаспадарчы дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Забалацце Мінскага раёна. У 1951–1962 гг. у Віцебскай вобласці: 1-ы сакратар Ульскага, Аршанскага, Гарадоцкага райкамаў КПБ.

19 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Нікіцін Якаў Паўлавіч (1922–1999), беларускі дзеяч аматарскага мастацтва, дырыжор, педагог, хормайстар. Ураджэнец Расіі. У 1953 годзе скончыў Віцебскае музычнае вучылішча.

20 снежня – 100 гадоў таму (1917) заснаваны Віцебскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя як санітарна-медыцынская секцыя Віцебскага губернскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны не працаваў. У 1944 годзе аднавіў працу як санітарна-эпідэміялагічная станцыя, у 1991 годзе перайменавана ў абласны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. У 2003 годзе да яго далучаны цэнтр «Здароўе».

22 снежня – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Лаўшэнка Фёдар Рыгоравіч, беларускі вучоны ў галіне парашковай металургіі, ураджэнец в. Арцюхі Полацкага раёна.

24 снежня – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Туфтаў Іван Мікіціч (1912–1974), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Гарадзінец Лепельскага раёна.

24 снежня – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Мітрафанаў Мікалай Іванавіч (1912–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Шумілінскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ураджэнец Расіі.

24 снежня – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Гушча Ян (1917–1986), польскі пісьменнік і перакладчык, ураджэнец Мёрскага раёна. Працаваў настаўнікам на Дзісненшчыне і ў Маскве.

20 сакавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Караткевіч Аляксандр Цімафеевіч, гісторык і педагог, ураджэнец Бешанковіцкага раёна.

21 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) у Віцебску створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

22 сакавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Конанава Марыя Сцяпанаўна (1922–1977), дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнка г. Полацка. З 1946 года працавала на Аршанскім ільнокамбінаце інжынерам-нарміроўшчыкам, потым начальнікам аддзела працы і зарплаты, пазней займала пасаду намесніка дырэктара.

24 сакавіка – 950 гадоў таму (1067) у летапісах з’яўляюцца першыя звесткі пра Оршу.

25 сакавіка – 55 гадоў таму (1962) у Віцебску адкрыўся новы авіямаршрут Віцебск – Масква (лайнер «Іл-14»). Працягласць палёту – 1 гадзіна 30 хвілін.

26 сакавіка – 90 гадоў таму (1927) у Віцебску знаходзіўся Уладзімір Маякоўскі.

27 сакавіка – 110 гадоў таму (1907) нарадзілася Абушэнка Клаўдзія Амосаўна(1907–1982), прафсаюзны дзеяч, ураджэнка в. Гародна Расонскага раёна.

27 сакавіка – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Данілава Аляксандра Юр’еўна (1927–2001), беларускі архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі. У 1951–1988 гг. працавала ў інстытуце «Віцебскграмадзянпраект». Ураджэнка Украіны.

27 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Дураў Валерый Паўлавіч, беларускі графік, ураджэнец г. Дзяржынска Горкаўскай вобласці. Жыў у Віцебску.

28 сакавіка – 75 гадоў таму (1942) адбыўся Курынскі бой партызанскіх атрадаў Д. Ф. Райцава і А. П. Дзіка супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у межах вёсак Курына, Платы і рабочага пасёлка Ноўка Суражскага (цяпер Віцебскага) раёна.

28 сакавіка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Марковіч Аляксандр Мікалаевіч, журналіст, галоўны рэдактар газеты «Полацкі веснік», ураджэнец г. п. Ушачы.

28 сакавіка – 50 гадоў таму (1967) адбылася I абласная канферэнцыя прафсаюза рабочых лясной, папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. На ёй быў утвораны Віцебскі абкам прафсаюза.

30 сакавіка – 100 гадоў таму (1917) у Віцебску створана прафсаюзная арганізацыя.

30 сакавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Давыдава Ніна Максімаўна (1922–1943), член Обальскай падпольнай арганізацыі «Юныя мсціўцы». Пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

100 гадоў таму (1917) заснавана Цэнтральнае бюро прафсаюзаў Віцебскай губерні па ініцыятыве секцыі працы пры Савеце рабочых дэпутатаў. 30 ліпеня 1917 года пераўтворана ў Савет прафсаюзаў.

100 гадоў таму (1917) пачала выходзіць вайсковая газета «Голос III Армии» ў Полацку на рускай мове.

15 снежня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Нодзель Вульф Абрамавіч (1897–1938), прафсаюзны і партыйны дзеяч, ураджэнец г. Дзвінска Віцебскай губерні (Латвія).

15 снежня – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Кірылаў Герман Іларыёнавіч, пісьменнік, ураджэнец Шаркаўшчынскага раёна.

16 снежня – 55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Янушкевіч Валяр'ян Язэпавіч, скульптар, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, ураджэнец Мінскай вобласці. Афармляў касцёл св. Андрэя Баболі ў г. Полацку (1999–2000).

17 снежня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Кане Маісей Юдавіч (1902–1964), беларускі вучоны ў галіне машынабудавання, ураджэнец г. Віцебска.

17 снежня – 100 гадоў таму (1917) створана секцыя юстыцыі Віцебскага губернскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. З 2007 года – сучасная назва.

17 снежня – 25 гадоў таму (1992) у Віцебску заснаваны музей воінаў-інтэрнацыяналістаў.

18 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Аверчанка Мікалай Іванавіч (1922–1960), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Майсеенкі Гарадоцкага раёна.

19 снежня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Вінаградаў Мікалай Уладзіміравіч (1897–1972), доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1948–1970 – выкладчык ВДМУ, загадчык кафедры псіхіятрыі.

6 снежня – 105 гадоў таму (1912) адкрыты помнік героям Айчыннай вайны 1812 года ў Віцебску. Архітэктар І. Фамін.

7 снежня – 105 гадоў таму (1912) нарадзілася Драздова Аўгіння Ягораўна (1912–2002), беларуская народная песенніца, захавальніца аўтэнтычнага абрадавага песеннага фальклору, ураджэнка в. Скавародзін Полацкага раёна.

7 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Макееў Ягор Абрамавіч (1922–1957), Герой Савецкага Саюза. Ганаровы грамадзянін г. Оршы.

9 снежня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Даўгяла Георгій Хрысанфавіч (1902–1974), беларускі вучоны ў галіне тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1966).

10 снежня – 165 гадоў таму (1852) нарадзіўся Шукевіч Вандалін Аляксандравіч, беларускі археолаг, антраполаг, краязнавец і этнограф, ураджэнец в. Нача Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Вёў раскопкі каля Віцебска, Лепеля, Радашковічаў, возера Дрысвяты.

10 снежня – 90 гадоў таму (1927) нарадзіўся Багданаў Уладзімір Сяргеевіч, беларускі гісторык, прарэктар БДУ, ураджэнец в. Каралі Віцебскага раёна.

11 снежня – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Бугаёў Яўген Іосіфавіч, гісторык, публіцыст, ураджэнец Верхнядзвінскага раёна.

12 снежня – 25 гадоў таму (1992) у Оршы адкрыты музей гісторыі і культуры горада.

75 гадоў таму (1942) у гады Вялікай Айчыннай вайны заснавана партызанская брыгада «Аляксея» пад камандаваннем А. Ф. Данукалава.

75 гадоў таму (1942) пачала дзейнічаць Обальская камсамольская арганізацыя «Юныя мсціўцы».

25 гадоў таму (1992) пачала выдавацца Наваполацкая гарадская газета «Новая газета» (цяпер «Новополоцк сегодня»).

1 красавіка – 155 гадоў таму (1862) нарадзіўся Багдановіч Адам Ягоравіч (1862–1940), этнограф, фалькларыст, мовазнавец. Пісаў пра Чашнікі, Лукомль, Чарэю і іншыя месцы Віцебскай губерні.

1 красавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Антонаў Аляксей Гаўрылавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Вымна Віцебскага раёна. Працаваў у Лёзненскім раёне загадчыкам Высачанскага медыцынскага ўчастка.

1 красавіка – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Малаш Леаніла Афанасьеўна, даследчык беларускага фальклору, кандыдат філалагічных навук, ураджэнка в. Несцераўка Докшыцкага раёна.

2 красавіка – 240 гадоў таму (1777) створаны Полацкі павет у Полацкай губерні. З 23.12.1796 г. – у Беларускай. З 11.03.1802 г. – у Віцебскай. 17 ліпеня 1924 г. – скасаваны, тэрыторыя ўключана ў Полацкую акругу.

2 красавіка – 240 гадоў таму (1777) утвораны Суражскі ўезд у складзе Полацкай губерні. Скасаваны ў 1796 годзе, адноўлены ў 1802 годзе ў складзе Віцебскай губерні.

2 красавіка – 185 гадоў таму (1832) нарадзіўся Баброўскі Павел Восіпавіч (1832–1905), гісторык і этнограф, ураджэнец маёнтка Вака каля Вільні. Вучыўся ў Полацкім кадэцкім корпусе.

2 красавіка – 165 гадоў таму (1852) заснаваны Віцебскі Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг указам расійскага імператара Мікалая I «Об учреждении в Киеве, Витебске и Вильно центральных архивов для актовых книг Западных губерний».

2 красавіка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Цылеў Аляксандр Леанідавіч у г. п. Коханава Талачынскага раёна. Працаваў у саўгасе «Суражскі» Талачынскага раёна, саўгасе імя У. П. Краева Віцебскага раёна, у Віцебскім АПК аблвыканкама, у Старасельскай СШ Віцебскага раёна, з 2010 г. старшыня Віцебскага абласнога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў.

3 красавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Пратасевіч Пётр Іванавіч у в. Козіна Ушацкага раёна, супрацоўнік газет Ушацкага раёна «Патрыёт» і Глыбоцкага раёна «Шлях Перамогі», старшыня Камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні Віцебскага аблвыканкама, генеральны дырэктар Віцебскага абласнога тэлерадыёаб'яднання, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры.

4 красавіка – 460 гадоў таму (1557) нарадзіўся Сапега Леў Іванавіч (1957–1633), палітычны, грамадскі і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Падканцлер (1585–1589) і канцлер ВКЛ (1589–1623), гетман вялікі (з 1625), ураджэнец Бешанковіцкага раёна.

2 снежня – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Баграмян Іван Хрыстафоравіч (1897–1982), Маршал Савецкага Саюза, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Гянджа (Азербайджан). З лістапада 1943 года – камандуючы войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія правялі Гарадоцкую аперацыю 1943 года, удзельнічалі ў Беларускай аперацыі 1944 года, Усходне-Прускай аперацыі (1945).

3 снежня – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Салярцінскі Іван Іванавіч (1902–1944), гісторык музыкі, тэатра, літаратуры, музычны крытык, ураджэнец г. Віцебска.

3 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Сямёнава Ксенія Савельеўна (1922–2005), Герой Сацыялістычнай Працы, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Ураджэнка в. Царкоўшчына Віцебскага раёна.

4 снежня – 100 гадоў таму (1917) у Віцебску ўтварылася арганізацыя «Савет беспрацоўных», пазней – Камітэт па барацьбе з беспрацоўем. Быў ліквідаваны 7 верасня 1921 года.

4 снежня – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Кузьмін Міхаіл Аляксандравіч (1922–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Борнікі Цвярской вобласці (Расія).

5 снежня – 180 гадоў таму (1837) нарадзіўся Вярыга Аляксандр Андрэевіч (1837–1905), хімік, педагог, ураджэнец Віцебскай губерні.

29 лістапада – 100 гадоў таму (1917) штодзённая грамадска-палітычная і літаратурная газета «Борьба» выдавалася ў Віцебску на рускай мове групай супрацоўнікаў газеты «Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов», закрыта загадам ВРК за антыбальшавіцкую дзейнасць.

30 лістапада – 85 гадоў таму (1932) адкрыта шаша «Мінск – Орша».

100 гадоў таму (1917) створаны Докшыцкі валасны рэвалюцыйны камітэт.

100 гадоў таму (1917) была ўтворана медыка-санітарная секцыя губернскага Савета. У 1920 годзе – пераўтворана ў аддзел народнай аховы здароўя. У 1938 годзе – аддзел аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама. У 1990 годзе пераўтвораны ва ўпраўленне аховы здароўя.

65 гадоў таму (1952) пачаў працу Полацкі льнозавод.

40 гадоў таму (1977) Докшыцкая раённая бібліятэка набыла статус цэнтральнай.

25 гадоў таму (1992) у Віцебску адкрыта СШ № 44.

20 гадоў таму (1997) адкрыты Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей.

1 снежня – 15 гадоў таму (2002) у Гарадоцкім раёне ўстаноўлены памятны камень у гонар паэмы «Тарас на Парнасе» і яе верагоднага аўтара К. Вераніцына.

2 снежня – 130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Пракулевіч Уладзімір Міхайлавіч (1887–1938), палітычны дзеяч, ураджэнец Чашніцкага раёна.

4 красавіка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Залескі Адам Іосіфавіч (1912–2002), беларускі гісторык, ураджэнец в. Кімейка Сенненскага раёна.

4 красавіка – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Якубоўскі Якуб (сапр. Якаў Адамавіч; 1932–1998), географ і гісторык, ураджэнец Пастаўскага раёна.

4 красавіка – 60 гадоў таму (1957) нарадзілася Вакар Людміла Уладзіміраўна, педагог, краязнаўца, кандыдат мастацтвазнаўства, ураджэнка г. п. Багушэўск Сенненскага раёна.

4 красавіка – 55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Хейфец Міхаіл Львовіч, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання і матэрыялазнаўства, доктар тэхнічных навук, прафесар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, ураджэнец г. Полацка.

7 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Слаук (Славук) Валерый Пятровіч, беларускі графік, ураджэнец г.п. Коханава Талачынскага раёна.

8 красавіка – 75 гадоў таму (1942) заснавана 1-я Беларуская партызанская брыгада пад камандаваннем М. П. Шмырова.

8 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Башметаў Валерый Сцяпанавіч, доктар тэхнічных навук, прафесар, рэктар ВДТУ, ураджэнец Гарадоцкага раёна.

10 красавіка – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Матусевіч Іосіф Антонавіч (1907–1985), акцёр, народны артыст Беларусі. З 1928 года працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

10 красавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзілася Райчонак Ада Эльеўна, педагог, краязнаўца, кіраўнік культурна-асветніцкага цэнтра імя Я. Драздовіча, дырэктар Музея мастацтва і этнаграфіі імя Я. Драздовіча (Шаркаўшчынскі раён), ураджэнка г. Віцебска.

11 красавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Шарыпа Пётр Пятровіч (1942–2013), беларускі жывапісец, педагог, ураджэнец в. Арашкі Аршанскага раёна.

11 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Скобаў Валерый Аляксеевіч, ганчар, ураджэнец в. Далуева Шумілінскага раёна.

12 красавіка – 130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Брэжга Баляслаў Рычардавіч (1887–1957), археолаг, гісторык, археограф, палеограф, філолаг. Аўтар звыш 100 навуковых прац, каля 30 з іх прысвечаны гісторыі Віцебска і Полацка.

12 красавіка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Палуэктаў Уладзімір Аляксеевіч, беларускі кампазітар, піяніст, выкладаў у Наваполацкім музычным вучылішчы, ураджэнец г. Дзісна Мёрскага раёна.

13 красавіка – 150 гадоў таму (1867) нарадзіўся Петражыцкі Леў Іосіфавіч (1867–1931), прававед і сацыёлаг, ураджэнец Віцебскай губерні.

13 красавіка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Лысенка Аляксандр Паўлавіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, ураджэнец г. Віцебска.

21 лістапада – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Мастыка Рыгор Сцяпанавіч (1912–1992), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, заслужаны дзеяч навукі БССР, ураджэнец в. Істоміна Віцебскага раёна. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут і працаваў у ім.

21 лістапада – 35 гадоў таму (1982) у в. Гарадзец Шаркаўшчынскага раёна адкрыты музей мастацтва і этнаграфіі.

22 лістапада – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Міхайлаў Міхаіл Дзмітрыевіч (1922–1993), беларускі жывапісец, ураджэнец в. Дубоўка Лёзненскага раёна.

24 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Кобзун Іван Міхайлавіч (1902–1942), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Барсукі Верхнядзвінскага раёна.

24 лістапада – 65 гадоў таму (1952) нарадзілася Іванова Святлана Рыгораўна (1952–2000), краязнаўца, ураджэнка г. Оршы.

25 лістапада – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Бондарава Еўфрасіння Леанідаўна, беларускі кіназнаўца, кінакрытык, ураджэнка в. Гапонава Лёзненскага раёна.

26 лістапада – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Мятлюк Мікалай Фёдаравіч, беларускі вучоны ў галіне аўтамабілебудаўніцтва, доктар тэхнічных навук, заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі (1991).

26 лістапада – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Іваноў Барыс Георгіевіч, беларускі мастак, ураджэнец в. Цімкавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Жыве ў Оршы.

16 лістапада – 60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Паўлаў Міхаіл Уладзіміравіч, краязнаўца, ураджэнец в. Селішча Гарадоцкага раёна.

18 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Машара Міхась (сапр. Міхаіл Антонавіч; 1902–1976), беларускі пісьменнік, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, ураджэнец х. Падсасна Шаркаўшчынскага раёна.

18 лістапада – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Аніскін Міхаіл Аляксандравіч (1922–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец пас. Косціна-Возера Башкартастанскай вобласці. Вызначыўся пры вызваленні Сенненскага раёна.

18 лістапада – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Зайкоўскі Эдвард Міхайлавіч, беларускі археолаг, культуролаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец в. Дубешчы Валажынскага раёна Мінскай вобласці. Даследаваў помнікі неаліту і бронзавага веку, культавыя камяні і крыжы ў Браслаўскім Паазер'і і Падзвінні.

20 лістапада – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Ягораў Анатоль Мікалаевіч, беларускі гісторык, ураджэнец г. Оршы.

21 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Лытасаў Міхаіл Васілевіч (1902–1979), Герой Сацыялістычнай Працы, былы старшыня калгаса «Перамога» Глыбоцкага раёна.

14 красавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Смушкевіч Якаў Уладзіміравіч (1902–1941), савецкі военачальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза, камандзір авіябрыгады ў Віцебску (1926–1936). Ураджэнец Літвы.

15 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Догіль Леанід Піліпавіч, беларускі вучоны ў галіне эканомікі, доктар эканамічных навук, ураджэнец в. Церабені Чашніцкага раёна.

17 красавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Сямёнаў Георгій Васільевіч (1902–1976), Герой Сацыялістычнай Працы, былы дырэктар Аршанскага льнокамбіната, ганаровы грамадзянін г. Оршы. Ураджэнец Расіі.

17 красавіка – 100 гадоў таму (1917) была заснавана раённая газета «Полацкі веснік». Першапачаткова называлася «Рэвалюцыйны голас». З 1991 года – сучасная назва.

17 красавіка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Зубрыцкі Эдуард Іосіфавіч (1942–2008), паэт, журналіст, супрацоўнік рэдакцыі газеты «Дзвінская праўда» (Верхнядзвінск), ураджэнец Докшыцкага раёна.

18 красавіка – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Башмачнікаў Віктар Уладзіміравіч, партыйны дзеяч, ураджэнец г. Рудня Смаленскай вобласці. З 1935 года – 2 сакратар Віцебскага гаркама партыі.

18 красавіка – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Шыркоўскі Эдуард Іванавіч (1932–2002), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Ураджэнец в. Новы Свержань Мінскай вобласці. З 1985 года начальнік Упраўлення КДБ БССР па Віцебскай вобласці.

18 красавіка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Мядзелец Алег Данілавіч, беларускі вучоны ў галіне гісталогіі і імуналогіі, прафесар ВДМУ, ураджэнец в. Красная Горка Шаркаўшчынскага раёна.

19 красавіка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Прокша Леанід Януаравіч (1912–1994), беларускі пісьменнік, ураджэнец г. Полацка.

20 красавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Некрасаў Альберт Васільевіч, беларускі мастак, ураджэнец в. Красавіна Валагодскай вобласці. Выкладаў у Віцебскім педагагічным і тэхналагічным інстытутах.

22 красавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Канаваленка Уладзімір Ануфрыевіч (1917–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Скрэбні Віцебскага раёна.

22 красавіка – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Валюшкін Канстанцін Дзмітрыевіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, прафесар ВДАВМ, ураджэнец в. Тыльцы Сенненскага раёна.

22 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Карпушка Фёдар Уладзіміравіч, вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, ураджэнец в. Брэдзева Мёрскага раёна.

23 красавіка – 70 гадоў таму (1947) нарадзілася Дзягілева Галіна Аляксееўна, беларуская актрыса, рэжысёр, працавала ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнка г. Мінска.

12 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Чашнік Ілья Рыгоравіч (1902–1929), мастак, вучань Ю. Пэна, К. Малевіча, член творчага аб'яднання УНОВИС. Выпусціў у Віцебску часопіс «Аэро». Ураджэнец г. Лудза (Латвія).

12 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзілася Бандарчык Таццяна Андрэеўна (1902–1974), беларуская актрыса, ураджэнка в. Дукора Пухавіцкага раёна. Працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

12 лістапада – 40 гадоў таму (1977) у Новалукомлі заснаваны завод керамзітавага гравію.

14 лістапада – 75 гадоў таму (1942) адбыўся Купавацкі бой паміж партызанамі брыгады «Дзядзі Косці» і карнай экспедыцыяй нямецка-фашысцкіх захопнікаў у в. Купаваць Сенненскага раёна.

15 лістапада – 125 гадоў таму (1892) нарадзіўся Шпайэр Мікалай Маркавіч, генерал-лейтэнант, удзельнік грамадзянскай вайны, ураджэнец г. Глыбокае.

15 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Латысаў Міхал Васільевіч (1902–1979), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец Расіі. У 1946–1967 – старшыня калгаса «Перамога» Глыбоцкага раёна.

16 лістапада – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Калюта Мацвей Ігнатавіч, прафсаюзны работнік, ураджэнец г. Лепеля. З красавіка 1925 года – старшыня Віцебскага акруговага праўлення работнікаў асветы.

16 лістапада – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Лукша Валянцін Антонавіч (1937–2012), беларускі паэт, дырэктар выдавецтва «Юнацтва» (1980–1998), ураджэнец г. Полацка.

8 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Шчарбовіч Іосіф Антонавіч (1902–1952), беларускі вучоны ў галіне гельмінталогіі, доктар ветэрынарных навук, прафесар Віцебскага ветэрынарнага інстытута.

9 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Сакалоўскі Нестар Фёдаравіч (1902–1950), беларускі кампазітар, хормайстар, фалькларыст, ураджэнец в. Вешкі Докшыцкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

9 лістапада – 60 гадоў таму (1957) заснавана Віцебская абласная стаматалагічная паліклініка.

10 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Арлоў Іван Аляксеевіч (1902–1980), генерал-лейтэнант, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Віцебска.

10 лістапада – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Занько Аляксандра Фёдараўна (1927–1990), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка г. Лепеля. З 1949 года – выхавальнік Лепельскага дзіцячага дома, з 1951 года – настаўнік СШ № 2 г. Лепеля.

11 лістапада – 110 гадоў таму (1907) нарадзіўся Собалеў Іван Паўлавіч (1907–1989), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Шапуры Віцебскага раёна.

11 лістапада – 100 гадоў таму (1917) пачала выходзіць у друк газета «Віцебскі рабочы» ў Віцебску. Першапачаткова называлася «Известия военно-революционного комитета города Витебска», «Заря Запада», «Віцебскі пралетарый». З 1938 года – сучасная назва. Выдавалася да ліпеня 2013 года.

25 красавіка – 145 гадоў таму (1872) створана «Акруговае праўленне Таварыства аказання дапамогі пры караблекрушэннях» у Віцебскай губерні. З мая 1880 года – «Таварыства выратавання на водах».

25 красавіка – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Акуцыёнак Пётр Антонавіч (1922–1943), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. п. Шуміліна.

28 красавіка – 100 гадоў таму (1917) пастановай Аршанскага Савета на прадпрыемствах горада ўведзены васьмігадзінны рабочы дзень.

28 красавіка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Саланека Альберт Андрэевіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, прафесар Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, ураджэнец г. Віцебска.

28 красавіка – 100 гадоў таму (1917) нарадзілася Цвятаева Ірына Аляксандраўна, піяністка, педагог, заслужаны работнік вышэйшай школы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

29 красавіка – 130 гадоў таму (1887) нарадзіўся Гедэман Отан Магнусавіч (1887–1937), беларускі гісторык, краязнавец, даследчык мінулага Браслаўшчыны, педагог, ураджэнец в. Васілевічы Рэчыцкага раёна.

29 красавіка – 90 гадоў таму (1927) нарадзіўся Мурашка Анатоль Іванавіч (1927–1990), вучоны ў галіне меліярацыі і воднай гаспадаркі, акадэмік УАСГНІЛ, ураджэнец Докшыцкага раёна.

30 красавіка – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Грыбкоўскі Віктар Паўлавіч, фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар, ураджэнец в. Асташковічы Дубровенскага раёна.

100 гадоў таму (1917) У. У. Адамаву даручана стварэнне Батанічнага саду ў Віцебску.

95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Ткачэнка Міхаіл Мікалаевіч (1922–1948), Герой Савецкага Саюза, ваенны лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

75 гадоў таму (1942) у гады Вялікай Айчыннай вайны была створана 2-я Беларуская партызанская брыгада пад кіраўніцтвам М. І. Дзячкова.

65 гадоў таму (1952) у Глыбокім адкрыта дзіцячая музычная школа.

55 гадоў таму (1962) нарадзілася Ушакова Таццяна Барысаўна, майстар мастацкага роспісу па дрэве, ураджэнка Ніжагародскай вобласці. Жыве ў Полацкім раёне.

1 мая – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Святлічны Цімафей Іванавіч (1917–1944), ураджэнец с. Святлічнае Харкаўскай вобласці. Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1 мая – 90 гадоў таму (1927) нарадзіўся Багданчук Яўгеній Міхайлавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, былы машыніст экскаватара Лукомльскай ДРЭС, ураджэнец в. Чэмеры Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці.

2 мая – 90 гадоў таму (1927) у Віцебску заснавана абласное радыё.

2 мая – 70 гадоў таму (1947) нарадзіўся Кавалёў Міхаіл Міхайлавіч, беларускі эканаміст, матэматык, ураджэнец в. Новая Вёска Докшыцкага раёна.

1 лістапада – 90 гадоў таму (1927) у Полацку адкрыты акружны суд.

1 лістапада – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Русецкі Аркадзь Уладзіміравіч, беларускі гісторык, культуролаг, рэктар ВДУ імя П. М. Машэрава (1997–2009 гг.), ураджэнец в. Гірэвічы Валожынскага раёна Мінскай вобласці.

2 лістапада – 300 гадоў таму (1717) нарадзіўся Вырвіч Караль (1717–1793), гісторык, педагог, філосаф, ураджэнец Браслаўскага павета.

2 лістапада – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Дарвішаў Віктар Андрэевіч (1897–1951), расійскі і беларускі рэжысёр. Ураджэнец Украіны. У 1933–1937 – мастацкі кіраўнік БДТ-2.

3 лістапада – 135 гадоў таму (1882) нарадзіўся Масалкоў Якаў Дзмітрыевіч (1882–1931), матрос-рэвалюцыянер Балтыйскага флоту, ураджэнец Талачынскага раёна.

6 лістапада – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Шаура Васіль Філімонавіч (1912–2007), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Гарадчэвічы Лепельскага раёна.

7 лістапада – 205 гадоў таму (1812) у Оршы падчас адступлення ад Масквы знаходзіўся Напалеон.

7 лістапада – 205 гадоў таму (1812) адбылася Віцебская бітва (26.10 па старым стылі) у Віцебску і яго ваколіцах паміж рускім адміралам В. І. Гарпе з Асобнага пяхотнага корпуса генерала П. Х. Вітгенштэйна і французскім гарнізонам горада пад камандаваннем генерала Ф. Пужэ.

7 лістапада – 95 гадоў таму (1922) у Віцебску пачала дзейнічаць станцыя «Хуткай медыцынскай дапамогі».

31 кастрычніка – 65 гадоў таму (1952) нарадзілася Круцікава Вера Іванаўна, беларускі трэнер (скачкі на батуце), майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

31 кастрычніка – 25 гадоў таму (1992) у Докшыцкім раёне адкрыты мемарыяльны комплекс «Ходараўка» на месцы расстрэлу нямецка-фашысцкімі захопнікамі 600 мірных жыхароў і 200 італьянскіх вайскоўцаў.

235 гадоў таму (1782) канцлер А. Сапега прадаў Дубровенскае графства князю Р. Пацёмкіну.

205 гадоў таму (1812) М. І. Кутузаў адпачываў у в. Ланенка Дубровенскага раёна.

75 гадоў таму (1942) пачалася Бягомльская аперацыя (баі беларускіх партызан па вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэрыторыі Бягомльскага раёна ў лістападзе – снежні).

75 гадоў таму (1942) распрацавана карная аперацыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Клетка обезьяны» супраць патрызанаў і грамадзянскага насельніцтва ў Гарадоцкім, часткова Невельскім (Расія) раёнах у Вялікую Айчынную вайну.

70 гадоў таму (1947) у Віцебску ўведзена ў строй першая чарга дыванова-плюшавага камбіната.

1 лістапада – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Дземяшкевіч Адам Станіслававіч (1902–1962), генерал-лейтэнант авіяцыі, ураджэнец г. Оршы.

3 мая – 140 гадоў таму (1877) нарадзіўся Грыневіч Антон Антонавіч (1877–1937), беларускі этнамузыколаг, выдавец, педагог, кампазітар, ураджэнец Полацкага раёна.

3 мая – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Купрэвіч Іван Усцінавіч, кавалер ордэна Працоўнай Славы трох ступеняў.

3 мая – 60 гадоў таму (1957) нарадзіўся Батвінёнак (Бацвінёнак) Аляксандр Уладзіміравіч, скульптар, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ураджэнец г. Браслава.

5 мая – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Багушэвіч Юрый (сапр. Георгій Канстанцінавіч; 1917–1983), пісьменнік, ураджэнец г. Оршы.

5 мая – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Дарошчанка Іван Васілевіч (1922–2002), поўны кавалер ордэна Славы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, разведчык, ураджэнец в. Дубраўкі Гарадоцкага раёна.

5 мая – 95 гадоў таму (1922) нарадзілася Гэпнер Вера Андрэеўна, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Філімонава Гарадоцкага раёна.

5 мая – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Карцель Мікалай Аляксандравіч, беларускі вучоны ў галіне генетыкі, ураджэнец в. Галяшы Расонскага раёна.

6 мая – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Васількоў Мікалай Карнілавіч (1902–1973), генерал-лейтэнант артылерыі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Віцебска.

6 мая – 85 гадоў таму (1932) нарадзіўся Дзядзенка Дзмітрый Віктаравіч, настаўнік, краязнаўца, ураджэнец в. Гвоздавічы Свянцянскага пав. Віленскага ваяводства (Пастаўскі раён).

7 мая – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Красоўскі Яўген Каліст ратавіч, беларускі жывапісец, ураджэнец г. Ярцава Смаленскай вобласці. Выкладаў у Віцебскім педагагічным інстытуце (1964–1973), потым ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце (1977–1983).

8 мая – 95 гадоў таму (1922) нарадзіўся Саркісаў (Саркісянц) Армаіс Асатуравіч (1922–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец г. Баку.

9 мая – 65 гадоў таму (1952) у в. Курына Віцебскага раёна адкрыты помнік М. Сільніцкаму, партызану, Герою Савецкага Саюза.

10 мая – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Панізнік Сяргей Сцяпанавіч, паэт, перакладчык, ураджэнец в. Бабышкі Мёрскага р-на.

15 мая – 255 гадоў таму (1762) нарадзіўся Копаць Юзаф (1762–1827), удзельнік паўстання 1794 г., падарожнік, мемуарыст, аўтар «Дзённіка падарожніка Юзафа Копаця праз усю Азію». Пахаваны ў в. Дрысвяты Браслаўскага раёна.

15 мая – 115 гадоў таму (1902) нарадзіўся Клімянок Максім Аляксандравіч, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Ніжнія Жары Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Працаваў старшынёй Мёрскага райвыканкама, старшынёй калгаса імя Чапаева Глыбоцкага раёна.

26 кастрычніка – 205 гадоў таму (1812) адбылося вызваленне Віцебска ад французскіх войск.

27 кастрычніка – 90 гадоў таму (1927) нарадзілася Марціновіч Ізабела Іванаўна, беларускі юрыст, доктар юрыдычных навук, ураджэнка г. п. Багушэўск Сенненскага раёна.

27 кастрычніка – 75 гадоў таму (1942) нарадзіўся Бубала Антон Францавіч, краязнавец, паэт, ураджэнец в. Гісялёва Верхнядзвінскага раёна.

29 кастрычніка – 70 гадоў таму (1947) у Полацку быў адкрыты педагагічны інстытут. У 1958 годзе аб'яднаны з Віцебскім педагагічным інстытутам.

29 кастрычніка – 65 гадоў таму (1952) нарадзіўся Лызікаў Анатоль Мікалаевіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, ураджэнец г. Віцебска.

30 кастрычніка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Усаў Андрэй Міхайлавіч (1917–1986), кавалер ордэна Леніна, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Барсукі Сененскага павета (Дубровенскі раён).

30 кастрычніка – 65 гадоў таму (1952) нарадзілася Алесіч Лілія Мікалаеўна, беларуская спартсменка (стральба кулявая, пісталет), чэмпіёнка СССР (1973 г.), ураджэнка г. Віцебска.

30 кастрычніка – 55 гадоў таму (1962) нарадзіўся Петрачоў Віктар Леанідавіч, прафсаюзны работнік, ураджэнец г. п. Лоеў Гомельскай вобласці. У 1986–1987 – старшы рэвізор Віцебскага аблспажыўсаюза, потым загадчык фінансавага аддзела. З лютага 1999 года – старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў гандлю.

21 кастрычніка – 120 гадоў таму (1897) нарадзіўся Мінін Яфім Сямёнавіч (1897–1941), мастак-графік, ураджэнец г. Віцебска.

21 кастрычніка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Федасееў Міхаіл Мікітавіч (1912–1987), беларускі мастак, археолаг і этнограф, ураджэнец г. Мінска. Прымаў удзел у этнаграфічных і археалагічных экспедыцыях і раскопках Полацка.

21 кастрычніка – 80 гадоў таму (1937) нарадзіўся Бабенка Эрнст Міхайлавіч, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі паліва, былы рэктар Наваполацкага політэхнічнага інстытута, рэктар Полацкага ўніверсітэта (1993–2003).

23 кастрычніка – 105 гадоў таму (1912) нарадзіўся Ліўшыц Хаім Майсеевіч, жывапісец, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

23 кастрычніка – 100 гадоў таму (1917) нарадзіўся Куксёнак Іван Архіпавіч, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, камандзір партызанскай брыгады імя ВЛКСМ (1943–1944 гг.), ураджэнец в. Шчамілаўка Віцебскага павета.

23 кастрычніка – 70 гадоў таму (1947) нарадзілася Салодкая Надзея Стэфанаўна, паэтэса, ганаровы грамадзянін г. Полацка, ураджэнка в. Шэркіна Лёзненскага раёна.

